Упраўленне адукацыі Брэсцкага аблвыканкама
УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”



“Паводле бабуліных успамінаў”

г. Брэст, 2017

Рэкамендавана
метадычным саветам
УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”,
пратакол № 1 ад 01.09.2016 года.

Складальнік
метадыст аддзела мастацкай творчасці
УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”
Брыч Віялета Крыштофаўна.

Рэцэнзенты:
Швед Іна Анатольеўна
прафесар кафедры беларускай літаратуразнаўства
УА “Брэсцкі дзяржаўны Універсітэт імя А.С. Пушкіна”
Коўш Таццяна Сяргееўна
загадчык аддзела мастацкай творчасці УА “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”

«Паводле бабуліных успамінаў» / склад. В.К.Брыч; установа адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці”. – Брэст, 2017 .

У зборніку прадстаўлены матэрыялы абласной дзіцячай навукова-практычнай канферэнцыі “Папулярызацыя традыцыйнай народнай культуры і шляхі зберажэння мясцовых традыцый”, накіраваная на раннюю прафарыентацыю сярод моладзі ў галіне фальклорнага накірунку. Распрацоўка змяшчае навукова-даследчыя матэрыялы на беларускай і рускай мовах, з абласнога конкурсу “Фальклорная спадчына”, а таксама відэаматэрыялы “Берасцейская талакуха” на падставе фальклорна-этнаграфічных экспедыцый сваёй мясцовасці, якія былі рэалізаваны 1 чэрвеня 2015 па 1 лютага 2016 года, у рамках VI адкрытага абласнога фестывалю фальклорнага мастацтва “Радавод”.

Зборнік рэкамендаваны навучэнцам, педагогам, метадыстам, спецыялістам у галіне фальклору, якія цікавяцца самабытнай фальклорнай спадчынай Брэсцкай вобласці і пытаннямі выхавання навучэнцаў сродкамі беларускага народнага мастацтва.

© Установа адукацыі
“Брэсцкі дзяржаўны абласны
цэнтр маладзёжнай творчасці”

Брэст, 2017



УВОДЗІНЫ

Фальклярыстыка цесна звязана з іншымі сумежнымі гуманітарнымі

навукамі: этналогіяй, літаратуразнаўствам, тэатральным мастацтвам, музычным мастацтвам, без вывучэння якіх немагчыма зразумець узаемаўплыў і ўзаемадзеянне фальклору з літаратурай і мастацтвам. Вельмі блізкая да фальклярыстыкі этналогія, якая вывучае побыт, матэрыяльную і духоўную культуру народа.

У глыбокай старажытнасці з фальклору як сінкрэтычнага віду народнай культуры бралі пачатак усе віды мастацтва, літаратуры.

На канферэнцыі былі прадстаўлены лепшыя навукова-даследчыя работы, якія ўключалі вывучэнне і даследванні навучэнцамі фальклорнай спадчыны: фальклорнай музыкі, танцаў, спеваў, тэатра, народных рамёстваў. Усяго ў конкурсе “Фальклорная спадчына” прынялі ўдзел 82 работы.

Праектная і даследчая дзейнасць заснаваная на творчасці навучэнцаў, дзе яны вынаходзяць каштоўнае не толькі для сябе, але і другіх, таксама накіраваная на раннюю прафарыентацыю сярод моладзі, бо арганізацыя праектнай творчасці і даследчай дзейнасці педагогаў і навучэнцаў, напраўленна на вывучэнне, зберажэнне беларускай народнай культуры, магчымасць зазірнуць у прафесію. Як прыклад, Шастакова Анастасія аўтар навукова-даследчай работы ДУА “Гімназія № 2 г.Пінска” абласнога конкурсу “Фальклорная спадчына” піша: “Закончив работу над проектом, я могу сказать, что цель и задачи исследовательской работы достигнуты. Я узнала об истории возникновения тряпичной куклы и о том, какое место она занимала в жизни наших предков. Определила, что многие традиции, связанные с куклами, дошли до нашего времени. Узнала, в какие куклы играли наши бабушки и прабабушки, и приобрела навыки изготовления старинной игрушки. Выяснила, что современные дети предпочитают пластиковую куклу, несмотря на то, что тряпичная кукла по своим развивающим качествам имеет больше преимуществ.

Мои гипотезы полностью подтвердились. Кукла наших предков не просто игрушка, это часть истории и культуры нашей страны. Ценность самодельной игрушки ещё и в том, что она является уникальным предметом для развития ребёнка. Не зря наши предки считали, что *ребенок к четырем годам должен играть с «теплой» игрушкой, чтобы не «простудить» душу*.

Учитывая то, что на территории Беларуси существует только один музей, в котором есть коллекция кукол, исполненных по народным традициям и технологиям (экомузей в д. Стреньки Гомельской обл.), я предложила Козачук О.Н., руководителю музея «Спадчына», открыть новую экспозицию – «Народная тряпичная кукла». Горжусь, что часть кукол в этой экспозиции сделана моими руками. В дальнейшем я планирую стать экскурсоводом музея и лично проводить мастер-классы по созданию тряпичных кукол”.

Галоўным у праектнай і даследчай дзейнасці для навучэнцаў з’яўляецца фарміраванне і развіццё інавацыйных здольнасцей. Актуальнасць



даследчага падыхода складаецца ў тым, што навучэнцы могуць адказаць на пытанні часу. Даследчы падыход да навучання заснаваны на арганізацыі адукацыйнага працэсу, прадугледжвае актыўную самастойную дзейнасць навучэнцамі па авалоданню даследчымі ведамі і назапашваннем новых ведаў, фарміраваннем у іх навуковага светапогляду, развіцця мыслення і пазнавальнай самастойнасці.

Праект відэакліпаў “Берасцейская талакуха”, заснаваны на падставе фальклорнай спадчыны выклікаў зацікаўленасць у моладзі.

Сучасная адукацыя арыентаванае на развіццё даследчых магчымасцей шляхам засваення розных даследчых тэхналогій. У гэтым працэсе вялікая роля праектнай дзейнасці як фактар прадукцыйнай самарэалізацыі навучэнца ў працэссе засваення даследчых тэхналогій. У цяперашні час найбольш перспектыўным метадам адукацыі з’яўляецца праектная дзейнасць, якая дапамагае абагульніць веды, навыкі, прымяніць іх на практыцы, паспрабаваць сябе ў прафесіі і раскрыць творчыя здольнасці. Сумесныя праекты садзейнічаюць праз прадметны змест уплываць на развіццё асабістых характарыстык не толькі навучэнца, але і педагога. У некаторых момантах дзеці больш перспектыўныя, прапаноўваюць відэапрэзентацыі, відэаролікі. З 1 лютага па 1 мая 2016 года У А “Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці” праведзены абласны конкурс відэакліпаў “Берасцейская талакуха” сярод моладзі агульнасярэдняй і дадатковай адукацы Брэсцкай вобласці. Мэта дадзенага праета – падтрымка таленавітай моладзі і зацікаўленнасць навучэнцаў у грамадска-патрыятычнай дзейнасці. Асноўныя задачы – зберажэнне мясцовых народных спеваў, танцаў, абрадаў, прапаганда народных нацыянальных культурных каштоўнасцей беларускага народа.

Вынік, на абласной навукова-практычнай канферэнцыі быў прэзентаваны зборнік відэакліпаў, у які ўвайшло 11 кліпаў фальклорных калектываў сістэмы адукацыі Брэсцкай вобласці, з іх 8 пераможцаў праекту. Моладзь змагла праявіць свае творчыя здольнасці і прымяніць іх на практыцы, дакрануцца да багатай фальклорнай спадчыны і зрабіць новы арыгінальны прадукт.



(фото фрагмента паседжання абласной дзіцячай навукова-практычнай канферэнцыі 21.05.16г.)

ЗМЕСТ

АБРАДЫ

- СТРАСНЫ ТЫДЗЕНЬ І ВЯЛІКДЗЕНЬ У ТРАДЫЦЫЯХ ПІНЧУКОЎ 7-12
- ФОЛЬКЛОР МОЕЙ МАЛОЙ РОДИНЫ 13-33
- РЭСТАЎРАЦЫЯ ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДА “УДОД” ВЁСКІ ХАРОШЧА ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА 34-36
- ФАЛЬКЛОРНАЯ СПАДЧЫНА 37-58
- ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР КАМЯНЕЧЧЫНЫ 59-67
- СВЯТЫ І АБРАДЫ МАІХ ПРОДКАЎ 68-76

СПЕВЫ

- ПЕСНЯ – ДУША НАРОДА 78-85

РУЧНІКІ

- СІМВАЛЫ ШЧАСЦЯ Ў БАБУЛІНЫМ АРНАМЕНЦЕ 86-100
- БЕЛАРУСКІ АРНАМЕНТ– МОВА ТКАНЫХ І ВЫШЫВАНЫХ ВЫРАБАЎ МАЙСТРОЎ ВЁСКІ ВОЛЬНА БАРАНАВІЦКАГА РАЁНА 101-113
- БЕЛАРУСКІЯ РУЧНІКІ: ТРВДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЁСКІ МІЛЕЙКА ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА) 109-114

РАМЁСТВЫ І КАРЦІНЫ

- ГАНЧАРЫ РУЖАН 115-118
- БОНДАРСТВА – ДРАЎЛЯНАЕ РАМЯСТВО 119-122
- КАНОРАВЫ КАРЦІНЫ 123-128
- КУКЛА ИЗ ГЛУБИНЫ ВЕКОВ 129-147
- СПАДЧЫНА ПРОДКАЎ. ЯК ВАЛЯЦЬ ВАЛЁНКІ? 148-157
- ЗАБЫТЫЯ РАМЁСТВЫ ВЁСКІ МАХРО 158-161

ЛЕГЕНДЫ І ЖАРТЫ

- БЫЦЕНСКІ СКАРБ – ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ РОДНАГА КРАЮ 163-169
- ЖАРТЫ, АНЕКДОТЫ, ДОСЦІПЫ ВЁСКІ ХАБОВІЧЫ 170-175

ТАНЦЫ

- ПОБЫТАВЫЯ ТАНЦЫ 177-186

Абрады





Шыкіла Аксана
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”
Пінскага раёна на базе
ДУА “Статычыўская сярэдняя школа”
Пінскага раёна
Сачкоўская Людміла Іванаўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Актуальнасць тэмы:

Хочацца згадаць словы французскага пісьменніка А. дэ Сент-Экзюперы. Маленькі Прынц спытаўся ў кветкі: «Дзе ж людзі?» І пачуў у адказ: «Іх носіць ветрам. У іх няма каранёў...» Быць без каранёў, забыцца на пераемнасць пакаленняў, непаважліва ставіцца да тых, хто жыў да нас, да мясцовай традыцыйнай культуры — значыць, не мець будучыні.

Спадчыннае, народнае, мудрае дапаможа нам, маладым, стаць багатым і духоўна. Спадзяюся, што пераканацца ў гэтым можна, пазнаёміўшыся з работай “Страсны тыдзень і Вялікдзень у традыцыях пінчукоў”.

Мэта работы:

вывучэнне і папулярызацыя велікодных абрадаў і традыцый в. Стытычава Пінскага раёна.

Задачы:

арганізаваць практычную работу па збіранні і вывучэнні перадвелікодных і велікодных абрадаў і традыцый;

засяродзіць увагу на праблеме папулярызацыі рэгіянальнага народнага мастацтва ў школьным асяродку.

Вялікую дапамогу пры правядзенні даследавання аказалі нам жыхары вёскі Стытычава *Ніна Барычэўская, 1924 г.н., Вера Райчук, 1921 г.н., і Ніна Шыманская, 1964 г.н.*

Спіс Вялікіх святаў адкрываецца Вялікаднем (традыцыйная назва Пасхі ў палешукоў).

Страсны тыдзень.

Апошнія шэсць дзён перад Светлай нядзеляй асабліва значныя, бо набліжаюць да падзеі, якой чакалі сорак дзевяць дзён. Таму кожны з іх напоўнены сваім адметным утрыманнем.

Апошні тыдзень перад Вялікаднем на Піншчыне называецца Страсны тыждэнь, Посны тыждэнь. Увесь гэты ты дзень захоўваюць пост, які мае назву Вялікі. Асабліва строгі пост у сераду і пятніцу.

На працягу ўсяго тыдня ў хаце і на двары наводзіўся парадак. Да гэтага часу патрабавалася закончыць ткацкія справы.

Вера Райчук:

“До Вэлыкодня прадэмо, ужэ ткалы кросна, кобскорэй поткаты до свята, да вэрстаты стоять, дотчэмо. Пуд Паску готовылыса, белле пэрымо, попэрымоі радюшкы ісіннькі, шоб было чысто”.

Важным момантам у перыяд падрыхтоўкі да свята была нарыхтоўка прадуктаў харчавання, сярод якіх самымі значнымі выступалі хлеб (печыва), мясныя і малочныя стравы.

Ніна Барычэўская:

"Як рыхтовалэса до Паскы — у жорнах намэлэш жыта, напэчэш чорного хліба — одну діжку, а другую діжку – трохы мукы купыш белыі ў магазіны, а трохы мукы тожэ токоі з жыта, што чорнэ хліб пэклы, і добавыш. А ўжэ трэтю діжку пычэш, то ўжэ самого белого напычэш. Там ужэ еслі е, то масло ўкынэш, молока ўжэ воллеш у тую паску, яйца выб'еш. Яец накрасімо, м'ясозварымо, ковбасы, холодны квас зварымо і так готовалыса”

Да Вялікадня па-новаму ўпрыгожваліся аброчныя крыжы на ростанях, пры ўездах у вёску, адбывалася ахвяраванне.

Ніна Барычэўская:

" Каждый год пэрэд Пасхою мы купляем хто шо, обрэкаемся, або складываемся — ручнікі купляем, вэнка купым, хто нашые фартушка, кажны рікубыраем крэста. Тое знымаем, палылы старое, а новое вішалы. Кажуть, крэст — оборона всэмусэлу. Ткалыручнікна крэст, коб Богсохранывсэло”.

Кажны з дзён Пасхальнага тыдня меў сваё прызначэнне.

Панядзелак пачынае тыдзень падрыхтоўкі да сустрэчы Светлага Вялікадня.

Ніна Шыманская:

“У поныділок прыбыралі на подвурку: вымыталы двір, вычышчалы ў садуі огороду, чыстылы скот”.

Гэты дзень быў удалы для лячэння дзіцячых прыпадкаў. Для гэтага трэба было ўзяць вады на Страсным тыдні, набаяць і абмыцьдзіця:

"Дытячэ тіло, ангельская душа, пэрэд Выратовальніком нывынная і ў покутах бызвынная. Ачыстыса і адужай. Амінь".

Аўторак падтрымліваў асноўны прынцып гэтага тыдня - ачышчэнне душы, цела, а галоўнае, жылля. А яшчэ ў народзе казалі: "У чысты панядзелак і аўторак няможна ў хаце трымаць чаго-небудзь нячыстага, бо на людзей і на жывёлу нападуць паршы".

Забельваючы печ перад Вялікаднем, паціху паўтарыце сем разоў:

"Забылюбруд, а з еюшчоб усякому лыхупрорва. Амінь".

Серада на Страсным тыдні атрымала незвычайную назву - "Дравляная”. У гэты дзень у хаце мылі ўсё драўлянае - дзежку, хлебную лапату, сталы, лавы.

У сераду чыста вымывалі хату і ўпрыгожвалі: мылі падлогі і рассцілалі чыстыя дываны і палавікі, на стол слалі святочны абрус, на вокны вешалі чыстыя святочныя фіранкі, чырвоны кут упрыгожвалі святочным ручніком.

У ноч з серады на чацвер на адкрытай мясцовасці ставілі соль. Назаўтра раніцай яе забіралі ў хату. Такая соль служыць наймоцным засцярогам на працягу ўсяго года.

Вера Райчук:

“Той, хто хотів змыты з сэбэ хваробы, пэрэд Чыстым чытвыргом паставыць воду пад "зоркы" і набае так:

"Пану, Усэмогутны Божэ;

Створыв усэ з нычого!

Бласловы і ачысты тіло мое,

Захавай мэнэ ад ворога.

Благословы, Пану, мой застэрог.

На вечныі часы.

Тэпэр і прісно і по вік віков. Амінь".

Рана раніцай гэтай вадой трэба абліць сябе з галавы да ног.

Чысты чацвер. Па народным календары чацвер перадвелікоднага тыдня называецца Чыстым (Страсным) чацвяргом.

Ніна Шыманская:

"Чысты чэтвэр, ужэ ўсэ повінно быть чыстым".

Сярод жыхароў Брэсцкага Палесся Чысты чацвер да гэтага часу мае вялікае значэнне і суправаджаецца звычаямі, абрадавымі дзеяннямі, прыкметамі і павер'ямі, якія групуюцца вакол ідэі ачышчэння, чысціні душы, цела і па-радку навакольнай жыццёвай прасторы:

Ніна Барычэўская:

"У Чысты чэтвер помыцца, бо Ісусу Хрыстовы ногы мылы на вечэры, як заседалы. У Чысты чэтвэр ходылы ў цэркву ў Містковычы на вэчэрню, покупалы большушчые свечы, зажыгалы і з гэтымы свечамы прыежджалы до дому. Говорылы, што гэто свеча ў хозяйствы, она само помочная, гэты нэдогарок. З гэтою запаленою свечою обходылы хату, по ўсі хвуглах ходылы по хаты, у хлэві. Запальвалы йійі, як часом дітям шчо плохо, зажыгалы йійі да пудкурвалы”.

Дамінуючая ў разуменні Чыстага чацвярга ідэя чысціні прадвызначыла шэраг рытуальна-магічных дзеянняў, накіраваных на забеспячэнне чысціні і здароўя цела. Такой жа ачышчальнай і гаючай семантыкай надзяляецца вада, асабліва цякучая, таму ў гэтыдзень (да сонца) рэкамендусцца памыцца.

Вера Райчук:

"Рано, до сходу сонца прынэсэш воды з колодежа і тэю водычкою сам мыешса, і мыеш шчо надо. Это шчоб было тело чыстое, шчоб не було ныякіх болячок".

Лічылася, што чысціню можна наводзіць толькі да паўдня, час наступны павінен прысвячацца духоўнаму ачышчэнню і наведванню храма.

Існуе павер'е, што купанне досвіткам у лазні, рэчцы, возеры ў Чысты чацвер змывае ўсе грахі і хваробы на ўвесь год.

Ніна Барычэўская:
“ Коб дівчыну любылы і ны обходылы вніманіем, мыючыса ў Чысты чэтвэр, трэба проговорыты:
"Як светлый і чырвоный Чысты чэтвэр, так і я рабыня (імя) для всіх буду выдатной. Амінь".
Пятніцу перад Вялікаднем называюць Страсной.
У пятніцу зачынялі цеста і выпякалі велікодныя кулічы - паскі, фарбавалі яйкі - сімвал Вялікадня, рыхтавалі святочную ежу.
Самай галоўнай і адказнай справай у Страсную пятніцу было фарбаванне яйкаў. У велікоднага яйка шмат прызначэнняў: пасля асвячэння ў храме, з яго пачынаюць разгаўляцца раніцай у нядзелю, на працягу першых трох дзён велікоднага тыдня ўсе сямейныя трапезы пачынаюцца толькі з асвячонага яйка; яго дораць сябрам і блізкім, сваякам, хросным і хроснікам, нясуць на могілкі - успомніць блізкіх. У Страсную пятніцу з раніцы глядзелі ў акно, прыкмячаючы, каго ўбачаць першым.
Вера Райчук:
“Колы бачылы мужчыну, то в хаты будэ достаток.
Колы бачылы жоноччыну, то достатак пырыплітавса з ныводачою.
Колы бачылы інваліда, то гэто до смэрты блызкого чоловіка”.
Сярод мясцовых жыхароў існуе павер'е, што чалавек, які захварэў у Страсную пятніцу (патрапіў у лякарню), хутка паправіцца.
Калі вы заўважылі, што ў вашай хаце стала рабіцца штосьці нядобрае, трэба ў Страсную пятніцу пайсці ў царкву і прынесці дахаты свечку, якая была ў вас падчас службы і не дагарэла. Запаліць яе ў хаце і абыйсці ўсе пакоі. Там, дзе свечка пачне моцна трашчаць, знаходзіцца "порча" (нейкі прадмет).
У Страсную пятніцу ў Месткавіцкай Свята-Троіцкай царкве адбываецца рытуал вынасу Плашчаніцы.
У **Чырвоную суботу** кожная гаспадыня працягвае рыхтаваць пасхальны святочны стол.
Аснову яго складаюць стравы з мяса, печыва.
У Чырвоную суботу з поўдня да вечара ў цэрквах асвячаецца велікодная ежа: кулічы, фарбаваныя яйкі. Колер яек вызначаецца ў нашай вёсцы катэгарычна, гэта звычайна суправаджаецца адсылкамі да Свяшчэннага Пісання.
Ніна Барычэўская:
"Трэба, шчоб красныйі булы, бо гэто Хрыстова кроў. Малюють зарэ ўсякыйі жовтыйі, галубыйі, а положэно, шчоб чырвоныйі булы".
Вернікі расстаўляюць свае прынашэнні на ручнікі, пры гэтым неабходна ўставіць у куліч свечку, якую запальваюць перад пачаткам асвячэння. Адно з велікодных яйкаў варта напалову ачысціць, каб акрапіць святой вадой.
Ніна Барычэўская:

“Колы ў сэм’і хто-ныбудь помэр і посля гэтого ны прошов год, то нэ трэба красыты яйца і святыты іх у цэрквы або коло каплыцы”.

Усяночная. Святочнае набажэнства.

Велікодныя ўрачыстасці пачынаюцца апоўначы з хрэснага ходу вакол храма і ўсяночнага богаслужэння**.** Затым святар абвяшчае аб уваскрэсенні Хрыста**,** і пачынаецца святочная літургія**.**

У апошнія гады ўсе прыхажане нашай Свята-Троіцкай царквы чакаюць Святы Агонь, які дастаўляюць з Іерусаліма ў Мінск самалётам. А затым Агонь вязуць ва ўсе цэрквы Беларусі. У нашу царкву яго дастаўляюць каля двух-трох гадзін ночы. Свечку, з якой стаялі ў храме, сустракаючы Светлае Хрыстова ўваскрэшанне, звалі велікоднай і надзялялі яе звышнатуральнай сілай. Лічылася, што толькі ёю можна было выправіць "сапсаваную" хату (адно з рытуальных дзеянняў пры гэтым - выпаліць крыж на вушаку дзвярэй). Пасля заканчэння службы і хрыстосавання кожны гаспадар імкнуўся як мага хутчэй вярнуцца дадому.

Вера Райчук:

"З Усеночной спышылы, коб самымы пэршымы прыйты, гэто до того, хто пэршы прыйдэ до хаты, всігда пэрша работа будэ ійты ў полі кругом, самы пэршы будэтобі і ўрожай, і робота".

У гэты дзень забаранялася замятаць у хаце, інакш куры будуць псаваць город.

На Вялікдзень абавязкова зрабіце 7 добрых спраў ці падарыце 7 падарункаў.

Разгаўленне.

Дома чакалі вяртання з набажэнства гаспадара ці гаспадыні.

Ніна Барычэўская:

"Прыдэш з цэрквы,тодіты шчэсплять, скажэш: "Хрыстос воскрэс!", усіх поцолуеш, діты повстають, запалым свічку і молітву "Отчэ наш" шчытаемо і садымоса йісты. Хозяйка кажэ:”Будэм снідаты, бо люды поснідають, да мы будэм последні, да будэ ў нас робота последня”. Пэрвый садыцца за стол хазяін, батько, а тоды старшыйі і діты. Розговляемся, старшыйі ідуть спаты, а молодые пошлі музыку шукаты, танцы ўжэ вэчором”

Велікодную трапезу пачыналі з асвячонага яйка, якое дзялілася на столькі частак, колькі было членаў сям'і, што тлумачылася наступным чынам: "Коб сэм'я була цэла, як яйцэ" або адсылалася да біблейскіх падзей.

Вера Райчук:

"Яйцом розговлялыса, кусочкамы порэжэм. Вот як Господь воскрэс, зайшоў до вучэнікоў своіх, а воны сыділы і ў іх було тры рыбыны, тры булочкы, а було ж 400 чоловік йіх, то оныж, ныма што йісты, сыдять і нэ знають, шчо робыты, а як Він до іхзайшоў і од йіх забраў гэтую рыбу, і забраў од йіх гэты хліб, поблагословыў по-своему, порізав на дробнэнькыйі кусочкы, і всі 400 чоловік насытылыся”.

Велікодная раніца поўнілася адметнымі прадпісаннямі, што неслі ў сабе сакральны сэнс забеспячэння здароўя і дабрабыту на ўвесь год.

Вера Райчук, Ніна Барычэўская:

"Як поснідаем, выбыгаем на двор і старалыся птічку побачыты. Гэто вэлыкы дар Божы. Колы побачыш там, чы буско лэтыть чы птічка лэтыть, то кажэ, гэто будэ здоровы чоловік і шчэ за год дождаты будэ Паскі. А як сыдыть буска чы стоіть, то ўжэ скучновато, будэш боліты. У нас стараюцца побачыты, як сонэйко грае на Паску, на Івана і на Пэтра і Павла. Заслыпляе вочы, грае ўсякымы ўзорамы: і сыніе, і жоўтые, і маліновы, і такэ большэ робыцца, а после розважыцца і скачэ, і обратно такы цвета ўсякые. І доўго, пока нэ подыйдэ мо мэтров два, так грае, усякые цвета, як у радугы. Говорать, шчо нэ всім дано побачыты: як чоловік шчаслывы, той ёго побачыть, аякне — той нэ побачыть" .

Рэшткі велікодных страў і наогул велікодныя атрыбуты старанна захоўваліся і затым скарыстоўваліся ў крытычных сітуацыях, бо лічылася, што яны валодаюць ахоўнымі ўласцівасцямі.

Ніна Барычэўская:

"Шолупаечкы з яец бэру ў бумажку закручваю і затыкаю ў хаты дэ-ныбудь, шоб воны булы, і батюшка говорыў, шо дэржітэ ўхаты, это от грому. Я і хлеб святы дэржу, як заболееш, то возьмэш кусочэк со святэю водою да поеш".

Рэшткі велікодных страў маглі захоўвацца да Ушэсця.

Гульні.

Як і па ўсёй Беларусі, самай любімай велікоднай забавай на Піншчыне было качанне і біццё яек. Важна падкрэсліць, што занятак гэты выключна мужчынскі альбо дзіцячы, і гэтыя групы ладзілі свае спаборніцтвы паасобку.

Ніна Шыманская:

“У быткы гулялы на пэршы і на другы дэнь. Гулялі ў йяйца тулько мужчыны і діты. Яйца краснымы б'ють, хто ў кого выб'е, мое побылося, і я свое оддаю, у одного много навыб'е, а ў другого — свойі всі пооддае.От ніколы ў нас такыйі былі обычайі хорошы”.

У сваёй даследчай рабоце я імкнулася данесці да слухачоў думку, што мы – сучаснікі павінны ўсведамляць сваю адказнасць перад продкамі, каб не страціць набытак, што назапасілі яны. Мы, сучаснікі, павінны прымнажаць і перадаваць яго наступнікам.

ФОЛЬКЛОР МОЕЙ МАЛОЙ РОДИНЫ



Ярмалюк Кацярына, Трубчык Сняжана
аўтар навукова-даследчай работы

ДУА “Лелікаўскай сярэдняй школе
імя У. Шапацюка” Кобрынскага раёна
Вазнюк Юлія Пятроўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Звер, што снуецца ў пушчы,
з самага дня нараджэння
ведае яму сваю

Ф. Скарына

У каждого человека есть своя малая родина. Что мы, в сущности, о ней знаем?! Географические и природные особенности, историческое прошлое, знаменитые земляки. А где душа, каково духовное наследие? Искать её надо в народном творчестве. Сегодня приобщение к ценностям народного творчества необходимо, так как в нем воплощено прошлое культуры. Особенно важно обратиться к традициям, восстановить те нити, которые накрепко связывали старшее и младшее поколения, возродить преемственность. Не случайно 2016 год объявлен в стране Годом культуры, целью которого является привлечение внимания общества к вопросам развития культуры и сохранения культурно-исторического наследия.

Народный фольклор открывает внутренний мир человека, учит любви к родине, ко всему живому в природе, любви к родному краю.

Для того чтобы узнать какие традиции сохраняют местные жители, какие песни пели наши предки, жившие на территории Кобринского района в деревне Леликово, были организованы фольклорные экспедиции.

Цель: изучить фольклор деревни Леликово Кобринского района.

Для достижения этой цели нужно решить такие **задачи**:

1.Изучить материалы библиотечного фонда школы о местном фольклоре.

2. Изучить неопубликованные архивные материалы воспоминаний старожилов об истории деревни Леликово

3.Собрать краеведческий материал по теме (легенды, песни, пословицы и поговорки)

4.Организовать встречи со старожилами, любителями петь и рассказывать занимательные истории.

5.Обобщить собранный материал.

Объект исследования: фольклорное наследие деревни Леликово.

Предметом исследования выбраны: легенды, песни, пословицы, поговорки.

Методы исследования: беседа-интервью со старожилами деревни, изучение архивных материалов, работа с музейными записями.

Гипотеза: сохранило ли современное поколение фольклорное наследие предков своего народа.

Практическая значимость: результаты данной исследовательской работы можно представить на неделе краеведения, оформленный материал предоставить в школьный музей и сельскую библиотеку.

1. Откуда имя твоё, деревня?

Названия населённых пунктов - это исторические мостики, которые соединяют нас и нашу современность с историческим прошлым, порой весьма и весьма далёким.

Узнать о происхождении названия населённого пункта — значит прикоснуться к истории, почувствовать связь времён и поколений.

Откуда пошло название деревни Леликово?

Традиционной считается гипотеза происхождения названия от украинского слова «лелека», что значит «аист». Деревня была окружена множеством болот, где настоящим хозяином была эта прекрасная птица. Еще в XX веке почти на каждом доме было гнездо, а то и два. С течением времени, под влиянием польской, литовской, русской и других языков слово "лелека» изменилось и трансформировалось в название села Леликово. А вот аист так и остается символом деревни *(приложение 1)*.

Вторая версия утверждает, что деревня основана в знак уважения к богине Лёля. Лёля покровительствовала у славян девичьей любви, влюбленным, красоте, счастью, первым росткам на пашне.

Жители села предпочитают первую версию происхождения названия, потому что в памяти стариков не сохранилось никаких преданий о богине любви Лёля.

2. Песни малой Родины.

Термин «фольклор» пришел к нам из староанглийского языка. Быть может, потому что он относится не только к музыке: английское folk – народ, lore – учение. Вместе эти слова folklore переводятся как «народная мудрость». Именно так, принято сейчас во всем мире называть устное музыкальное и литературное народное творчество. Название это справедливо. Народная поэзия, тесно связанная с музыкой своей ритмичностью, музыкальностью и характером, является основой музыкального фольклора.

Музыка занимает в нашей жизни большое место. Ни один праздник, ни одно важное торжественное событие не обходится без нее. Серьезная музыка заставляет задуматься, сопутствует человеку в горе, как бы откликается на его чувства, приносит утешение, воодушевляет его на преодоление трудностей в жизни, умножает силы. Веселая музыка доставляет нам удовольствие, развлекает, положительно влияет на трудоспособность.

Фольклорно-музыкальное наследие деревни Леликово остается таким, каким оно было при дедах и прадедах, сохранивших и принесших с собой

эти знания. Более сохранились в памяти и передаются, как семейные традиции, лирические песни. Это песни о любви, о переживаниях.

…Ой, вэйду я й подывлюся
Да ж мэлого й хата…. *(приложение № 2)*

Лирические песни отличаются богатством и разнообразием, раскрывая душевное состояние человека, его переживания, чувства, настроение. Например:

Ой, матэ сэна й ожанэла, 2 разэ́
Тай, навістку ны взлюбэла… *(приложение № 3)*
Ой, там у по́лэ садо́чок
Там дівка, ві́ла вино́чок… *(приложение № 4)*
Ой, покотэлась орішіной по лёду,
Ой, осталася удовою у роду… *(приложение № 5)*

Вся жизнь человека связна с трудом. Эта тема нашла широкое отражение в народных песнях. Трудовые песни облегчали тяжелую работу, объединяли людей, с песней работалось дружнее, организованнее, веселее.

Ой, жні́мо, жні́мо, ху́тайко
Підáмо додому рáнойко.
Жнімо, жанчынке, до куцця
Підамо до домэ за сонця.
Жнімо, жанчынке, до краю
Підэмо до дому, до раю…

Обрядовые семейно-бытовые песни связанны с важнейшими событиями в жизни семьи. Особой пышностью выделялась свадьба. В свадебном обряде принимало участие много людей, почетными были певцы, музыканты. Недаром, раньше говорили «играть свадьбу» - это выражение сохранилось и до наших дней. Вот одна из свадебных песен:

Слыдо́к на поро́зэ,
Ганночка у доро́зэ…. *(приложение № 6).*
А так

Ещё в деревне Леликово существовал такой обычай ***«Вінкэ́».*** Перед свадьбой, в четверг, невеста собирала своих подружек, а жених привозил парней, которые готовили головные уборы жениху и невесте. Примеряя головной убор невесты, девушки пели песни.

Ой, там, дівочкэ ві́лэ вино́чкэ
Со́сну гасэ́ла, вінка́ згубэ́лэ… *(приложение № 7)*

Сочиняли люди и песни, которые связаны с историческими событиями.

Була́ Польшча, була́ Польшча,
Тай ста́ла Расе́я… *(приложение № 8)*

Много песен в деревне Леликово связано с традиционными обрядами. Например, в Шедрый вечер (13 января) ходили ряженые в образе цыган или юноши с «козой», для которой пели специальную песню:

Скакала коза
По лісáм, по горáм… *(приложение № 9)*

А Рождество Христово (7 января) было принято отмечать три дня. Вечером в сочельник малые дети ходят под окнами домов и нараспев просили «колядны́к» (пирог).

Багат- багат багатнык.
Дай дядынко коляднык.
Заспівают тетеры,
Щоб дождалы вечéры.

И пели религиозные колядки:

«Вэчору святому
Воссіянне зыр….» *(приложение № 10)*

На второй день Троицы в нашей деревне молодые девушки и юноши водили хоровод, который назывался ***«Крэ̂нька».*** «Крэнька»- это куст. Одну девушку одевали в одежду зеленого цвета, плели венок и водили хороводы, напевая песню:

“Ой, там у полэ, дывочкэ гулялэ
Дывочкэ гулялэ, квіточкэ рвалэ…” *(приложение № 11)*

Народная поговорка говорит: «Не я пою, душа поет». Песня – это пища души. А душа вечна!

3.Пословицы и поговорки деревни Леликово.

Жители деревни Леликово говорили на диалекте, который значительно отличался от диалектов окрестных деревень. Несмотря на мощное влияние украинского, русского, польского и белорусского языков в разные периоды истории, леликовчане до сегодняшнего времени сохранили свой диалект, свою языковую культуру, что свидетельствует о глубоких и сильных корнях самобытности жителей деревни Леликово. Вот какие пословицы и поговорки мы записали с уст местных краеведов -Трубчика Николая Прокоповича и Шепетюка Петра Степановича *(приложение № 12).*

Про того, кто очень перебирает девушек, и ни одна ему не нравится, говорили:

“З вáлэкого перабóру-той вэ́браў засёру”. Перебирал - перебирал, да и женился на некрасивой, неопрятной и ленивой девушке.

О ленивых девушках говорили так:

“Пушлá Гáндзя жэ́то жéтэ, та і забýла сáрпа взéтэ, сáрпа взéла-хліб забýла…такэ́ Гандзя вдóма бýла”.

А так родители горевали о своей беспутной и несчастной дочке:

“В кого дочок сім, то ім і доля всім, а ў манá одно око, та і тоя глубоко”.

Если кто-то из семьи просит отца или мать купить что-то, для него не такое уж и важное, то в ответ можно услышать:

“Купэ́ў бэ сало́, но грошій голо́” или ***“Купэв бэ вола, но кішэня гола”.***

Пословицы и поговорки с детских лет учили и наставляли, приобщали к сокровищам народной мудрости, к правилам и моральным нормам «неписаных» законов народной жизни *(приложение № 13).*

4.Одежда жителей деревни Леликово.

Как рассказали нам Анастасия Игнатьевна и Пётр Степанович Шепетюки *(приложение 14)*, основную часть повседневного мужского костюма составляли рубаха, вышитая по вороту и низу, штаны и пояс. Рубаха носилась навыпуск *(приложение 15)*, подпоясывалась цветным поясом *(приложение 16)*. В качестве верхней одежды использовались *«латуха»* или *«верхний сухман»* из сукна домашней работы, как у мужчин, так и женщин. Мужчины носили лапти. По праздникам надевали сапоги. Рассказывали, что на всю деревню имелась одна пара сапог, которую надевал один раз в жизни жених, когда шел под венец. Бедные крестьяне носили лапти круглый год, утепляя их с помощью подкладывания соломы внутрь и обматывая ноги полотняными онучами. Повседневный женский костюм составляли вышитые полотняная рубаха, такая же юбка, которую здесь называли *«фартух»,* и передник, называемый *«затулка» (приложение 17)*, Женские головные уборы имели важное социальное и обрядовое значение. По их виду можно было определить семейное положение, возраст женщины, её материальное положение. Головные уборы использовались в обрядах, например, на свадьбах девушке торжественно меняли девичий убор на женский. Девушки носили венки, узкие разноцветные ленты *(приложение 18)*, а женщины прятали волосы под чепец или платок *(приложение 19)*. Использовали и рогатистые головные уборы *(приложение 20).*Этот головной убор символизирует боевитость подружки- свахи жениха, поэтому рожки в кокошах- брэ́жках, которые сделаны из перьев хвоста боевого петуха *(приложение 21)*. Женщины в крестьянских семьях также носили лапти из лозовых лык. В холодную погоду носили постолэ́. Сапоги и женские башмаки (чэрэвэ́ки) носились только по праздникам.

Заключение.

Собрав и проанализировав народные песни, сделали вывод о том, что они представляют собой бесценный источник сведений о культуре жителей нашего края в прошлом, их нравах, интересах, вкусах. Все это в целом – душа и память народа. Она наполняла внутренним смыслом размеренную человеческую жизнь. И поэтому жизнь протекала согласно мудрым установлениям. Эти установления были выработаны трудовой жизнью, общением с природой, почитанием заветов отцов и дедов.

Народные песни деревни Леликово сохранили и особенности местного говора. Исполнителями народных песен в основном являются женщины. Часто они исполняют любимые песни и под гармонь

Встречи, беседы с исполнителями, знатоками народной песни дали повод задуматься о том, что в прошлое уходит многое из народного творчества, умирают люди, знающие старинные песни, обряды, предания, легенды, унося с собой частицу уникальной белорусской культуры. И нам, молодым, надо сделать все, чтобы сохранить то великое, что создавали наши предки и бережно передавали из поколения в поколение.

В заключении работы можно сделать вывод о подтверждении нашей гипотезы о том, что фольклорное наследие наших предков живет в памяти людей.

Список использованных источников.

1. Воспоминаний жителей деревни Леликово:
   Трубчика Николая Прокоповича, 1939 года рождения;
   Шепетюк Анастасии Игнатьевны, 1945 года рождения;
   Шепетюка Петра Степановича, 1942 года рождения;
2. Материалы сельской библиотеки д.Леликово
3. Материалы школьного музея «Спадчына».
4. Церковная летопись Свято-Дмитриевской церкви деревни Леликово (неопубликованный материал священника Андрея Кирилюка, 1953 г.).

Приложение 1



Приложение 2

1.Ой, вэ́йду я на го́ройку,
Дэ пасу́ть тэля́та.
Ой, вэ́йду я й подывлю́ся,
Да ж мэ́лого й хата.

2.Його ха́та й за горо́ю,
Моя за другó́ю.
Чы тэ ту́жыш так за мною,
Як я за тобою?

3.Кудэ́ йдаш, кудэ́ йдаш?
Куды одйызжаяш?
Чу́ю я ча́раз людэ́й,
шо тэ да́сять ма́ешь.

4.Одна мэла коня вада
Друга напоюя
А трэтя сыдло наса
Чатварта сідлая.

5.А пье́та- бíльё мэ́я,
Шо́ста- кача́я,
А сёма- обíд ва́рыть,
Во́сьма-налы́вая.

6.А сёмая обíд варыть,
Во́сьма-налывае
Да́вьета в та́наць іда́
Дасе́та пітае.

7.Кудэ йдаш, кудэ йдаш?
Ты мій, сэві орла?
А хто ж мана, молодую,
До саба прігорна?

8.Прігó́ртайся ж, моя мэ́ла,
Тэ кому другóму,
Но ны кажэ́ тае правдэ
Шо мíні однóму.

Приложение 3

Ой, ма́тэ сэ́на й о́жанэла, 2 р.
Тай, навíстку ны взлюбэ́ла.
Са́ма ра́но- ра́но уста́ла, 2 р.
Тай навісткэ ны збудэ́ла.

А навістка й розум ма́ла, 2 р.
На дру́гай дань рано встала, 3р
В по́лэ й волы́ке пу́гнала.

Ой, пугнала волэ́ па́стэ
Взя́ла со́бі ку́шэль пра́стэ.
Прада́ ку́шаль тоно́сайко
Пла́ча сы́лью сыльсанойко.
Вэйшов мэлый із обурув,
Зачув голос по дубрувэ.
Чі то куе зузулайко
Чі то плача моя мэла
Жанэ мэла сэвэ волэ
Загоняй іх до оборэ.
Варыть матэ вачорэцю 2 р.
Для навісткэ чамарэцю
А сэновэ мад-вінэцю
Налывая ў шклянэцю
Напэймося мы обоя 2 р
Поміраям разам двоя
Матэ сэна схоронэла
На цвінтарэ под костелом 2 р
А навістку схоронэла 2 р
За цвінтаром за костелом
На сэновэ вэрос явор 2 р.
На навісцэ біла лэпа 2 р.
Гілля із гіллям злынаяцца
Лэст з лэстом злынаяцца
Ідуць люда і дывуюцца
Шошто люда вам за дэво 2 р.
То навістка з моім сэном 2 р.

Приложение 4

1.Ой, там у полэ садочок
Там дівка, віла віночок
Ой, вілá, вілá,
Тай і заснула
Ек прыйіхав молодчік ны чула.

2.Ой, устáнь, дівко,чого спэш,
Чого ж тэ віночка ны в’еш?
У полэ нічка зайняла косойка,
Росою прыпала

3.Ой, отчынэ матэ, оконца старусэ,
Ой, отчынэ матэ, світліцу старусэ,
С косойкэ росіцу
Ой, отчынэ матэ, другую старусэ
Росіцу дрібную.

Приложение 5

1.Ой, покотэ́лась орішíной по лёду,
Ой, покотэ́лась орішіной по лёду,
Ой, осталáся удовóю у роду.
Ой, осталáся удовóю у роду.

2.Ой, тай пойіду, в славный город у Москву
Ой, роскажу я, про досáдойку свою.
Пэ́ршай досáда, шой дытэ́на малая
Пэ́ршай досáда, шой дытэ́на малая.

Дрýгай досáда, шой й свікрýха лы́хая.
Дрýгай досáда, шой й свікрýха лы́хая.

Трэ́тяй досáда, шой п’янэцу лю́блю я.
Трэ́тяй досáда, шой п’янэцу лю́блю я.

Ой, чым я ж маю, пьянічэ́йку любэтэ
Ох ліпш я буду,удовою й ходэтэ.

Приложение 6

1.Слыдóк на порóзэ,
Ганночка у дорóзэ.
До шлюбу вбіраецца,
Матютцэ кланяется.
Над намэ молодэмэ,
Агóлэ говорэлэ.
Ой, дай нам, Божайку,
Щаслэву дорожайку….

Приложение 7

1. Ой, там, дівóчкэ вíлэ вінóчкэ
   Сóсну гасэ́ла, вінкá згубэ́лэ
   А хто ж пойда віночка шукатэ 2 разэ́

2. Свахайко ка́жа: “Я ны пойду”
   Сватайко ка́жа: “Я ны пойду”
   Іванко кажа: “Я сам пойду”
   Віночка найду- Ганночку возьму 2 разэ́

3. Повій вітра горою
   За мною молодою
   Розвій мою косу
   Як літнюю рóсу.

4. А кудэ ж тэ Ганночко ходэла?
   Що тэ свою голову вквітэла?
   Ой, ходэла, мамайко, у вішнів сад
   Там на мою головойку цвіт упав
   Та ж мою головайку вквітовав.

Приложение 8

1.Була́ Польшча, була́ Польшча,
Тай ста́ла Расе́я.
Ны за́ступыть сэн за ба́тька, 2 разэ́
А ба́тько за сэ́на.

2. Йіда́ ба́тько із со́хою,
А сэн з бороно́ю.
Іда́ ма́тэ жэ́та жа́тэ 2 разэ́
З ста́ршаю дочко́ю.

3.Ох, жну́ть вонэ́,ох, жнуть вонэ́,
Дры́бны до́шчык і́да
Огле́нулысь наза́д са́ба 2 разэ́
Аж, эконо́м йі́да.

4.А що ж вита́ псякрэ́в до́чка
Що ж вита́ робэ́лэ
А чом вита́ за пого́дэ 2 разэ́
Снопі́в ны знасэ́лэ.

Приложение 9

1.Скакала коза
По лиса́м, по гора́м…
А тепер скачэ
По божіім домам.

2.Дэ коза походыть,
Гарнэ жэ́то родыть.
Дэ коза поска́ча,
Там ныхто нэ пла́ча.

3.Глянь, козу́ню, до па́чі,
Пача́ баба пірожкы.
Екэ ж во́ны я́чны
Для козуні смачны!

Приложение 10

1.Вэ́чору свято́му
Воссия́нне зыр.
А гэ́тому до́му —
Радость і мір.

2.Божэ вас храны,
Дожда́тысь вэсны́.
Золотого ли́та,
Лы́пового цві́та.

3.Бога́той о́сэні
У Го́спода про́сымо,
Наступной Коляды
Божэ прыходы.

4.Бувайтэ здоровы,
Жывітэ богато,
Бо вжэ мы підэ́мо
До дру́гэі хаты.

Приложение 11

1.Ой, там у полэ, дывочкэ гулялэ
Дывочкэ гулялэ, квіточкэ рвалэ
Квиточкэ рвалэ, вилэ виночкэ
Квиточкэ рвалэ, вилэ виночкэ
Вилэ виночкэ, крэньку водэлэ
Вилэ виночкэ, крэньку водэлэ.

2.Повадам крэньку запацюрэньку
Повадам Любку, за крывогубку.
Ек ішлэ травою, збівалэ росу косою
Ек ішлэ травою, збівалэ росу косою.

3.Ой, дай, Божэ, полю літо встрічатэ
А нам, дівочкам, жэніхів шукатэ.
Ой, дай, Божэ, полю хліб родэтэ
А нам, дівочкам, сто літ прожэтэ.

Ой, там у полэ, дівочкі гулялэ
Дівочкі гулялэ, квіточкэ рвалэ.

Приложение 12



Трубчик Николай Прокопович, 1939 года рождения



Шепетюк Пётр Степанович, 1945 года рождения

Приложение 13

- ✔ *“За́гадэ за мо́рам, а сма́рть за плачэ́ма”.*
- ✔ *“Пастух- кіла згубіў кія, шукаў кія- згубіў торбу…і до вачора слёзэ сёрбав”.*
- ✔ *“Якэй їхаў- таку і здэбав”.*
- ✔ *“Малэі дітэ ны дають спатэ, а валэкі- дэхатэ”.*
- ✔ *“Матэ пурвала пазуху для дытэй малэх, носячэ, а взрослэ дітэ пурвалэ пазуху ад матара хаваючэ”.*
- ✔ *“Ек хоч сварэся, но свій свого даржэся”.*
- ✔ *“Сычэся, рубайся, а свого барогу трымайся”.*
- ✔ *“Хто батька- матэра поважэя, тому бог віку прібавлея”.*
- ✔ *“Пруўшов боком і ны стэщів кошіка прібратэ”.*
- ✔ *“З пустої байкэ ны прідбаяш майкэ” (ма́йка- маёмаць).*
- ✔ *“Хто пітая, той ны блудыть!”.*
- ✔ *“Хто працуя, той ны нудыть”*
- ✔ *“Наварэла Луця (Лукер’я), шчо ны парахлапча їцюця” (сабака).*
- ✔ *“Хто чужого ны шануя, той і свого ны матымэ”.*
- ✔ *“Польска і сыль солошішша” .*
- ✔ *“ Ны тая матэ, що вродэла, а тая, що в світ розумного пустэла”.*
- ✔ *“Хоть у хво́ю головою”.*
- ✔ *“Наложэ́ й на па́нь, то бу́да падоба́нь”.*
- ✔ *“Ны хо́ча свіннéча ла́па лажéтэ на столі́, ныха́й іда́ пуд стыл”.*
- ✔ *“Мох чі во́вна- абы кы́шка по́вна”.*
- ✔ *Бя́ла, ны бя́ла-абы во́ду відзя́ла”.*
- ✔ *“Нэ было нас-был ляс, і нэ бэ́ндэ нас-бэ́ндэ ляс”*



Анастасия Игнатьевна и Пётр Степанович Шепетюки в народных костюмах



Во время фольклорной экспедиции к Анастасии Игнатьевне и Петру Степановичу, 2015 г.

Приложение 15



Основную часть повседневного мужского костюма составляла рубаха, вышитая по вороту и низу.

Приложение 16



Мужская рубаха носилась навыпуск, подпоясывалась цветным поясом

Приложение 17



Повседневный женский костюм составляли вышитые полотняная рубаха, юбка передник.

Приложение 18



Девичий головной убор

Приложение 19



Замужние женщины прятали волосы под чепец или платок.

Приложение 20



Костюм свахи жениха

Приложение 21



Головной убор свахи жениха

РЭСТАЎРАЦЫЯ ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДА “УДОД” ВЁСКІ ХАРОШЧА ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА



Молчан Арцём
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Сярэдняя школа № 1 г. Івацэвічы”
Барысюк Таццяна Мікалаеўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Зварот да даследавання вясельнага абрада “Удод” прадыктаваны зацікаўленасцю да мясцовых традыцый, жаданнем ведаць, як нашы продкі святкавалі вяселле – адно са святаў, што запамінаецца на ўсё жыццё і спрыяе дабрабыту і шчасцю маладых.

Мэта: выхаванне нацыянальнай свядомасці, патрыятызму, зацікаўленасці да мясцовых традыцый і звычаяў.

Для рэалізацыі пастаўленай мэты вырашаюцца наступныя агульныя і прыватныя задачы :

Задачы:

выхаванне любові да роднай культуры, фарміраванне каштоўных арыенціраў.
зберажэнне мясцовых традыцый.
прапаганда нацыянальных культурных каштоўнасцей беларускага народа.

Ні для кога не сакрэт, што беларусы працавіты, а таму і жывучы народ. Надзею ўскладваў на розум і гаспадарлівасць, на рукі ўвішныя і плечукі трывалыя. Жыў у згодзе з суседзямі, гуртам і талакою супрацьстаяў стыхійным выклікам, узводзіў вуглы і клапаціўся, каб у іх заўжды сяліліся лад і згода.

Гасцінны, добразычлівы і хлебасольны быў, як ніхто са славян. Умеў весяліцца і ладзіць святы, захоўваць урачыстыя абрады. Вядома, час многае змяніў і адмяніў, сучасныя тэхналогіі актыўна ўздзейнічаюць на густ і каштоўнасці. Абрады і дзействы, якія складваліся вякамі, становяцца рэдкасцю, нават дзівацтвам. А вельмі добра, што свядомыя і

нераўнадушныя дзівакі жывуць, напамінаюць нам, пра тое што адгалоскі абрадаў варта зноўку асвойваць. Што яны могуць быць закваскай і ў асяродку заможнасці, і на астраўку сціпласці. Я рады таму, што выпадак звёў з добрымі дзівакамі, аматарамі вясковага абраду “Удol”. Я ўхапіўся за яго, па меры мажлівасці, стараўся рэстаўрыраваць.

Я часта наведваю сваю бабулю, якая жыве ў вёсцы Харошча Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці,і прысутнічаў на вяселлі свайго роднага дзядзькі. Там я пачуў сярод бабулек такую гутарку: “А Удод будзе ці не?” Спачатку падумаў , што гэта нейкі чалавек па мянушцы Удод. Аднак аказалася ўсё не так. Спытаў у сваёй бабулі Анастасіі Аляксееўны Кучар. Яна мне і расказала: “Перад вясселлем пяклі ў пятніцу каравайніцы (жанчыны, якія шчаслівыя ў шлюбе) каравай і птушку Удода. Калі прыязджаў у суботу малады за нявестаю, то перадзетыя жанчыны з гэтаю птушкаю ў руках стаялі на покуці і патрабавалі выкупу. Дружкі са сватам сыходзіліся на пэўнай суме грошай і птушку забіраў сват. Ён з птушкаю ў руках танцаваў у карагодзе маладых нежанатых дзецюкоў-дружкоў, потым птушку кідалі ў гурт. Лічылася, хто зловіць птушку, у таго хутка будзе сям’я і народзіцца шмат дзяцей. Пасля выкуплялі нявесту.”

Мяне вельмі зацікавіла, адкуль жа пайшла назва гэтага абрада, але бабуля адказала, што ў нашай вёсцы Харошча такая традыцыя праводзіць вясельны абрад “Удод” існуе спакон вякоў (яшчэ яе дзяды і прадзеды праводзілі). У даўнія часы вялікая сям’я - залог дабрабыту і багацця.

Чаму гэты абрад так называецца? Колькі ні быў у лесе, але ніколі такой птушкі не сустракаў. Вырашыў адшукаць матэрыял пра яе. Аказалася, што удод – гэта вельмі прыгожая птушка, але яго шмат лягчэй пачуць, чым убачыць, нягледзячы на яго яркую і заўважную афарбоўку. Назва птушкі непасрэдна звязана з яго гучнымі крыкамі “Упуп-уп-упуп”, якія птушка выдае серыямі. Гняздуецца у старых дуплаватых дрэвах, на гарышчах пакінутых пабудоў на ўскрайках палёў ці нават у земляных нора,у карэнні дрэў. Пёстрае светла-аранжавае пер’е і веерападобны чуб. Гэта “моднік” і “фарсун”- адна з самых яркіх птушак. Удода можна сустрэць у нас толькі на Палессі. Бабуля сказала, што на свае вочы птушку ніколі не бачыла, але крык чула. Значыць, паблізу гняздуецца. А яшчэ паведаміла, што ў народзе існуе такое павер’е: няма на вяселлі Удода – не будзе сям’я жыць у ладзе і згодзе. Бо жывуць удоды парамі, якія захоўваюць праз усё жыццё. Птушка ўдот-самец – старанны і клапатлівы гаспадар. Таму і продкі, назіраючы за прыродай, далі такую назву абраду, верачы ў вернасць, клапатлівасць і шчырасць гаспадара, бо ў добрага гаспадара і жонка – паненка.

Расказаўшы пра назву абрада, мая бабулька нават праслязілася, бо разам з дзедам пражыла шэсцьдзясят два гады, але, на жаль, дзядулі майго ўжо няма.

У бабулі я таксама пацікавіўся, як жа робяць выпечку для абрада? Аказваецца, густое цеста замешваецца на дражджах, малацэ, свойскіх яйках і масле. Пасля раскачваецца калачом, прадаўгаваты кавалачак завязваецца ў вузел, адзін канец кавалка распляскваюць, робячы хвосцік, а другі канец падымаюць угору – робяць дзюбку і грабенчык. Збакоў наразаюцца крылы. У вочы ўсаджваюць спічкі-серкі – і ў печ. Калі печыва гатова, упрыгожваюць пер'ем.

Вяселле – гэта адно са святаў, якое пакідае ў памяці маладых самыя яскравыя ўражанні на ўсё жыццё. Многія навукоўцы называюць вяселле "народнай операй" (Е.Раманаў), таму што тут увасобіліся самыя яскравыя і цікавыя абрады, якія спрыяюць дабрабыту і шчасцю маладых. Сёння стала вельмі модным ладзіць вяселле на стары беларускі лад: маладыя ў нацыянальным беларускім адзенні; ехаць на вянчанне не на лімузіне, а на запрэжанай калясніцы з бубенчыкам; каравай самапечаны, а не кулёны і гэтак далей. Бацькі, ладзячы вяселле для сваіх любых дзяцей, ніколі не скупяцца, жадаюць ім сямейнага шчасця, дабрабыту, доўгага веку ў шлюбе. Няхай жа спраўдзяцца іх надзеі! А маладым – добрага шляху ў сямейнае жыццё!

ФАЛЬКЛОРНАЯ СПАДЧЫНА

Навумчык Дзмітрый, Нушчык Анастасія
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Радзежская сярэдняя школа”
Маларыцкага раёна
Дацык Лідзія Пятроўна

Мэта: абуджэнне цікавасці да народнай творчасці, да фальклорнайкіраўнік навукова даследчай работы

Народная творчасць наогул ,
а беларуская народная творчасць
увасабку – гэта мова, якая хавае ў
сабе незлічоныя скарбы.Толькі трэба
ўмець гэтыя скарбы дастаць.

М. Гарэцкі

Гістарычны лёс Беларусі склаўся такім чынам, што ей на працягу многіх стагоддзяў прыйшлося неаднойчы зведаць як перыяды сапраўднай магутнасці, росквіту, своеасаблівыя “зорныя часіны” беларускай дзяржаўнасці і культуры, так і працяглыя перыяды ўсеагульнага заняпаду, штучнага падаўлення нацыянальнай самабытнасці беларусаў, адмоўлення іх багатай духоўна-культурнай спадчыны. Аднак і ў самых неспрыяльных, цяжкіх для развіцця варунках беларускі народ ўсё ж ніколі поўнасцю не страчваў свайго нацыянальнага аблічча, захоўваў свае самыя адметныя рысы і якасці, каб пазней, у лепшых абставінах, выявіць іх найбольш яскрава ў розных галінах жыццядзейнасці грамадства.

І вось цяпер наша Бацькаўшчына, згодна з законам гістарычнага развіцця, перажывае вельмі складаны этап свайго новага нацыянальна-культурнага адраджэння пасля доўгага перыяду своеасаблівага “нацыянальнага забыцця”. Зноў нашай краіне, як і ў 20-я гг.ХХст., прыходзіцца паступова пераадольваць надзвычай цяжкія вынікі ранейшай татальнай дэнацыяналізацыі, звяртацца ў пошуках шляхоў самазахавання да сваіх уласных вытокаў. Таму і не выпадкова, што ў апошнія гады, ва ўмовах так званага этнічнага рэнісансу, значна ўзрасла цікавасць многіх жыхароў нашай рэспублікі да гісторыі свайго народа, да роднай культуры і мовы. А дзеля таго, каб глыбей асэнсаваць гістарычны шлях Беларусі, больш грунтоўна пазнаць саміх сябе, неабходна ў першую чаргу зразумець і ўсебакова даследваць, вобразна

кажучы, народную душу, дух народа, яго адмысловы нацыянальны характар.

Народная спадчына сёння атрымлівае новае жыццё і ў нашай школе. Некалькі гадоў у школе працуе этнаграфічы гурток “Крынічка”. Задача гуртка – шырэй пазнаёміцца з даўнімі мясцовымі традыцыямі, песнямі, гульнямі, выхоўваць павагу і любоў да народнай спадчыны, мовы аднавяскоўцаў.

Менавіта высвятленню і ацэньванню гэтых няпростых праблем і прысвечана наша даследванне.

Асноўная частка

Неяк на занятках гуртка настаўніца праспявала нам песню “За туманом нычого ны выдно”. І расказала, што гэтую песню яна ведала з маленства. Бо раней у кожнай вёсцы маладыя дзяўчаты летнімі вечарамі, спацыруючы па вёсцы з аднаго канца ў другі і назад, спявалі на некалькі галасоў вельмі прыгожа.

Нас гэтая песня вельмі зацікавіла і мы вырашылі знайсці і запісаць народныя песні. Вучні пачалі прыносіць першыя запісы.

Прааналізаваўшы змест запісаных твораў, мы даведаліся, што песні бываюць працоўныя, абрадавыя, лірычныя. Вызначалі іх від. Пазнаёміліся з цягай чалавека да народнай песні. Наладжвалі сустрэчы з мясцовымі спявачкамі Вольгай Варфаламееўнай Дацык, Аленай Георгіеўнай Тыцык, Марыяй Іванаўнай Дзямчук, Марынай Андрэеўнай Дацык.

Восемдзесят пяць вёснаў сустрэла і правяла Вольга Варфаламееўна на зямлі роднай вёскі Радзеж. Так многа ведала жанчына песен, што вычарпаць іх было няпроста. Хіба можна вычарпаць крыніцу?..

Вольга Варфаламееўна расказвала, што прыйшлі да яе гэтыя песні пры працы і ў святочныя дні, калі дзяўчынкай хадзіла са сваімі бабулямі збіраць зёлкі, капаць бульбу, жаць жыта.

– Запамінай нашы песні, – казалі яны, – калі ты іх навучышся і будзеш спяваць, нам будзе лягчэй у зямлі ляжаць.

“Наступіла пара заклікаць на ўратаванне ад забыцця, ад беззваротнай страты неацэнныя скарбы вуснай паэзіі – сотні і тысячы народных паданняў, прыказак і прымавак, загадак, замоў і іншых жанраў фальклору. Вось ужо калі сапраўды трэба гэта рабіць сёння, бо заўтра можа быць позна” – пісаў Ніл Гілевіч. І мы задумаліся над яго словамі, бо, сапраўды, з кожным годам ў вёсцы застаецца ўсё менш і менш пажылых людзей *(дадатак1)*.

Вывучаючы творчасць Н.Гілевіча, звярнулі ўвагу на яго словы: “Трывожна і сумна, што рэдка ўжо ў натуральным бытаванні сустракаюцца калыханкі. Сучасная маладая маці ўсё часцей абыходзіцца без іх. Гэтым самым абкрадаецца маленькі чалавек, над калыскай якога не паўстае казачна - дзівосны паэтычны свет матчыных калыханак”. І мы рашылі запісаць мясцовы дзіцячы фальклор *(дадатак 2)*.Пасля запісу калыханак, мы даведаліся, што калыханка - гэта твор для дзяцей, з дапамогай якога супакойвалі малога, знаёмілі яго з навакольным светам, расказвалі пра хатніх жывёл, птушак, розных звяроў, іх прыгоды. Галоўнымі персанажамі калыханак з’яўляецца кот, куры, галубы. Яны запрашаюцца дапамагчы няньцы забаўляць дзіця.

Гульнёвая дзейнасць з’яўлялася вядучай для нашых прабабуль. Мы ўстанавілі, што гульні малі сваю ўстойлівую структуру: задачу, змест, правілы і гульнёвыя дзеянні. Важная роля гульні належала правілам, якія вызначалі, што і як, у якой паслядоўнасці павінна рабіць у гульні кожнае дзіця, рэгулююць узаемаадносіны дзяцей: выхоўваць у іх уменне стрымлівацца, кіраваць сваімі паводзінамі, гаварыць па чарзе, не перабіваючы адзін аднаго, не гаманіць. Неабходнасць прытрымлівацца правілаў ва ўмовах калектыўнай гульні прымушала кожнае дзіця суадносіць свае дзеянні з дзейнасцю таварышаў, садзейнічаць узнікненню агульных інтарэсаў, а таму з’яўляецца важнай умовай фарміравання станоўчых рыс паводзін.

Святы… Мы рэдка цяпер усміхаемся, рэдка радасць у хаты ўпускаем. Нам пакуль што старызной зацвілай пахнуць продкавы абрады.ьА яны,ьтыя магічныя дзеі-закліканні, нешта ж-такі значаць для спадкаемцаў агню жыццевага, нешта істотнае ў рошчыне сваёй трымаюць. Як расчытаць пісьмёны спрадвечныя? Мабыць, па радзімках словаў, рассыпаных ў песнях і паданнях, па рысах вышывання бабулінага, па ходзе Сонца ды Месяца ў небе недасяжным? Гойдаецца ў бязмежжым Космасе Зямля, рытму сусветнаму падпарадкаваная. Люляе ноч у зыбцы зорнай наступныя золкі, гушкаюцца над зімовай завеяй несціханыя мелодыі вясны. Абрадамі ды карагодамі ўслаўляе гэты вянок, з красак травеньскіх ды з віхураў студзенькіх звіты, гаспадарлівы сейбіт-чалавек. Бо хвалі памяці сусветнай дакаціліся і да нашага падманнага веку. Схамянуліся сучаснікі, апірышча духоўнае сталі шукаць ў замшэлай старызне. Ды каб жывая вада забруіла, трэба доўга жыватоўныя жылы шукаць. Каб радовішча знайсці, трэба разблытаць дарог здратованых вузлы. Трэба вясну цнатлівую ў сэрцах абудзіць.

Пачаліся пошукі. Мы адправіліся па хатах аднавяскоўцаў, каб запісаць, як жа адзначалі святы нашы продкі, якія абрады выконвалі. З успамінаў старэйшых людзей вёскі Салаўчук Фядосіі Нікіцічны, Дацык

Вольгі Варфаламееўны, Дацык Вольгі Мікалаеўны, Братчук Ганны Аляксандраўны мы даведаліся, па якіх прыметах людзі ўгадвалі якім будзе лета, зіма.

Запісалі як у нашай мясцовасці сустракалі вясну, святкавалі вербніцу, рыхтаваліся да посту, праводзілі Піліпаўскія вечары, Каляду.

Нам захацелася падзяліцца набытымі ведамі і знаходкамі з іншымі. Вырашылі правесці фальклорнае свята. Мы напісалі сцэнарый. На рэпетыцыях было весела: падабаўся гумар і выдумка. Мы даведаліся, што нашы продкі не толькі ўмелі працаваць, але і адпачываць. Школьнікі спявалі, расказвалі легенды, гулялі ў гульні, загадвалі загадкі *(дадатак 3)*.

У маленькай вёсачцы Ацяты жывуць Алена Георгіеўна Тыцык і Марыя Іванаўна Дзямчук. Людзі нялёгкага лёсу. Ваеннае дзяцінства, галодныя пасляваенныя гады не абышлі іх бокам. Зусім маленькімі дзяўчынкамі, яны вывучалі складаную навуку жыцця. Лёс прымусіў дзяўчат рана клапаціцца пра сябе. Кожная дзяўчына павінна была прыгатаваць сябе пасаг: наткаць палатна, вышыць ручнікі,настольнікі. Менавіта ў тыя часы і прыйшла любоў да гэтага занятку.

Калі глядзіш на посцілкі гэтых майстрых,нават не верыцца,што гэты цуд стварылі людзі.

Сваю працу жанчыны заўсёды пачынали словамі: “Господі, допоможы в чяс добры начяты, а шэ в ліпшы кончыты. Шоб пырымоты положыты, шоб всё хурушэ снувалося.”

Калі знімалі аснаваныя ніткі на з асноўніцы, на падмогу расцілалі хустку з галавы жанчыны-майстрыхі і клалі на яе аснову, пераступалі праз яе тры разы і гаварылі: “Шоб добра ткалося, ны рвалося, хурошэ звывалося”.

З сустрэч з майстрыхамі мы даведаліся, што ў нашай мясцовасці ткацтва з’яўлялася адным з асноўных спраў жанчын у асенне-веснавы перыяд. Падрыхтоўка да гэтага пачыналася яшчэ вясной, калі сеялі лён. Чым даўжэйшы быў лён, тым лепшай была кудзеля. Восенню лён замочвалі, трапалі, пралі. Самая лепшыя ніці выкарыстоўвалі для асновы будучага палатна *(дадатак 4)*.

Прадзіва памяці продкавай не перарываецца ў нашай школе і сёння, віецца на калаўраце дзён. Мы яшчэ кранаем звонкія ніты мінуўшчыны, яшчэ знаходзім у гушчары забыцця дарогу да пасагу княжага-народнага. І павядзем яе ад вясны праз мясцейка ды восень. Каб не прамінуць вехаў гісторычных, не згінуць у поцемках адцуранства.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Беларускі фальклор у школе. Аўт. уклад. І. І. Суцкоў, Н. І. Шрамова. Мн.: Беларусь, 2001.
2. Летнія святы: Аўт. уклад. А. Ю. Лозка – Мн.: Беларусь, 2001. (Бібліятэчка народных святаў, прысвяткаў)
3. Салавей Л. М. Пантэон Багоў у міфалогіі беларусаў. Спадчына. 1992. № 3 . с. 61 - 66.
4. Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя. -НІІ, БелСЭ, 1989.

Дадатак 1

Народныя песні

Ой я молода вышла замуж
Тэпір я знаю, шо быда.
Ой я молода вышла замуж
Тэпір я знаю, шо быда.

Ой замуж выйты
Трэба знаты
Наварыты, напычы,
Хату пудмэсты, дрова прынэсты,
Шэй ду коровы пудыйты.

Прыйшла дудому, дітонькы плачуть
Хто хоча есты, хто-спаты.
А муй мылэнькы, лыжыть п’янэнькі,
Шэй крычыть квасу прынысы.

Зайшла в комору, набрала квасу,
З нызкым поклоном пуднысла.
Тылько тоды була шчаслыва,
Як я у матюнкі жыла.

Ой, цвыла калына край окна…

Ой, цвыла калына край окна} 2 разы
Мала я мужа,} 2 разы
Мала я мужа пыяка.
А пыяк ны робыть тылько п’е,} 2 разы
Як прыйдэ додому,} 2 разы

Як прыйдэ додому жінку б’е.
Ны бый мэнэ мужу, ны карай} 2 разы
Покіну діты тобі малыі,} 2 разы
Сама поіду за Дунай.} 2 разы
Як мылая в лодку сядала,} 2 разы
Білым платочком,} 2 разы
Білым платочком махала.
Ох, вырныся, мыла, додому} 2 разы
Ны буду быты, буду любыты,} 2 разы
Бо трудно жыты самому.} 2 разы
Як вырнулась мыла додому,} 2 разы
Ложкі ны мыты, мыскы пубыты,} 2 разы
А діты плачуть: “Дэ маты?”.} 2 разы

Плакуча гітара
Із повіття колышуцця вэрбы,
Вытырэць в вырболозах заснув.
Дэ зайграла плакуча гітара,
Там дівчіна сустріла вэсну.
Ты пойідыш далэко-далэко,
Так далэко од мого сыла.
І ныколы мэнэ ны згадаеш,
Шо ў тэбэ кохана була.
Ой, ны плач, ны журыся, дівчыно,
Ой, ны плач, ны журыся, ны рыдай.
Чырыз рік як цвэстыма калына,
В тыхій вэчур мынэ дожыдай.
От пруйшов час тяжкого чыкання
І прыйшла довгожданна пора,
І дівчына прыйшла до калыны,
А мылого еі там ныма.
Ой ныма, ой ныма той ны будэ,
Знать такая дівоча судьба.
Будыш знаты, як хлопця кохаты
І як вірыты в ёго слова.

За туманом нычого ны выдно…
За туманом нычого ны выдно
Тылько выдно дуба зэлэного.
Пуд тым дубом крыныця стояла,
В туй крыныці дівка воду брала,

Воду брала, відырце спустыла,
А хто ж тое відырце дустанэ,
Той зо мною на рушнычок станэ.
Одузвався козак молодэнькый,
А я тобі відырце достану,
Той с тобою на рушнычок стану.

Цвэтэ тэрынь, цвэтэ тэрынь…
Цвэтэ тэрынь, цвэтэ тэрынь,
Лысте опадае.
Хто з любов'ю ны знаецця,
Той гора ны знае.
А я молода дівчына
Той гора спузнала,
Вычэройкі ны доіла,
Нычкі ны доспала.
А я сяду в край окэнця,
Той думу думаю.
Ешчэ очы ны дрымалы,
А вжэ всходыть сонцэ.
Хоч дрымайтэ, ны дрымайтэ,
Ны будэтэ спаты.
Дэсь поіхав муй мылэнькі
Другоі шукаты.
Цвытэ тэрынь, цвытэ тэрынь,
Цвіт той опадае.
Хто з любоў'ю ны знаецця,
Той гора ны знае.

Катя-пастушка
Это было давно, посла стадо овец
Белокурая Катя-пастушка.
И понравился ей покоритель сердец
Чернобровый красавец Андрюша.
Давай, Катя, давай
Переменим мы жизнь
Деревенскую на городскую.
Разодену тебя в бархот, шёлк и атлас
И куплю тебе шаль голубую.
Вот уже годик прошёл
А Андрея всё нет,

А сынок всё растёт-подрастает,
Где случайно Андрея встречает.
Здраствуй, милый Андрей,
Мужинёк дорогой,
Как давно я тебя не видала.
Посмотри на руках
Сын красавец растёт,
В честь тебя я Андреем назвала.
Отойди от меня, ненавижу тебя,
Даже слушать тебя не желаю.
А про сына того, что ты мне говоришь
Я за сына свайго не считаю.
Закипела вдруг кровь в груди молодой
Катя ножик Андрею вонзила.
За измену твою, за неверну любовь
Я за всё подлецу отомстила.
Не посёт больше овец в деревенском лугу
Деревенская Катя-пастушка,
И не нравится ей покоритель сердец
Чернобровой красавец Андрюшка.

Дэ б я була йіхала…
Дэ б я була йіхала,
Дэ б я була шла,
Я б сваёму батьковы
Кланялася.
Кланяюсь тобі тату,
Шо пускав мынэ гуляты
Бульш ны будэш, ны будэш.
Кланяюсь тобі тату,
Шо пускав мынэ гуляты
Бульш ны будэш, ны будэш.
Дэ б я була йіхала,
Дэ б я була шла,
Я б своій матэры
Кланялася.
Кланяюсь тобі мамо,
Шо будыла мынэ рано,
Бульш не будэш,
Ны будэш.
Шо будыла мынэ рано

Бульш не будэш,
Ны будэш.
Дэ б я була йіхала,
Дэ б я була шла,
Я сваёму братовы
Кланялася.
Кланяюсь тобі брату,
Шо водыв хлопців дохаты,
Бульш ны будэш, ны будэш.
Кланяюсь тобі брату,
Шо водыв хлопців дохаты,
Бульш ны будэш, ны будэш.
Дэ б я була йіхала,
Дэ б я була шла,
Я б своей сэстрі
Кланялася.
Кланяюсь тобі сэстра,
Шо навчіла косу плэсты,
Бульш ны будэш ны будэш.
Кланяюсь тобі сэстра,
Шо навчіла косу плэсты,
Бульш ны будэш ны будэш.
Дэ б я була йіхала,
Дэ б я була шла,
Я б своім варотам кланялася.
Кланяюсь вам варота,
Дэ стояла хлопців рота
Бульш не будэш, не будэш.
Кланяюсь вам варота,
Дэ стояла хлопців рота
Бульш не будэш,не будэш.
Дэ б я була йіхала,
Дэ б я була шла,
Я б своему пароговы кланялася.
Кланяюсь вам пурогы,
Дэ ступалы босы ногы
Бульш не будэш, не будэш.
Кланяюсь вам пурогы,
Дэ ступалы босы ногы
Бульш не булэш, не будэш.

Шчадроўкі

Васылёва маты…
Васылёва маты
Пушла ковататы
На новое літо
Роды Божэ жыто
Жыто, пшаныця
Горох, сочовыця
В клуні зыхітно
В пічцы як рожа
Господынька гожа
Ку-ку, ку-ку
Дайтэ пудпалка в руку
А за пудпалкам ковбасу
А то хату растрасу.

Шчадровочка

Шчадровочка шчадровала
Пуд укэньце пудбыгала.
Шо ты, тютка, наварыла,
Шо ты, тютко, напыкла?
То вынось ду укна.
Грудучку кашкы,
Цюручку кубаскы.
Ны шчупай, ны лупай
Пу цылэйкыму давай.
Пык-мык давай бабо кулядныk!

Дадатак 2

Дзіцячы фальклор

Забаўлянкі

(Люляюць на нагах)
Йіхалы, йіхалы в ліс за уріхамы.
(пагойдваюць у розныя бакі)
З купкы на купку.
З купкы на купку,
(падкідваюць высока на нагах)
В ямку – бух.
(апускаюць уніз)

З ямкы «ух»!

Калыханкі

Ходыть котык пу бальках
У чырвоных чоботках.
Усім сон раздае,
А дочыццы ны дае.

Пушов котык пуд мусток
Злувыв рыбку за хвусток.
Чы самому йісты, чы Марусьці нэсты?
Я і сам укушу і Марусьцы занэсу.
Поставлю люльку у садочку
На зылёныньком лужочку.
Будэ вітёр повываты
Будэ люлічку качаты.
Будуть пташкі прылетаты
Стануть сыну шчыбытаты.

Дражнілкі

Пушла Гандзя жыто жаты
І забула сэрпа взяты,
Сэрпа взяла, хліб забула
Вот такая Гандзя була.

Ішов Стыпан пумалу ступав,
От хаты ду хаты,
Навчывся брыхаты.
А в Марыны крыва спына,
А в Марыны крывы бук.
Я Марыну за чупрыну
І в крупыву пуволок.

Андрій ны дурій,
Ны пуры сорочкы.
Ты ны пряв, ты ны ткав
Ны твоі клубочкы.

Дадатак 3

Легенда

Гэта было ў нашай вёсцы. Была такая сям'я – бацька, маці, і дачка. Дачка нічога не ўмела рабіць, бо яе не прымушалі. Баяліся, каб не здарылася што дрэннае. Людзі празвалі яе Лянота. Ішоў час. Дзеўкі суседскія замуж выходзілі, дзяцей нараджалі, гаспадарку вялі, а яна ўсё ў хаце сядзела.

А тут у суседа жонка памерла. Прайшло некалькі тыдняў, і Лянота вырашыла выйсці за яго замуж. Але як выйсці? Яна ні прасці, ні ткаць, ні есці варыць не ўмела. Прыйшлося хітраваць. Аднойчы апоўначы Лянота ўзяла белы матэрыял, накрылася ім і пайшла пад акно да ўдаўца. Стукае ў акно і кажа:

- Бяры Ляноту замуж, бяры Ляноту замуж...

І так хадзіла цэлы гыдзень.

Няшчасны чалавск падумаў, што гэта нябесныя сілы яму так падказваюць. Цвёрда вырашыў: будзь што будзе... Ажанюся, хоць яна і не ўмее нічога рабіць. Значыць, доля такая.

Пайшоў будучы зядь да бацькоў Ляноты. Пагаварылі, дамовіліся. Так Лянота выйшла замуж за ўдаўца. І тут чалавек задумаўся, як жа яе навучыць працаваць?

І вось на першы дзень, як толькі ўзышло сонца, кажа індыку:

- Я пайду на работу, а ты навары есці, хату падмяці. А як гэтага не зробіш - прыйду і галаву адсяку.

А сам думае, зраз|умела яго Лянота ці не? Выйшаў на вуліцу і глядзіць, ці будзе ісці дым з коміна. Ён не з'явіўся. Значыць, не зразумела наказу маладая жонка.

Прыйшоў чалавек вечарам дадому і кажа індыку:

- Што ж, ты мяне не паслухаў, я табе адсяку галаву.

І адсек.

На другі дзень збіраецца чалавек на работу і кажа свінні:

- Я пайду на работу, а ты есці навары, хату падмяці, а не зробіш - прыйду і галаву адсяку.

Выйшаў ён на вуліцу і глядзіць, ці не ідзе дым з коміна. Не, не ідзе.

Значыць, зноў не зразумела яго Лянота. Давялося і свінні вечарам галаву адсячы:

На трэці дзень збіраецца гаспадар на работу і кажа Ляноце:

Ну што ж, зара! табе кажу - як не зварыш есці, не падмяцеш у хаце, то і табе галаву адсяку.

І пайшоў на вуліцу, зноў стаў глядзець, ці будзе дым з коміна ісці.

Аж бачыць – дым з коміна пайшоў. Узрадаваўся чалавек і пайшоў на поле. Прыйшоў, аж бачыць есці наварана, хата падмецена. Пашкадаваў жонку і кажа:

- Ты мяне зразумела. Значыць, будзем жыць добра.

Праз некалькі дзен завітала маці Ляноты. Захацелася паглядзець, як яны жывуць. Гаспадар і кажа:

- Ты тут з маці пагавары, а я пайду ў краму, пачастунак куплю. А сам выйшаў і слухае, што дачка ўсе робіць, а маці кажа:

- Ой, дочачка, не рабі нічога, няхай ён робіць, ён дужы.

Гаспадар падслухаў, чаму вучыць дачку маці, неўзабаве зайшоў у хату і кажа:

- Пачастунак я не купіў... Успомніў, што нам трэба зараз поле ўзараць. Дачка стала адмаляцца. Маўляў, да нас маці прыйшла ў госці. Маці ж кажа:

- У нас ёсць конь, вазьмі яго і паары поле.

Але зяць заўпарціўся:

- Не, будзем араць толькі зараз.

Тады маці дачцэ:

- І я табе дапамагу.

Узялі яны плуг і пайшлі на поле. Сталі араць, а гаспадар пугай каля жонкі махае сюды-туды, а цешчу справа налева лупіць і лупіць пугай.

Закончылі яны ворыва - маці бягом дадому пабегла, плачучы, што цяжка так дачцэ жыць. Расказала свайму мужу пра ўсё, а ён кажа:

- Заўтра я пайду, на ўласныя вочы пераканаюся.

Заходзіць бацыка, бачыць - есці наварана, хата падмецена, дачка вясёлая. Усё добра. А зяць кажа:

- Вы тут пагаварыце, а я пайду ў краму за пачастункам.

Падышоў да акна і слухае, пра што гавораць бацька з дачкою. Аж чуе, што бацька кажа:

- Бачыш, як добра, што ёсць што есці, што ў хаце чыста, цёпла.

Пачуў гэта зяць, прынёс пачастунак. Пасядзелі за сталом, пагаманілі. Пасля правёў ён бацьку дадому, абняў яго, пацалаваў.

З таго часу Лянота з удаўцом зажылі батата і шчасліва.

(З легендаў в. Радзеж).

Гісторыя “Чуго на людэй гуворять: “пувтуряіш як малпа”

Давно як паслы куров, овэчок бралы з субою шыты полотно. Баба полотно різола, різола – выкройкы робыла.

Тым часам пушлы коровы в шкоду. Положыла полотно і пушла завыртаты коров. А малпа сыділа на дэрывовы і бачыла шо робыла баба.

Малпа взяла ножныці і порізала полотно абыяк. Прыйшла баба, глянула на свое полотно і поняла шо тую шкоду зрабыла малпа.

Взяла баба ножныцы і як бы собі одрізуваты пальцы. Нарочно пушла одворочуваты коровы. А малпа побачыла, шо вона так собі робыла і собі поодрізала пальці.

Так баба отомстыла малпі за спорчанэ полотно.

Байка "Як поп наняв роботніка, шоб скосыв траву"

Був жадны поп. Хто ему скілько ны робыть, знойдэ прычыну, шоб ны заплатыты. Одін мужык кажэ:

- Я пуйду до тыбэ косыты траву. Давай за столько роботы заплатыш стыко то.

Поп согласывся. Роботнік найівся і пуйшов косыты. Зошов ранынько:

- О, вэльмы росно.

Ляг, заснув, прочнувся: вжэ дэнь.

- Не, вжэ млосно.

Пушов до попа той мужык. А поп пытае:

-Шо, скасыв траву?

- Скосыв. Дай мні шэ сала, - просыть мужык.

А поп жадный був і кажэ :

-Ны дам тобі сала.

А мужык кажэ:

- Хай той покос травою встанэ.

Заходыть поп сіно варушыты, дывыцця, шо тая трава ростэ як росла. Поп пудумаў: чуго я ны дав кусок сала, прыйдыцця шэ раз найматы чоловіка. Ітог такэй: байкы скупы два разы платыть

Вэрбныця

Куло хаты стуіть вырба, плут. На стыні вісять вырбовыі вынкы, на іх прывязаны ныткамы ленты. Куло стула сыдыть дід, якый робыть свысткы.

Входыть сусідка з кошыком, повным рушныкув, тканых радюшок. Сусідка рузвішуе радюшкы і рушныкы на плут і спывае:

Ой, там на лузі вырба русла,

Вырба русла, роспускалася,

На соныйку прыгравалася

Ду вэрбнуі ныдількы гутовалася.

Дід: Во як муя сусідочка спывае, як туй соловэйчык у садочку. На всі рукы майстрыха, а скуко за зыму рушныкув да радюшок наткала. І всі такыі хурошыі.

- Ганно! Ганно! Чы чуеш? Пуздравляю тэбэ з Вэрбною ныділяю.

Сусідка: Спасібо! І вас з Вэрбныцяю. Здоров’ ічка вам, шоб даў Бог другое

Вэрбныці дуждалы. Як жывэцця вам?

Дід: Ой, спасібочко тубі за доброе слово. Жывэм пумалэйку. Зыму пырызымовалы, думаю Вылыкдня дуждатыся.

Сусідка:А баба Маруся ваша дэ?

Дід: Ду цэрквы пушла. Хутко вжэ вырнутыся пувынна.

Сусідка: А вітэ шо робытэ? Сёння ж ныділька, а вітэ шось там стругаетэ?

Дід: На радость внукам свысткы з вырбы рублю.

Сусідка говорыть:

А з тэй вырбы зылёнынкуй нарубыв нам дід пу свысточковы

А вы, діточкы, вузьмітэ іх,

В свысточка посвішчытэ

Вэсну-красну запросітэ.

Дід: Ой, чуеш, курка сыкочэ. Мусыть яйцэ знысла. Трэба йты забраты, бо якаясь курка яйцэ п’е.

(Выходыть, сусідка дальш рузвішвуе рушныкы)

Дід выходыть з рэшытом яец і кажа:

– Пудывысь скулько мы яец назбыралы. Будэ чым Паску встрычаты, дітюм волочэбно даты.

Входыть баба:

Добры дэнь тубі, Ганночко. С празднічком тыбэ!

Сусідка: Доброго здоров’ічка, тётко і вас со святычком.

Баба: Во, муя дурожэнькая і Вэрбноі ныдількы дуждалыся. До Вылыкдня всёго ныділька ўсталася. Я сёння вырбу в цэркві ўсвятыла, добрыі слоўця юй гуворыла. І тубі, Ганночко, худы дам удну. Трэба, шоб у кожнуй хаті була така вэрба. Будыш курову выгоняты в полэ, то пугоныш еі вэрбочкою освячоною, шоб курова ны хвуріла, хто-нэбудь кепськым гоком ны глянув на твую куровку. А после тую вэрбочку заткны в кусяк двэрэй в хлыві, шоб твуя куровка дудому всіды вурочалася.

А зара муі хурошыі, прымайтэ густыныць уд вэрбы.

(Баба б’е Ганну вэрбою і прыговоруе):

Ны я б’ю,

Вырба б’е.

Уд року, ду року Вэрбою пу боку.

За тыдынь Вэлыкдэнь

Будь здорова як вырба

Бігай хутко як вуда.

(Баба дае вэрбы сусідцы. Остальныя ўддае дідовы):

- Занысы діду вэрбочкы ў хату і підклады за образ. (Дід бырэ вэрбу ў рукы і хочэ нысты іх у хатў)

Ганна: Ой, гляньтэ буснык лытыть.

Баба: І правда бусынь. Шэй лытячого пэршы раз пубачылы. Ой, моя доля, ныўжэ шэ буду лэтаты.

(Вбыгають діты і крычать):

Бусынь, бусынь, клёкотун,

Тягаў бабу за коўтун.

Тягаў, тягаў, вулочыв

І в булоті намучыв.

Баба: Діткы, худітэ сюды. Ны дражнітэ бусня. То розумна пташка. Вона знае, якая пугода будэ завтра. Tu,u,рэба тулько пупытаты:

Бусынь, бусынь тры кулоды

Шо завтра будэ:

Дождж чы пугода.

Колы крыллем махав то будэ дождж, а колы не - то пугода. А шчэ, кулы була малая то любыла іграты в "Клёка". А вітэ вміетэ іграты в ціту ігру?

Діты: Вміемо! Давайтэ погуляемо. Хто будэ клёком? Давайтэ полічымся. Кутылася торба 3 высокого горба

А в туй торбі

Хліб, пшаныця

3 кім ты хочыш подылыся.

Хто выйшов, той стаў "клёкам".

Діты: Буснык, буснык, дэ ты був?

Клёк: На булоті жаб лувыв.

Дэ злувыв, дэ згубыв,

У стальные злякалыся,

В булоті пухавалыся.

(Всі діты розбыгаюцця, ховаюцця за діда, бабу. "Клёк" всіх дуганяе. Куго зловыть выходять з ігры.

Діты гуляють.

Баба: А скуко прымет звязвалы з буснем. Колы буснів много на булоті ходыть, то літо мокрэ будэ, ныма буснів на булоті - сухэ.

Дід: Як буснык на хаті, то шчасте ў хаті.

Ганна: А я чула, як шчіро его пупросыты, то бусынь в хату дыте пры носыть.

Дід: отгадайтэ загадку:

Ходыть по булоті

Ножкы высоко пуды мае

Жабув шукае.

А хочытэ я вам рускажу легенду, удкуль бусні з’явылыся.

Дід: Ну то слухайтэ.

Ганна: Спасібо, діду, вам за інтіресны росказ. Діткы, муі хурошыі. Худітэ ду мэнэ, прымайтэ вэрбны гостынчык. Ны буйтэсь, вэрба муцно быты ны будэ:

Вырба б’е, ны я б’ю.
За тыдынь Вылыкдэнь.
Будьтэ здуровы
Як тая вэрба,
Будьтэ весёлы
Як тая вэсна.
Слухайтэ батьку,
Слухайтэ маты,
Ны забывайтэ
Всім пумогаты:
Старэйкым, малэйкым
Чы хворым, можа.
А вам всім ныхай Бог дупоможа!

Дід: Прыходьтэ ду нас на Вылыкдэнь за яйцямы волочэбнымы, за пырогамы пычонымы.

Баба: А сёння в нас бліны поснынькы.

(Баба угошчае всіх блінамы)

Казка Фылымон і Юхымка

Давно тое було. Був субі чуловік Фылымон і булла в його жунка. Звалы еі Юхымка. Такая лынывая була вуна. Шо б тулькы ны рубыла, всё ей ны хочыцця.

Настаў час жыто жаты. Всі бабы з сыла ранэнько в полэ пушлы, а Юхымка всё ныяк ны выбырыцця з хаты. Ну нарэшты і вуна в полэ пушла.

Фылымон зрубыв свую руботу І тожэ в полэ пушов снупы ставыты в бабкы.

Прыйшов вунь на полэ, бачыть жыто ны жято, снупув ныма, а його Юхымка в курчовы спыть. Россырдывся чуловік, пуйшов дудому, взяв nip’я і дёгтю. Вырнувся на полэ, тыхыйко скынув жунцы спудныцю з каптаном, обмазав тіло дёгтём, шэй nip'ем обсыпав. Забрав одэжу додому.

Прочнулась баба пуд вэчур, сонцэ вжэ заходыть, трэба дудому збыратыся. Хутіла обтрахнуты спудныцю, а еі нымашыка, тулько nip’е турчыть з усіх букув.

- Мусыть я ны Фылымонава жунка, пуйду в сыло спытаюсь.

Пудышла вуна ду свэі хаты, пустукала в укно:

- Фылымон, чы дома твуя Юхымка?

- Вдома, пудпалкі пычэ і пуказуе в бок пэчы. А там і правда стуіть баба в спудныці і каптані, в якому худыла жаты.

- Ну значыть я ны твуя жунка. І пушла зноўку в полэ. Пухудыла пу сылі, трэба дудому йты. Ідэ пу сыловы і шчытае: то хата Пытра, то Стыпана, то Іванова хата, а тут Фылымон жывэ. Пудышла ду окна і зноў стукае:

- Фылымон, чы в хаты твуя жунка?

- В хаты, а дэ ей буты. Цілы дэнь жала ны рузгыналася, а тыпір спаты лыгла.

Заглянула вуна в укно. І правда лыжыть удэжа на лавцы.

Пушла тая баба пу сылі, субакы з всёго сыла за ею быгуть, брэшуть. Шкода стало Фылымоновы Юхымку. Дугнав еі і кажэ:

- Худы дудом, хватыть людэй смышыты.

З тых пір Юхымка ны лынувалась і зажылы вуны дружно.

Дадатак 4



Нацыянальны касцюм

Беларуская хатка





Святы роднай вёскі










Вырабы з шарсці (радзюжкі)





Мясцовыя майстрыхі



Дзямчук Марыя Іванаўна і Тыцык Алена Георгіеўна

Сустрэча з мясцовай казачніцай

Братчук Ганна Аляксандраўна



Сустрэча з мясцовай спявачкай

Лацык Марыя Андрэеўна



ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР КАМЯНЕЧЧЫНЫ

Кандрацюк Кацярына
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г. Высокае”
Камянецкага раёна
Зайцава Алена Мікалаеўна
Краўчук Алена Мікалаеўна
кіраўнік навукова даследчай работы

спадчыны нашых продкаў, выхаванне патрыятычных адносін да сваёй малой радзімы.

Задачы:

- ✔ даць агульнае ўяўленне пра рэгіянальны дзіцячы фальклор, адлюстраванне ў фальклоры духоўнага і працоўнага жыцця народа;
- ✔ зацікавіць у збіранні і захаванні рэгіянальнага фальклору;
- ✔ спрыяць фарміраванню эстэтычнага густу на ўзорах народнага мастацтва.

Мы, з маёй сяброўкай Дар’ей Краўчук ужо 5 гадой з’яўляемся удзельнікамі ўзорнага клуба аматараў фальклору “Катрынка”. Для таго, каб не парушылася сувязь паміж пакаленнямі, мы займаемся вывучэннем і прапагандай рэгіянальнага фальклору: дыялектнай мовы, песень, танцаў, касцюма, народных звычаяў, вуснай народнай творчасці, традыцыйных рамесстваў.

Займаючыся засваеннем фальклорных твораў, узнаўляючы фальклорныя абрады, звычаі, мы ўзбагачаем свой слоўнікавы запас, пачынаем лепш адчуваць прыгажосць беларускай мовы і яе дыялектаў,

іх мілагучнасць. Будучаму пакаленню трэба ведаць не толькі літаратурную мову, але і жывую мову сваіх продкаў.

Мы жывем на тэрыторыі, дзе гістарычна склалася так, што менавіта тут адбылося змяшэнне розных культур: беларускай, польскай, украінскай і рускай. Змяшэнне культур надае самабытнасць і непаўторнасць мясцоваму дыялекту, касцюму, абрадам, песням, танцам. У нашым дыялекце можна пачуць словы з розных моў і ён больш падобны на ўкраінскую мову. Таму адной з асноўных задач ўзорнага клуба аматараў фальклору "Катрынка" з'яўляецца вывучэнне, захоўванне і распаўсюджанне мясцовага фальклору сярод дзяцей і моладзі.

Вывучэнне нашай спадчыны немагчыма без цеснай сувязі з носьбітамі народнай культуры. Гэта дае магчымасць папаўняць рэпертуар нашага клуба новым цікавым матэрыялам.

Адным з носьбітаў нашага клуба з'яўляецца бабуля маёй сяброўкі – Краўчук Раіса Дзмітрыеўна, якая расказала нам многа цікавага пра сваё дзяцінства. Нарадзілася яна ў 1950 годзе, пасля Вялікай Айчыннай вайны, у вёсцы Каралін Камянецкага раёна. У той час яшчэ не было тэлебачыння, камп'ютэраў і тэлефонаў – таму вясковыя дзеці забаўляліся як маглі. Яны гулялі ў розныя гульні, ведалі шмат песень, забаўлянак, лічылак, дражнілак, якім іх вучылі дарослыя з самага ранняга дзяцінства. Маці Раісы Дзмітрыеўны – Бялюк Вера Рыгораўна (1932 г.н.) стала для сваёй дачкі сапраўдным носьбітам народнай культуры. У рэпертуары нашага клуба ёсць многа песнь запісаных ад Веры Рыгораўны.

З песні-калыханкі, якую маці спявала свайму малюку, пачынаецца знаёмства дзівосным светам народнай песні. Калыханкі не толькі даюць багаты матэрыял для развіцця фантазіі маленькіх дзяцей, але і вучаць іх вобразна мысліць і гаварыць, спрыяюць узнікненню адчування рытму, музыкальнасці тэксту.

Як я даведалася з літаратуры: ***"Калыханкі*** – гэта песенькі, якія спявае маці для дзіцяці, каб яно заснула. Назва песні абумоўлена яе выкананнем: спяваецца ў час калыхання калыскі з дзіцём. Калыханкі не страцілі сваіх функцый і папулярнасці і ў наш час. Мэта калыханкі – супакоіць дзіця – дасягаецца ўсім яе зместам і манерай выканання: ласкава і пяшчотна заклікаецца дзіця спаць, спасылаючыся пры гэтым на жывёльных персанажаў – "памочнікаў" у хаце, здольных узяць на сябе ўсё ліха, каб дзіця былоспакойнае і здаровае. Самымі распаўсюджанымі персанажамі беларускіх калыханак з'яўляюцца кот, куры, пеўнік, галубы. Надзвычайная напеўнасць, пяшчотнасць у калыханках ствараецца паўтарэннем асобных слоў, гукаў, ужываннем

слоў з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі”. Калыханкі знаёмяць дзіця з навакольным светам, расказваюць пра хатніх жывёл, птушак, розных звяроў, іх прыгоды і ўчынкі.

Самымі вядомымі персанажамі рэгіянальных калыханак, як казала бабуля, з’яўляюцца “боцён” (бусел) і “котык” (дадатак 1).

Такім жа распаўсюджаным жанрам у дзіцячым фальклоры былі ***забаўлянкі***, ***пацешкі*** і ***гоцалкі*** (дадатак 2), якімі не толькі забаўляюць дзіця, каб яно не плакала, але і вучаць яго ў простых гульнях з пальчыкамі, ручкамі, ножкамі *(далей назвы и урыўкі твораў запісаны на мясцовым дыялекце.):*

Кую, кую ножку,
Поідэм в дорожку,
Дорожка крывэйка,
Кобылка слыпэйка,
Жэрэб’е рабое,
Поідэм обое.

Вёска Каралін, гэта тэрыторыя якая гранічыць з Рэспублікай Польша. Таму наступная гоцалка, якую нам расказала бабуля гучыць на польскай мове:

Танцёвалы два Міхалы,
Едэн дужы, другі малы,
Як тэн дужы почав кронжыць,
То тэн малы не змуг здонжыць.

Калі трэба было выбраць вядучага ў гульні або вызначыць чарговасць удзельнікаў, ужывалі лічылкі. Яны ўяўлялі сабой гумарыстычныя вершы, якія вымаўляліся або спяваліся:

Энтлічэк-пэнтлічэк, чырвоный столічэк,
На кего выпадне, тэн бэндзе вільчэк.

Уласна ***гульні*** займалі вялікае месца ў жыцці вясковых дзяцей. Яны былі асноўнай формай дзейнасці, зместам жыцця. Без гульні не мыслілася дзяцінства.Усе гульні былі калектыўныя, у іх гулялі гуртом: “Вовк і гусы”, “Пэрэпілка” (дажыначная гульня), “Сэчы капусту”, “Хованкы”, “Бэрок” (дадатак 3).

У час гутарак з намі бабуля расказала, што традыцыйныя народныя гульні, звязаныя з гаспадарчымі справамі, жыццёвымі адносінамі паміж людзьмі ў пэўныя перыяды, малі значэнне для выхавання адпаведных навыкаў і засваення нормаў паводзін у пэўных сітуацыях. Гульні садзейнічалі выхаванню такіх рысаў у характары чалавека, якія не губляюць каштоўнасці ў любы час. Скажам, усім вядомая простая гульня ў хованкі, мела вельмі сур’ёзную мэту – навучыць дзіця імгненна схавацца пры першай небяспецы, схавацца ад

драпежніка ці ворага. Гэта сведчыла пра ўмовы жыцця старажытных людзей, а ў сучасных дзяцей развівае назіральнасць, кемлівайць, хуткасць рэакцыі – якасці, заўсёды прыдатныя ў жыцці. Рухомыя фальклорныя гульні нарадзіліся ў натуральным асяроддзі, гулялі ў іх на свежым паветры.

Яшчэ Раіса Дзмітрыеўна расказала, што улетку адным з абавязкаў дзяцей быў выпас кароў, коз, авечак. Каб доўгі летні дзень прайшоў хутчэй, дзеці бавілі час за пляценнем шапак, пярсцёнкаў і лялек з балотнай травы – сітніку. Але найбольш падабалася ім гульня ў "Козы", якіх трэба было таксама наплясці і далучыць да жывога статку.

Як і дарослыя, вясковыя дзеці вельмі любілі спяваць.

Дзіцячыя песні (дадатак 4) з'яўляюцца разнастайнымі па сваёй тэматыцы: цікавы змест, персанажы якія адносяцца да жывёльнага свету, але паводзяць сябе як людзі і дзейнічаюць часам у звычайных сялянскіх бытавых умовах. Напрыклад: "Лэтілы дві птічкы".

Для дзіцячых песень характэрны гумар. Некаторыя з песень ўяўляюць сабой суцэльны дыялог. Прывядзем урывак з песні "Чорный баране":

А дэ ж ты ходыв, чорны баране?
А дэ ж ты ходыв, чорны баране?

На млыне, на млыне, мій сывы пане.
На млыне, на млыне, мій сывы пане.

Дзеці асабліва любілі спяваць невялічкія песенькі, лірычнага ці жартоўнага характару: ***прыпеўкі*** (дадатак 5).

Прыпеўка – адзін з жанраў, папулярнаспь якога не страцілася і ў наш час. Гэтаму садзейнічаюць простыя тэкст і матыў. У прыпеўках адлюстроўваюцца пачуцці лірычных герояў, узаемаадносіны людзей у грамадстве і ў сям'і, адносіны да працы, дабрыні і зла і інш.

У час зносін з Раісай Дзмітрыеўнай я зразумела, што фальклор суправаджаў чалавека з самага раджэння і быў не толькі забавай, але і дзейсным сродкам выхавання. Традыцыйны дзіцячы фальклор захоўвае сваё значэнне і зараз. Гэта аснова для развіцця сучаснай дзіцячай творчасці. Дзіцячы фальклор можа і павінен стаць дзейсным сродкам у выхаванні чалавека новай эпохі, спрыяць развіццю творчых здольнасцей, захаванню традыцый, заснаваных на агульначалавечых каштоўнасцях, якія ніколі не губляюць свайго значэння, бо абапіраюцца на мудрасць нашага народа, які, адчуваючы сябе часткай чалавецтва, цвёрда трымаецца сваіх каранёў, сваёй гісторыі, агульна-нацыянальных маральных і эстэтычных ідэалаў.

Падчас напісання гэтай работы я зразумела, што неабходна захоўваць і зберагаць багатую спадчыну нашых продкаў.

Дадатак 1

КОЛЫХАНКЫ
Ходыть боцён по капусты,
Носыть сон у білой хустцы.
Всім за грошы продае. А, (імя) , так дае.

Боцён, боцён, клёкотун,
Схопыв бабу за ковтун.
Тягав, тягав, волочыв і в помыях намочыв.

Шытю, шытю, шытюшок,
Пропалывся хвартушок.
Шо вам, хлопцы, до того, як спалыла, то свого.

А-а-а, коткы два, рыжый, бурый – оба два,
Одын – рыжы – ловыть мышы.
Другый – бурый – ловыть шчуры.

Котык, котык, зліз на плотык,
Побыв плечкы і жывотык.
О то тобі, котку, лыхо,
Шо ны сыдыш дома тыхо.

Пушов котык у лісок
По (імя дзіцяці) поясок.
Поясочка ны найшов
І до дому ны прышов.

Пушов котык под грушэчку,
Найшов собі подушэчку.
Ой підэмо одбэрэмо тай (імя дзіцяці) постэлэмо.
Будэ котык колыхаты, будэ (імя дзіцяці) добра спаты.

ЗАБАЎЛЯНКІ, ПАЦЕШКІ, ГОЦАЛК
Кую, кую ножку,
Пойідэм в дорожку.
Дорожка крывэнька,
Кобылка слыпэнька.
Ды наіхалы на пэнь,
Простоялы цілый дэнь.

Сорока-ворона кашку варыла,

На порозы холодыла,
На прыпычку дыліла:
Цітому дала,
Цітому дала,
Цітому дала,
Цітому дала,
А цітому – чах – головку оттяла.
А сама полытіла, полытіла,полытіла,
І на (імя дзіця) лобік сіла.

Там з тэй строны Віслы,
Компаласе врона.
Пан порутчык мыслял,
Жэ то его жона.
Подходзі он блізко,
Кланясе ей нізко,
А врона кшычы “Хура!
Цо то за бандура?”

Йіхав собі пан, пан,
На конічку сам, сам.
А за панэм хлоп, хлоп,
На конічку, гоп, гоп.
А за хлопэм жыд, жыд,
На конічку гыц, гыц.
А за жыдом жыдовэчкі,
Погубілі пакунэчкі. Бух!

ГУЛЬНІ

Воўк і гусы

Для гульні збіралася група дзяцей. Выбіралі аднаго, які быў “вовкам”. Выбіралася “гуска”, а рэшта дзяцей былі “гусі”. “Гуска” знаходзілася з аднаго боку пляцоўкі, “гусі” – з другога, а “вовк” – паміж імі. Паміж “гускай” і “гусямі” адбываўся дыялог:

Гуска: Сывы гусы!
Гусы: Га-га-га!
Гуска: Дэ ж булі вы?
Гусы: Га-га-га!
Гуска: Там за горою, за хуткою водою?
Гусы: Га-га-га!
Гуска: Там сыдыт вовчышчэ

Гусы: Га-га-га!
Гуска: З вэлыкым хвостышчэм
Гусы: Га-га-га!
Гуска: Прыды, прыды, вовчэ,
Бэры собі гуску якую хоч, якую трэба.

Пасля апошніх слоў “гусы” бягуць да “гускі”, а “вовк” стараецца іх злавіць. Гульня працягваецца да той пары, пакуль “вовк” не пераловіць ўсіх гусей. Апошні “гусь” становіцца “вовкам”.

Пэрэпілка

Дзеці становяцца ў круг, узяўшыся за рукі. Вядучая – “пэрэпілка” – становіцца ў цэнтр круга. Пачынаецца дыялог:

Дзеці: Встань, встань, пэрэпілка,
Встань, встань, молодэнька.
Пэрэпілка: А я встала пэрэпілка,
А я встала, молодэнька
Дзеці: Вмыйся, вмыйся, пэрэпілка,
Вмыйся, вмыйся, молодэнька.
Пэрэпілка: А я вмылась пэрэпілка,
А я вмылась молодэнька
Дзеці: Рошчэшыся, пэрэпілка
Рошчэшыся, молодэнька.
Пэрэпілка: Рошчэсалась пэрэпілка
Рошчэсалась молодэнька.
Дзеці: В нашэй пэрэпілочкі золотое пір’ечко
Куды захотіла, туды полэтіла.

Пасля гэтых слоў “пэрэпілка” спрабуе выбегчы з круга, а дзеці стараюцца яе не выпускаць.

ДЗІЦЯЧЫЯ ПЕСНІ

А дэ ж ты ходыв, чорны баране? (Песня-дыялог)

А дэ ж ты ходыв, чорны баране?
А дэ ж ты ходыв, чорны баране?

На млыне, на млыне, мій сывы пане.
На млыне, на млыне, мій сывы пане.

Шо ж ты там робыв, чорны баране?
Шо ж ты там робыв, чорны баране?

Млов муку, млов муку, мій сывы пане.
Млов муку, млов муку, мій сывы пане.

А шо ж ты ів там, чорны баране?
А шо ж ты ів там, чорны баране?

Клёсэчкы з мысэчкы, мій сывы пане.
Клёсэчкы з мысэчкы, мій сывы пане.

А дэ ж ты заснув, чорны баране?
А дэ ж ты заснув, чорны баране?

На сіны, на сіны, мій сывы пане.
На сіны, на сіны, мій сывы пане.

Як тэбэ былы, чорны баране?
Як тэбэ былы, чорны баране?

Луп-цуп-цуп, луп-цуп-цуп, мій сывы пане.
Луп-цуп-цуп, луп-цуп-цуп, мій сывы пане.

А як ты втэкав, чорны баране?
А як ты втэкав, чорны баране?

Гоп-са-са до ліса, мій сывы пане.
Гоп-са-са до ліса, мій сывы пане.

Лэтілы дві птічкы

Лэтілы дві птічкы, ростом нэвэлычкы,
Прыпеў:Чорнявая моя, чорнабровая моя.

Лэтілы, лэтілы – сілы, посыділы.
Прыпеў:Чорнявая моя, чорнабровая моя.

Всталы, постоялы, крыльмы помахалы.
Прыпеў:Чорнявая моя, чорнабровая моя.

Сталы росставатысь, сталы обніматысь.
Прыпеў:Чорнявая моя, чорнабровая моя.

Лэтілы дві птічкы ростом нэвелычкы
Прыпеў:Чорнявая моя, чорнабровая моя.

Як я була мала-мала
Як я була мала-мала (3 раза),
Мэнэ мама колыхала.

Як я стала подростаты (3 раза) –
Сталы хлопцы колыхаты.

Колыхалы мэнэ хлопцы (3 раза),
То в колысцы то в коробцы.

А я спаты нэ хотіла (3 раза),
Всё до хлопцюв рэготіла.

Як я була мала-мала (3 раза),
Мэнэ мама колыхала.

Прыпеўкі
Ой, шов я сэлом тэмнэнькэі ночы.
Сіла гусь на болоты, вытрышчыла очы.

А я крычу “гыля-гыля”, вона полытіла,
Сэб ны кій і ны поліно вона мэнэ з’іла.

Ой шов я сэлом,тай нэ оглядався
А за мною старый дід, з коцюбою гнався.

Ой шов я сэлом, шэй півны нэ пілы,
Ой чуть мэнэ молодого, собакі нэ з’ілы.

Я ходыв, я гуляв, бэз чобіт, бэз холяв,
Осталыся шаровары, шо дівчата даровалы.

Ой дывчатка моі, сыроіжычкі,
Посолыв бы я вас ныма дыжычкі.

Танцёвала полечку порвала фальбоночку,
Пуйду мамочку просыты шоб фальбоночку зашыты.

Чэрэвычкі моі, всі абцасы стэрла,
Шоб трандыкавок ны знала, я б давно помэрла.

Чэрэвычкі-нэвэлычкі мэні батько купыв,
Повісыла на кулочку, а москальухопыв.
Ой, Высокое моё, чым воно украшано –
Лыпамы, бэрозамы, дівчатамы як розамы.
Ой, Высокое моё, чым воно украшано –
Лыпамы, осынамы, хлопцамы красівымы.
До работонькы нэма вхотонькы,
А до танчыку, аж на пальчыку.
Ой, гармоні гралы, барабаны білы,
Хлопцы і дівчата вас тут вэсэлы.

СВЯТЫ І АБРАДЫ МАІХ ПРОДКАЎ

Грэчневая Наталля
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Сярэдняя школа № 4 г. Івацэвічы”
Пакало Ганна Іванаўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Гісторыя - гэта памяць чалавецтва. Гісторыя асобнай краіны складаецца з мноства малых гісторый - гісторый мясцовасці, горада і гісторый асобных людзей. Менавіта сёння, калі хутка мяняецца свет, калі на нашых вачах ствараецца новы свет, вельмі важна, каб чалавецтва не забывала пра мінулае.

Час праносіцца над зямлёй, пакідаючы сляды пераменаў і зменаў, выпрабоўвае людзей на трываласць і ўстойлівасць,правярае на здольнасць супрацьстаяць цяжкасцям і ўзрушэнням.

За кожнай гістарычнай падзеяй стаіць канкрэтны чалавек, яго жыццё, лёс. Многія людзі губляюцца і знікаюць у віхуры гістарычных падзей, а некаторыя застаюцца ў памяці людзей наступных пакаленняў.

Раней мы больш цікавіліся "вялікімі" асобамі, маштабнымі падзеямі або грамадскімі працэсамі. Цяпер у цэнтры ўвагі "малая, блізкая гісторыя" - гісторыя мясцовасцей, гісторыя сям'і, штодзённае жыццё людзей, іх праца, думкі і пачуцці. Менавіта веды гэтых падрабязнасцяў гісторыі дапамагае нам зразумець механізмы глабальных гістарычных і сацыяльных працэсаў.

Актуальнасць работы ў тым, што мы, абапіраючыся на аналіз, вывучэнне ўжо існуючых матэрыялаў, паспрабавалі паказаць самабытнасць беларускага народа, яго любоў да роднага краю.

Навуковая навізна работы складаецца ў тым, што намі прадстаўленая спроба сістэматызаваць матэрыял, вывучыць публіцыстычныя артыкулы, успаміны.

Мэта работы: даследаванне дакументаў, фотаздымкаў, традыцый маёй малай радзімы- вёскі Аброва.

Задачы работы:

- вывучыць фальклор, народныя святы і абрады роднай вёскі;
- аднавіць гістарычную сувязь пакалення 50-60 гадоў XX стагоддзя і жыхароў в. Аброва Івацэвіцкага раёна пачатку XXI стагоддзя;
- апісаць народныя традыцыі, вытокі іх фарміравання на аснове ўспамінаў.

Пры напісанні работы мы звярталіся да арыгінальных крыніц, шукалі і адкрывалі новыя веды па ўспамінах, у хатніх архівах, сямейных фотаздымках, гутарылі з жывымі сведкамі.

Выбар дадзенай тэмы прадыктаваны душэўным рухам, у нашай сям'і склаліся глыбока-паважлівыя адносіны да нашых продкаў.
Мне захацелася даведацца аб традыцыях як мага больш, я стала адчуваць сябе часткай моцнай і дружнай сям’і.

Дадзены матэрыял можа служыць крыніцай інфармацыі для тых, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю, можа быць выкарыстаны пры правядзенні пазакласных мерапрыемстваў, краязнаўчых гурткоў.

Раздзел І. “ Мая маленькая радзіма— вёска Аброва”

Шчаслівы той, хто вырас у родным краі, увабраў сваёй душою чысціню яго крыніц, пах кветак і зямлі і неба вышыню. Радзіма ў чалавека адна, адвечная, непаўторная. Мая маленькая радзіма— вёска Аброва. Гэта той дарагі сэрцу куточак, які будзе заўсёды ў маім сэрцы разам з вяскоўцамі, іх лёсамі, іх культурай і гісторыяй. Ёсць нешта незвычайна прыгожае і прывабнае ў маёй вёсцы.

Вяселле ў Аброве

Сватанне (дамовіны) і заручыны

Першы этап вяселля— сватанне, ці дамовіны. Бацька і маці хлопца ішлі да бацькоў дзяўчыны і дамаўляліся, калі прыйсці ў сваты, г. зн. “захапіць” дзяўчыну, колькі чалавек прывесці ў сваты.

Другі этап вяселля— заручыны (сватаўство, ці запоіны). Заручыны– перадвясельны абрад, на якім сустракаліся род жаніха і род нявесты, каб даць сваю згоду на шлюб і абмеркаваць пытанні, звязаныя з правядзеннем вяселля.

Як і сватанне (дамовіны), заручыны праводзіліся ў хаце дзяўчыны. Да дзяўчыны ішлі сваты: жаніх, яго сябар, бацька, маці, хросны бацька, хросная маці, дзядзькі, цёткі. Усе святочна апранутыя. Ідучы ў сваты, з сабою бралі хлеб і гарэлку.

У гэты час дзяўчына апранала сваё святочнае адзенне, завязвала вышыты фартушок, на грудзі завязвала бант (гэта азначала,што да яе прыйшлі сваты), у
косы ўплятала доўгія лентачкі (“коснікі”) і з сяброўкаю ішла да сваёй радні
запрашаць на запоіны.

Калі дзяўчына ішла па вуліцы, то павінна была ўсім, хто знаходзіўся на вуліцы, а таксама сваякам, пакланіцца тры разы і з усімі

пацалавацца . І гаварыла ім: “Дэнь добры вам! Просыў батько, просыла маці, коб прышлі на запоіны. Просю і я, коб прышлі на запоіны”. Ісці запрашаць на запоіны і на каравай дзяўчына павінна была па ходу сонца.

Калі дзяўчына вернецца дадому, прыйдзе яе радня, тады садзіліся за стол: елі, спявалі, дамаўляліся аб тым, калі будзе вяселле, які пасаг павінны даць бацькі дзяўчыне.

Каравай

На каравай запрашаліся толькі жанчыны, музыкант і хросны бацька. Хросны бацька выконваў ролю старасты— сачыў, каб усе елі за сталом, потым танцавалі. На каравай жанчыны прыходзілі святочна апранутымі і не з пустымі рукамі. Неслі з сабой нявесце хто вядро жыта, хто хлеб, хто сала. Пасля таго як каравай гатовы, каравайніцы разыходзіліся, і кожнай з іх гаспадыня давала “шышку”— невялічкі каравай.

Звычайна ў каравайніцы выбіралася пяць жанчын. Абавязкова замужніх, з якіх адна жанчын, якая нядаўна ўступіла ў шлюб. Гэта рабілася для таго, каб захоўвалася пераемнасць, бо гэтай жанчыне перадаюцца сакрэты пячэння караваю. На працягу ўсяго абраду ні жаніху, ні нявесце нельга было нават заходзіць у дом.

Старшай каравайніцай была звычайна хросная маці. Калі яна была ўдавой, пакіданкай ці ў яе быў вельмі цяжкі лёс, то тады за старшую каравайніцу бралі другую жанчыну. Калі цеста падыдзе, мясіць яго на стале пачынала таксама старшая каравайніца, а малодшыя каравайніцы рабілі шышкі і ўпрыгожвалі імі каравай.

Акрамя шышак, каравай упрыгожвалі месяцамі і сонейкам, сфармаванымі з цеста. Іх на караваі размяшчалі разам. Месяц сімвалізаваў жаніха, а сонейка— нявесту. Калі каравай ставілі ў печ, то абавязкова наказвалі шчаслівай долі маладой: “ Шчо молодыя задумалі, коб збулосо. А ў полі жыто трубою вілосо”. Пакуль каравай выпякаўся, каравайніцы час ад часу спявалі, звяртаючыся да караваю як да жывой істоты: “ Росты, короваю, росты, короваю, вышэй таго гаю, вышэй тое печы, коб було чэтыром легты, коб було чэтыром легты, коровай стэрэгчы”.

Калі каравай спячэцца, яго пачыналі ўпрыгожваць. Упрыгожвалі яго незамужнія дзяўчаты. Яны рабілі з каляровай паперы кветкі, навязвалі іх на вішнёвыя дубчакі. Калі ж каравай пяклі ў жаніха, то кветкі навязвалі на дубчыкі з грушы. Дзяўчына павінна быць такой жа пладавітай, як вішня, а хлопец– такім моцным, як груша. Хлопец падыходзіць да стала, старэйшыя каравайніцы ставяць каравай на галаву

хлопцу. Ён паварочваецца тры разы па сонцы і ідзе з хаты. За ім, спяваючы, ідуць каравайніцы…

Благаславенне



Вяселле адначасова пачыналася ў жаніха і нявесты і называлася “благаславенне”. Гэта азначала, што ўсе родныя, сваякі, суседзі, сябры благаслаўляюць маладых на сумеснае жыццё.

У царкву маладыя ехалі паасобку. Пасля вянчання муж прывозіў жонку да яе бацькоў, а сам вяртаўся дадому па сватоў. Пакуль мужа не было, нявесту

Жыхары вёскі сустракаюць маладых

дарылі.Гасцей жаніха сабіралі за стол. Калі чарка абыдзе стол тры разы, бацька з хлебам у руках, маці, хросная маці з абразам і ручніком тры разы па ходу сонца абыходзілі галоўны стол. Потым малады, сваты і дружкі адпраўляліся да маладой.

У нявесты ў гэты час госці таксама гулялі. Нявеста за сталом сядзела на падушцы, каб яе сямейнае жыццё было “мяккае”. Калі прыходзілі сваты, то яны заставаліся на вуліцы перад парогам, а старэйшая сваха разам з дзвюма малодшымі ўваходзіла ў хату, абсыпала маладую аўсом або ячменнем і хмелем тры разы і паварочвалася па ходу сонца.

Свахам навязвалі ручнікі, і тыя выходзілі на вуліцу. Пакуль у хаце знаходзіліся свахі, жаніх і яго радня стаяць на вуліцы. Радня спявае песні: “Ой, сватэ, сватэ, да пусты до хаты, бо з вялікой дарогі, да й

помэрзлі ногі, бо короткі світкі, да й помэрзлі літкі, бокай твое хаткі, да й помэрзлі пьяткі”…

Калі свахі выходзілі з хаты, то ў хату заходзілі тры дружкі і чашнік і выкуплялі сабе месцы.

Пасля гэтага маці нявесты выходзіць сустракаць будучага зяця. Яна апранае вывернуты на левы бок кажух, каб “злякаты” нячыстую сілу ад месца сустрэчы маладых, прысутнасць якой на адкрытай прасторы ў двары была найбольш верагодна. На века з дзяжы, засланае ручніком, яна кладзе бондачку хлеба. Ставіць бутэльку гарэлкі і “румку” і выходзіць на парог. Потым гаворыць:

“Дэнь добры, зятёк! Як я тэбэ ны знала, То й буду зятем ны звала. Тэпэр буду знаты, То й буду зятем зваты”. Зяць адказваў: “ Дэнь добры, маты! Як я вас ны знаў, То й матэрай ны зваў. Тэпэр буду знаты, То й буду матэрою зваты”.

Пасля гэтага маці ўсіх запрашае ў хату. Усе, хто знаходзіцца за першым сталом: жаніх, нявеста, дружкі, – абходзяць стол тры разы. Пасля кожнага абыходу старшы дружка кажа: “ Де гэтое молодое бацько, маты?

Чы вэліть благословіть, молодых на посаг посадыты? “ Бацька, маці, усе госці адказваюць: “ Бог благословіть!”

Маладыя сядзяць на лаве, на якую пакладзена доўгая падушка. Гэта азначала пачатак сумеснага жыцця– цяпер усё ў іх адно на дваіх.

Калі падыдзе час ісці ці ехаць у царкву, то бацька з хлебам у руках, хросная маці з абразам і ручніком, жаніх, нявеста, дружкі,— усе, хто сядзіць за першым сталом, абыходзяць гэты, галоўны, стол тры разы па ходу сонца. Потым выходзяць на вуліцу.

Калі едуць у царкву, то пасля таго як усе сядуць у вазы, бацька з поўным вядром вады абыходзіць павозкі тройчы па ходу сонца і вылівае ваду пад задняе кола апошняй павозкі. Першым едзе жаніх, з ім на падводзе сядзяць яго хросны бацька і маці, старшы дружок, сябры. На другой падводзе сядзіць нявеста, з ёю едуць яе хросныя бацька і маці, старшая дружка, сяброўкі.

Вянчанне

У Божым храме жаніх і нявеста даюць згоду на сямейнае жыццё і клятву ў непарушнасці вернасці. Калі ў царкве праходзіць вянчанне, усе назіраюць, як гараць свечкі, што ў руках у маладых. Калі свечкі гараць роўна, ціха,не “ трашчаць”, то і жыццё ў будучай сям’і не ўсё будзе ціхім і спакойным. Калі ж свечкі “трашчаць”, з іх капае воск, то ў гэтай сям’і не ўсё будзе гладка: будзе многа спрэчак, слёз.

Калі свечкі гараць жарка, то маладыя будуць жыць добра. Калі ж свечка ў каго-небудзь з маладых патухне, то ім у пары не дажыць да старасці, а яго сужаны ці сужаная заўдавее. Калі бацюшка вядзе маладых па царкве, незамужнія дзяўчаты стараліся як мага далей адсунуць нагамі ручнік, які ляжаў пад нагамі маладых, для таго каб таксама хутка выйсці замуж.

Пры ўваходзе ў царкву і выхадзе з яе жаніх уносіў і выносіў маладую на руках, стараючыся не наступіць на царкоўны парог, каб пазбегнуць сямейных сварак. Дождж у дзень вянчання азначаў, што маладыя будуць жыць багата.

Вяселле

Пасля вянчання маладыя ехалі разам на першай павозцы, з імі побач сядзелі хросныя бацькі і старэйшыя дружкі, ехалі ў хату да маладой, садзіліся за сталы. Калі чарка абыдзе стол тры разы, пачыналася дарэнне маладой.

У хату хросныя бацькі ўносяць, увесь час кружачыся па ходу сонца, два караваі: маладога і маладой, а свахі ўзхваляюць каравай і нявесту.



Вяселле Ганны і Андрэя Калтуневічаў (в. Аброва)

Пасля адбываўся абмен бондачкамі (хлебам): маці і старшая сваха мянялі бондачкі маладых. Гэта азначала, што бацькі абменьваюцца дзецьмі: акрамя дачкі, ёсць зяць; акрамя сына, ёсць нявестка.

Хросны бацька выклікаў радню нявесты па старшынству роду на падарунак. Частку караваю аддавалі маладым.

Пасля дарэння хлопец забірае жонку і вядзе яе дадому. Вяселле ў гэты час спявае: “Ішы цыбуленькі ны ела, а ўжэ горка слёзонька побегла”…

У час дарогі дадому да маладога іх суправаджаюць з боку маладой тры дружкі, хросная маці і “кубэлнык”. Задача “кубэлныка” – пільнаваць маладую і яе прыданае.”Кубэлнык” сядзіць на возе на кубле. Пасаг маладой у асноўным быў такі: адзенне маладой, тканае палатно, “наволокі”, радюшкі, шырокая падушка, ніжняя бялізна. Жыўнасць: цялушку ці авечку, курэй – забіралі пасля вяселля.

Калі прыйдуць да жаніха, там на парозе іх сустракала маці маладога з хлебам і гарэлкай.

Калі нявестка ўвойдзе ў хату, яе саджалі на пасад– на дзяжу, накрытую паверх века кажухом, вывернутым на левы бок. Маладую бралі за руку і, абвёўшы вакол дзяжы, прасілі: “Благословетэ, батько і маты, Лену на посад сажаты” .

Бацькі адказвалі: “ Бог благословіть, а батько і маты вэліть” .

Калі маладая сядзе, то гонар бацькам. Калі ж яна не садзілася, то бацькам было сорамна. Калі ж яна была ўжо не цнатлівая, аднак садзілася на века, значыць у гэтай хаце не будзе ўдавацца хлеб.

Абрад дарэння праходзіў так, як і нявесты. Маладая давала падарункі родным мужа: бацьку, маці, братам, сёстрам. І жонкам, і мужыкам. Потым трэба было маладой прынесці вады, каб госці яе мужа напіліся. Дзеці ў гэты час стараліся схаваць клюку. Маладая шукае клюку. Калі не знойдзе, то частуе дзяцей цукеркамі, пячэннем,і тыя прыносяць і аддаюць гэту клюку. Пад канец вяселля дзялілі каравай маладога і частавалі ім гасцей. Пасля гэтага свякроў з галавы нявесты здымала вэлюм, а ёй надзявала чапец і завязвала хустку, што азначала развітанне з дзявоцтвам і пачатак “бабскага” жыцця.

Звычай “ Выкуп сыру”

У вёсцы існаваў звычай “ выкуп сыру” , які сведчыў пра дастатак і шчодрасць блізкіх сваякоў і родзічаў маладога і маладой. Выкупляць, ці адбіраць, сыр прыходзілі людзі з вёскі ў хату і да маладой, і да маладога. Жанчыны спяваюць:

–Знаты, знаты,сваху, знаты,

Шо з багатое хаты:
Сырамі обклаласа,
Пірогамі подпэрласа.
Свахі адказвалі:
– У мэнэ корова сухая,
У мэнэ дойныца пустая.
Жанчыны зноў спяваюць
–У тэбэ корова чорная,
У тэбэ дойныца поўная.



Грэчная Алена, мая прапрабабка з сяброўкай (1950г).

Часам спрэчка- песня працягвалася, часам, калі сыр не аддавалі, то ў песнях даходзіла да знявагі. Жанчыны забіралі сыр і ішлі да каго-небудзь з іх дадому. Там ужо пілі за здароўе маладых, з'ядалі сыр. У бутэльку з-пад гарэлкі насыпалі зерне, устаўлялі туды кветку, навязвалі на бутэльку стужачку і аддавалі свахам. Так яны жадалі маладой сям'і дабрабыту і добрых ураджаяў на іх полі,здаровых і прыгожых дзяцей.

Заключэнне

Менавіта сёння, калі хутка мяняецца свет, калі на нашых вачах ствараецца новы свет, вельмі важна, каб чалавецтва не забывала пра мінулае.

Я вельмі ганаруся сваёй маленькай Радзімай. Як прыемна было трымаць у руках старыя фотаздымкі з сямейнага альбома, на якіх адлюстраваны мае сваякі, нават прапрадзеды і прабабкі. Гэта дзякуючы ім, я атрымала самае дарагое, што ёсць у чалавека - жыццё.

Калі чалавек нават не здзейсніў ніякіх адкрыццяў, проста годна пражыў сваё жыццё, ён заслугоўвае таго, каб пра яго памяталі яго дзеці, унукі і праўнукі.

Так, мая вёска, багатая на традыцыі, на добрых, шчырых, смелых людзей. І так хочацца, каб не разгубіла ты сваёй гісторыі, захавала ў памяці людской звесткі пра мінуўшчыну, каб былі абароўцы не беспамятныя, а ганарыліся сваёй багатай і даўняй гісторыяй.

Я буду вельмі задаволена, калі хто-небудзь пасля прачытання маёй работы захопіцца вывучэннем гісторыі роднага краю.

Літаратура

1. Палейка А.А. Гісторыя Беларусі – Мінск: Народная асвета, 2011. – 151 с.
2. Газета “Івацэвіцкі веснік” №36/11 мая 2012 года
3. Гарады і вёскі Беларусі: энцыклапедыя. Том 3, кніга 1. Брэсцкая вобласць – Мінск:БелЭн, 2006. – 528 с
4. Ліцьвінка Васіль. Святы і абрады беларусаў – Мінск: Беларусь, 1998.–190 с.
5. Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных – Мінск:Вышэйшая школа, 1997. – 415 с.

СПЕВЫ



ПЕСНЯ – ДУША НАРОДА



Бяльчук Валерыя
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Хаціслаўская
сярэдняя школа”
Маларыцкага раёна
Бяльчук Алена Аляксееўна
кіраўнік навукова даследчай работы

МЭТА: дасканала пазнаёміцца з народнай песняй вёскі Хаціслаў.

ЗАДАЧЫ:

прааналізаваць , якія карані яна мае і які ўплыў аказвае на чалавека;

пераканацца самой і пераканаць другіх у тым, што народная песня павінна жыць, таму што гэта найбагацейшы скарб народа.



Мясціна ёсць на Беларусі,
Якой заўседы ганаруся –
Куточкам тым, дзе нарадзіўся,
Дзе падрастаў і дзе вучыўся,
Дзе плакаў я і весяліўся…
Аб ім да гэтуль не забыўся.
Пад ясенямі ля дарогі –
Хаціны роднае парогі,
Што прымасцілася ля краю…
Яе заўсёды ўспамінаю.
І бачу маці каля хаты,
Калі ў нядзелю ці ў святы
Ў кашулі белай саматканай,
Узорам простым вышыванай,
На лаўцы сядзе ў задуменні,
Паклаўшы рукі на калені.
А думаць ёй пра што – хапала…
Для адпачынку часу мала.
Штодзённа – клопаты, турботы
І незлічоныя работы…
Ды покуль кроў цякла ў жылах,
Заўсёды з песняю дружыла.
А песень ведала багата –
Звінела імі наша хата!
Хвала ж усім, хто іх складае,
І тым, хто іх не забывае!

Гэтыя радкі я прачытала ў кнізе “Спадчына маёй маці” У. Зянько. Аўтар піша аб сваёй маці, якая ведала безліч народных песень: “ Ды я табе цэлы мяшок наспяваю”. Ад яе аўтар запісаў больш 280 песень, выконваючы абявязковую ўмову маці: “І запісвай так, як іх у нас спявалі”. Уладзімір Зянько адзін з тых, хто зерне за зернем збіраюць фальклорную спадчыну, каб яна захавалася і прадаўжала сваё жыццё, не пераставала захапляць людзей, выхоўвала і суцяшала. Само па сабе ўзнікла пытанне: “ А колькі б я змагла запісаць песень ад сваёй бабулі?”

Спяваць я вельмі люблю, прычым менавіта народныя песні. Адкуль я іх ведаю? Што ад бабулі з дзедам пачула, што ад маці, сястры, якія з’яўляюцца ўдзельнікамі ўзорнага клуба аматараў фальклора“ Вясковая табала”, вядомага не толькі ў нашым раёне, але і далёка за яго межамі.

Аднойчы, прыйшоўшы з вяселля, бабуля журылася, што не пачула за дзень ніводнай народнай песні. Спявалі музыканты толькі нешта

сучаснае і вельмі рэдка цяпер зайграюць “Падэспань” ці “Ночку”, калі ўвогуле зайграюць.

Так пачалася мая праца па вывучэнню народнай песеннай спадчыны маёй маленькай радзімы, мэтай якой я ставіла больш дасканала пазнаёміцца з народнай песняй, прааналізаваць, якія карані яна мае і які ўплыў аказвае на чалавека, пераканацца самой і пераканаць другіх у тым, што народная песня павінна жыць, таму што гэта найбагацейшы скарб народа.

Вытокі і роля народнай песні

Народная песня прыйшла да нас з глыбокай старажытнасці. На працягу сваёй доўгай гісторыі яна служыла чалавеку, адлюстроўвала думы і імкненні народа, у той ці іншай ступені яго нацыянальны характар, тэмперамент. Песняй суправаджаліся ўсе бакі народнага жыцця – праца, святы, гульні, звычаі і абрады, вяселлі, радзіны. Яна падтрымлівае чалавека ў цяжкія хвіліны, дапамагае ўзнаўляць мінулае. У народзе існуе прымаўка: “Плакаў я, плакаў – усё Бог аднакаў, стаў я спяваць – стаў Бог памагаць”. Наш продак кожны значны кавалак свайго жыцця звяраў па песні, абапіраўся на яе, давяраў ёй. А хто больш спяваў? Вядома ж жанчыны – жанкі, дзяўчаты, бабулі, чые рукі вечна былі заняты працай, а думкі луналі высока, сэрцы поўніліся марамі. У адных песнях шмат хараства і ласкі да ўсяго жывога, у другіх – смутак, боль, што нешта не так склалася ў жыцці, а трэція – увогуле асаблівыя, бо яны – важная частка абрадаў, якія павінны ўплываць на сілы зямлі і неба, каб тыя давалі чалавеку дабрабыт, здароўе, шчасце. Народная песня – вынік калектыўнай творчасці. Працэс стварэння многіх песень ішоў стагоддзямі. Многія пакаленні, якія захоўвалі ў сваёй памяці той ці іншы песенны твор, атрымаўшы яго ад папярэдняга пакалення, перадалі наступнаму ўжо ў сваей “рэдакцыі”, з нейкімі зменамі. У суседніх весках Хаціслаў, Мельнікі адна і тая ж песня “Ой, чыя то ныўка, чыі то покосы” гучыць па- рознаму. У мелодыі гэта не так адчуваецца, а вось у словах яна ёсць. І ў гэтым няма нічога дзіўнага. Народная песня – працэс пастаянна жывы і дзейсны. Я зразумела, што стварэнне народнай песні ва ўсе часы было абумоўлена пэўнымі жыццевымі абставнамі, таму нельга скласці дакладнае ўяўленне аб яе сэнсавым змесце, калі не ведаць прызначэння песні.

Народная манера спеваў

Народную песню можна пачуць па радыё, на тэлеэкране ў розных перадачах. На што звярнула ўвагу? Шмат іншым разам нейкай неапраўданай весялосці, моцнага гуку, крыку, танцаў, скокаў у час выканання народнай песні. Ці заўседы яны патрэбны? Мяне зацікавіла спецыфіка народных спеваў. Слухаючы, як спявае гурт “Вясковая

табала”, зрабіла вывад, што ёсць спевы з “пералівамі” і з “падводкамі”. Паслухайце, як часам спяваюць людзі, якія выпадкова апынуліся ў гурце недзе на свяце ці вяселлі. Загучала песня, і кожны са спевакоў выконвае пэўную функцыю. Той спявак, які заводзіць песню, называецца “запявалам”, тыя, што вядуцьніжні голас, - “басамі”, верхні – “падводкай “. У народзе заўседы з павагай адносіліся да тых, хто добра спяваў, прыслухоўваліся, як яны “цягнуць” песню.

Аднак вельмі важна, каб быў моцны і ніжні голас, які ўтварае фундамент для “падгалоска” і ў якім гучыць заўседы асноўная мелодыя песні. У нас, у Хаціславе, ды і ўвогуле на Палессі з “падводкай “ звычайна выконваюцца лірычныя, а таксама бяседныя песні. Калісьці спевы з “падводкай” бытавалі на вуліцы, на вольнай прасторы, на полі.
Спевы з “пералівамі” я пачула ад сваёй бабулі, Бяльчук Марыі Федараўны, жыхаркі вескі Хаціслаў. Гэта вельмі распаўсюджаны стыль выканання народных песень у славянскім фальклоры. У беларускай народнай песеннай традыцыі ён уяўляе сабой у асноўным эпізадычнае адхіленне голасу ці галасоў ад асноўнай мелодыі. Менавіта гэтыя адхіленні ствараюць так званыя “пералівы”.

Недастаткова знайсці ноты і вывучыць песню. Яе трэба спяваць разам з народам. Вось чаму на просьбу навучыць спяваць тую ці іншую песню людзі кажуць: “Пажыві з намі некалькі гадоў – і навучышся”. Хачу дадаць, што пераймаць песні лепш за ўсё ад непасрэдных носьбітаў, якіх, на жаль, з кожным днём становіцца ўсё менш.

Мне пашасціла сустрэцца з цудоўнай жанчынай Кавальчук Вольгай Якаўлеўнай, 1926 года нараджэння, якая пражывае ў вёсцы Хаціслаў. Колькі песень ведае гэты чалавек? І вось адна з іх “Вясельная”.

Чэрэз ліс дурожэйка – 2 р.
Понуд лісом стэжыйка – 2р.
То там бігла Ганнучка – 2р.
Цвіт калыны ламала – 2р.
До лычка прыкладала – 2р.
Матюнкы пыталася – 2р.
Матюнко голубойко – 2р.
Чы я буду такая – 2р.
Як калынойка сяя – 2р.
Будыш дітятко будыш – 2р.
Покы ю мэнэ будыш – 2р.
Прыйдэ матюнка чужая – 2р.
То спадэ з тэбэ краса – 2р.
Як з калынойкы роса – 2р.

А вось яшчэ адна песня запісана ад Саўчук Еўдакіі Зіноўеўны, 1910 года нараджэння

І ны рік жэ я ждала
І ны два жэ я ждала
Покы свого сыночка
Вэсілечка дождала
Ой, тэпэр я высока!
Ой, тэпэр я шырока!
Ой, тэпэр я рада стала
Шчо нывістку дуждала!

Складана у адной рабоце даць усім характарыстыку, прывесці прыклады.

Кожная група песень заслугоўвае асобнага даследвання. Спыняюся толькі на некаторых больш падрабязна.

Беларускія народныя песні пра каханне.

Вернае і шчырае каханне – адна з галоўных тэм народнай музычнай спадчыны. Песні пра каханне – гэта споведзь, а спавядаюцца заўседы двое – яна і ён.

Паводзіны паміж закаханымі часта параўноўваюцца з паводзінамі голуба і галубкі. Каханне і разлука ідуць у гэтых песнях побач. Пакуты кахання – галоўны матыў народнай песні, у якой дзяўчына скардзіцца на нешчаслівы лёс, на здраду – самае вялікае гора.

Дрова і лучыну
Можна порубаты,
А з нывірным чоловіком
Трэба вік страдаты.

Вельмі адметныя мелодыі гэтых песень, якія перадаюць не выказаныя да канца словамі пачуцці.

Завяршыла я сваю работу запісамі ад сваей бабулі Бяльчук Марыі Федараўны, 1944 года нараджэння, песнямі і прыпеўкамі, але гэта толькі кропелькі з шырокай песеннай ракі нашага Палесся.

Вітэр віе, вітэр віе,
Веточка колышыцця.
Ты нэ вір діўчына хлопцю
Покуль нэ ожэныцця.

Вітэр віе, вітэр віе,
Вітэрок подуй, подуй.
Пырыдай мойму мылэньку
Муй горячый поцілуй.

Ой, казалы люды,
Нычого нэ будэ.
Шо хотілы, то зробылы
Іван зятем будэ.

Полюбыть, так полюбыть
Хлопця хорошого.
А такого ныма чого,
Якы спыть до вэчора.

Вася, Вася васілёк
Хорошэе зілле.
Як ты будэш жэнытыся
Поклыч на вэсілле.

На вэсіллі була,
На вэсіллі людэ.
А я стану, подумаю,
Колы ж мое будэ.

Выступленне сваё хачу закончыць радкамі верша Ніны Гарагляд:
Заспявала на вяселлі песню маці.
Нейкі хлюст мне крыкнуў:
- Можэт хваціт?
Пацягнула за рукаў суседка:
- Хопіць!
Песню маей вескі хто падхопіць?
Што ж вам, людцы, мову заняло?
Нарадзіла ж вас усіх сяло!
“А за сялом выпала бела роса,
Там стаяла дзеўчына ўсю ноч боса…”
На ўвесь голас пяю песню матчыну
І дачцэ аддам яе ў спадчыну.

Літаратура

1.Аляхновіч А.М. Беларуская традыцыйная музычная спадчына. Дапаможнік для настаўніка, Мн. “Беларусь”, 2000
2.Беларускія народныя абрады / склад., навук. рэд. Л. Касцюкавец. – Мн. Беларусь, 1994

3. Занько У. Спадчына маей маці, Мн. “Мастацкая літаратура”, 1993

Анатацыя

Навукова - даследчая работа па тэме «Песня – душа народа» праводзілася на працягу года. Была вывучана літаратура па тэме, праведзена інтэрв’ю з жыхарамі вёскі. Увесь сабраны матэрыял сістэматызаваны, аб’яднаны ў адзінае цэлае. У рабоце паказана непарыўная сувязь пакаленняў.

Песня – душа народа. З песні не толькі “словы не выкінеш”, не пераробіш, а нават гука чужога ў яе не ўставіш – мелодыя не дасць.

Ручнікі

СІМВАЛЫ ШЧАСЦЯ Ў БАБУЛІНЫМ АРНАМЕНЦЕ

Садаўнічык Валерыя
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Крыўлянская сярэдняя школа”
Жабінкоўскага раёна
Пешка Валянціна Вітальеўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Мэта: выхаванне чалавечай душы, маральных адносін да чалавека праз далучэнне да традыцый нацыянальнай культуры

Задачы: пашырэнне ведаў пра народную спадчыну, далучэнне да традыцый нацыянальнай культуры;
выхаванне пачуцця прыгажосці, фарміраванне эстэтычнага густу;
развіваць уменне даследаваць, аналізаваць, рабіць высновы, спалучаючы ўласныя думкі з аўтарскімі.

Ёсць чаму , ёсць чаму ,
І ў народа майго павучыцца …
Юрась Свірка

У маёй любімай бабулі Лаўранюк Ганны Мікалаеўны, што жыве непадалёку ад Жабінкі, у вёсцы Крыўляны, вельмі шмат вышывак. Вось яны і зацікавілі мяне, далі штуршок для майго маленькага і першага, але не апошняга, спадзяюся, даследвання. Ручнікі, вышыванкі , сурвэткі, кашулі, фартухі, абрусы – усё гэта можна знайсці ў бабулінай хатцы. Як гэтыя рэчы вырабляюцца , з чаго, і чаму яны такія прыгожыя і сёння? Цікава, праўда ?! Вось і мяне зацікавіла ўсё тое, чаго няма ў сучаснай кватэры, а ў бабулі – шмат .

Адным з самых папулярных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з’яўляецца вышыўка.

Сваімі каранямі вышыўка ідзе далёка ў глыбіню стагоддзяў. Шыццё і вышыўка – самыя найстаражытнейшыя заняткі чалавека. Першыя касцяныя іголкі вядомы свету з часоў палеаліту. А ў XIX-XX ст. вышыванне на Беларусі было адным з пашыраных заняткаў жанчын, якія ўпрыгожвалі самыя розныя вырабы тканін арнаментам ці вышыўкай.Дзяўчынкі майго ўзросту (12-15 гадоў) вучыліся ў сваёй маці ці бабулі як правільна карыстацца іголкай (як мы на ўроках працы ў

наш час). Вышыўка была галоўным заняткам дзяўчыны ў перадвясельны час, калі ўсе думкі і намаганні скіроўваліся на тое, каб вышытыя і вытканыя ручнікі, абрусы, фартухі сведчылі аб добрай падрыхтоўцы да сямейнага жыцця. Вышывалі арнаментам жаночыя і мужчынскія кашулі, у верхняй частцы рукава або ў яго манжэты, каўнер, пярэднюю частку. Фартух, які завязваўся на таліі, дэкараваўся на падоле адной або некалькімі арнаментнымі палоскамі .

Самыя невялікія па памерах вышыўкі – сурвэткі. Гэта вырабы з лёну , воўны ці шоўку . Яны бываюць самай разнастайнай формы: квадрат, круг, эліпс, прамавугольнік і іншыя. Традыцыйна белага колеру .

Сярод вышыванак прыкметнае месца займае ручнік. Ручнікамі на Беларусі прыбіралі абразы, рамкі з фотаздымкамі, люстэркі. Ручнікі ўваходзілі ў пасаг маладой, сведчылі пра яе працавітасць, умельства і густ. Маладая дарыла ручнікі родным жаніха, ручніком абвязвалі свата, на ручнік ставілі каравай. Каб выканаць гасціннасць і павагу на ручніку падаюць хлеб-соль і сёння. Ручнік ахвяравалі ў царкву, вешалі на прыдарожных і надмагільных крыжах, на ручніку прымалі народжанага, а таксама спускалі труну ў магілу .

Асноўныя тканіны для вышыўкі на Беларусі – гэта лён, льняныя палотны.Яны былі самыя розныя і па гатунку, і па таўшчыні. Ніткі , якімі вышывалі тканіны, былі баваўняныя – чырвоныя, сінія, чорныя ці натуральнага белага колеру. Для аздаблення верхняга адзення, дывановых пакрывал ужываліся шарсцяныя каляровыя ніткі. Самыя папулярныя – гэта чырвоныя, якія маглі ўжывацца разам з дабаўкамі сініх , а пазней – чорных нітак. У наш час выкарыстоўваюцца ўсе вядомыя адценні анілінавых фарбавальнікаў .

А якія ж спосабы выканання народнай вышыўкі? Як расказала і паказала мая бабуля, іх два: гэта вышыўка крыжыкам і вышыўка гладдзю. Тэхніка вышыўкі гэтымі важнейшымі спосабамі розная, але я сёння вучуся вышываць простым крыжыкам, і мне такая вышыўка вельмі падабаецца .

Тэхніка выканання народнай вышыўкі даволі разнастайная.
Мастацтвазнаўцы называюць вышыўку крыжом адным са старажытнейшых вынаходніцтваў жанчыны, якая імкнулася ўпрыгожыць сваё адзенне і жыллё. Спецыялісты з дакладнасцю не могуць сказаць, колькі стагоддзяў назад на беларускай зямлі быў вышыты першы ўзор крыжыкам, бо тканіна не можа так захоўвацца, як напрыклад, цэгла. Самыя старэйшыя на сённяшні дзень узоры вышыўкі датуюцца 19 стагоддзем. Аднак “узрост” вышыўкі крыжыкам трэба лічыць дзясяткамі стагоддзяў.

У другой палове 19 – пачатку 20 стагоддзя вышыванне на Беларусі было адным з пашыраных заняткаў. У той ці іншай ступені ёю валодала кожная жанчына. Асабліва вялікую ўвагу пры вышыванні аддавалі арнаменту, бо ён нёс вельмі глыбокі сэнс, і выпадковых дэталяў у малюнку не магло быць.

Узоры на адзенні

Традыцыя аздабляць адзенне сягае сваімі каранямі ў самыя старадаўнія часы. Узоры на адзенні, як і на астатніх прадметах, адганялі ад чалавека злыя сілы. Асабліва аберагалі жанчыну-маці. Вось чаму жаночае адзенне было значна багацей арнаментавана за мужчынскае. Уся ласка зямлі і неба павінна аберагаць яе і будучае патомства ад злых духаў. Асноўны малюнак жаночага адзення складаўся з квадратаў альбо трохкутнікаў – вобраза засеянага поля. На кашулях вышэй пояса – узоры з раслінными матывамі, ромбамі – знакі ўрадлівасці зямлі. Рукадзельніцы часцей за ўсё складалі свой узор са знакаў Сонца і Зямлі, чым праслаўляла жыццёвыя сілы прыроды, урадлівасць Зямлі і прасіла добрага ураджаю – ад гэтага залежалі жыццё і дабрабыт сям'і.

Вось такую сарочку насіла жанчына сярэдніх гадоў, замужняя. На гэта ўказвае вышыўка. Тут вельмі многа розных узораў, выкананых гарызантальна на рукавах.



Але больш за ўсё розных ромбаў, якія сімвалізуюць зямлю, пладароддзе і жаночы пачатак.

А вось па гэтых фотаздымках мы можам сказаць, што сарочкі належалі маладым дзяўчатам. Па-першае, вышыты яны не так многа, як папярэдняя, і ўзоры ў іх зусім іншыя.



Вось гэту, напрыклад, сарочку насіла дзяўчына-падлетак. Усе кветкі ў ёй цесна злучаны паміж сабою. Гэта гаворыць пра тое, што дзяўчына цесна звязана са сваёй сям’ёй.

А вось гэта сарочка належала дзяўчыне, якая ўжо можа выходзіць замуж. Кветкі на ёй хоць і злучаны паміж сабою, але пасля кожнай буйнай палоскі кветак ідуць маленькія кветачкі, што гаворыць пра тое, што дзяўчына ўжо можа выходзіць замуж і займець сваю сям’ю.
Поруч з кашуляй па колькасці і значнасці аздаблення стаяў фартух, які завязваўся на таліі. Ён звычайна дэкарыраваўся па падоле адной ці

некалькімі арнаментальнымі палосамі.







Выкарыстоўваўся арнамент і на мужчынскім адзенні. Часцей за ўсё для мужчынскага адзення выкарыстоўвалася вышыўка з кветак або

розных палосак. Прычым вышыўка на манжэтах, варатніку і на грудзях павінна была адрозніваццa. Звычайна арнамент выконваў ролю ахоўніка ад розных нядугаў, ад дурнога вока. На грудзях і шыі – ахоўваў сэрца і душу, дыхальныя органы. На запясці і прадплеччы – ахоўваў рукі, важнейшы інструмент чалавека працы.

Вось гэта святочная мужчынская сарочка, бо ўвыкарыстаны розныя каляровыя гамы.



Асноўны колер, які выкарыстоўваўся для вышывання, гэта чырвоны на белым палатне. Чырвоны – колер самога Сонца, колер агню, цеплыні і чалавечай крыві. Для людзей яно было жывой істотаю, якая "ўзыходзіла" ўранку на сваю вогненную каляснiцу, запрэжаную хуткімі вогненнымі коньмі, і абыходзіла Зямлю, аглядаючы свае ўладанні. У беларускіх узорох самымі ўлюбёнымі былі знакі, прысвечаныя Сонцу: круг, крыж, круг з крыжам, кола з шасцю спіцамі. І гарэлі знакі Сонца на белым полі палатна.

Белы Свет – гэта дзённае святло. Белы колер – гэта колер малака, вады, што наталяла смагу, колер чысціні. А спалучэнне белага і чырвонага паўставала як сімвал жыцця, шчасця, працвітання.

Вышыўка шырока выкарыстоўвалася не толькі ў адзенні, але і ў розных іншых аксэсуарах. Бабуля расказала, што ў старыну дзяўчынка пачынала рыхтаваць сабе пасаг яшчэ з дзяцінства, бо работы было вельмі многа: выткаць і вышыць адзенне, ручнікі, навалачкі і набожнікі – спецыяльныя рушнікі па акладу іконы, посцілкі і пакрывалы, занавескі і многае іншае. А незадоўга да вяселля нявеста павінна была выткаць і вышыць сарочкі жаніху, бацьку жаніха, яго сёстрам. А ў перадвясельны час нявеста збірала талаку з бліжэйшых сваячак і сябровак і ўсёй грамадой аздаблялі вышыўкай ручнік-абыдзённік, вытканы за адну ноч ці дзень для прадухілення сваёй вёскі ад пошасці, эпідэміі, засухі, градабою. Увогуле вясельныя рушнікі выконвалі асобую ролю. Часцей

за ўсё для дачок і сыноў вышывалі маці, укладваючы ў арнамент сакральны, магічны сэнс. Ручнікамі бацькі звязвалі разам маладых, што сімвалізавала неразрыўнасць іх дальнейшага шляху па жыцці. З ручнікоў рабілі “вароты”, пад якімі праходзіла маладая пара, вяртаючыся пасля вянчання ў хату. На ручніку стаялі маладыя ў час вянчання ў царкве.

Старажытныя вясельныя сімвалы спакон вякоў у розных частках Беларусі практычна не адрозніваюцца. Малюнкі вышыўкі, як і любы старадаўні арнамент, мае сваё значэнне.

Першы рад арнаменту – вясельныя званочкі, сімвал свята, вяселля і



радасці. Наступны рад складаецца з кветак і ромбаў. Гэта мужчынскія і жаночыя сімвалы разам утвараюць калёсы. Сімвал чытаецца па-рознаму. Кацяцца калёсы – едзе вяселле. Акрамя таго, кола не мае ні пачатку, ні канца, сімвалізуе тое, што жыццё працягваецца вечна, адзін род змяняе другі. А яшчэ гэта напамінак пра хуткаплыннасць жыцця і пра тое, што трэба радавацца кожнаму яе дню.

А вось іншы вясельны ручнік.



На ім мы бачым традыцыйны вясельны сімвал, кветкі жыцця, якія растуць з вазы – чашы. Бацькі жадаюць маладым, каб іх дом быў поўнай

чашай. Па баках абавязкова вышываюцца кветкі (маглі быць мужчынскія ці жаночыя фігуры) – сімвал добрага шчаслівага жыцця. А знізу рушніка вышывалі яшчэ адну паласу. Яна магла складацца з каласкоў, козачак, дзіцячых фігурак: пажаданне маладым поспехаў у рабоце, багатай гаспадаркі, працягу роду.

А яшчэ на вясельных рушніках любілі вышываць птушак, часцей за усё галубоў.





Вось як на гэтых рушніках паказана, што каханне ў росквіце, і будзе яно бясконцым, бо птушкі ў абрамленні кветак.

Вывад

Вядома, не ўсё ўвайшло ў маё апісанне, але цяпер я

дакладна ведаю, што вышыўка – папулярнейшае з мастацтваў, усім дасціпнае, зразумелае без асаблівых тлумачэнняў. А арнамент зварочаны перш за ўсё да нашай інтуіцыі, да падсвядомага адчування выразнасці рытма, колера і формы. У дальнейшым я хачу расказаць і пра беларускае адзенне, і пра саломапляценне, і пра ткацкія вырабы, і пра многае іншае. Бо наша беларуская культурная спадчына – гэта цэлая скарбонка традыцый, рамёстваў, якія трэба вывучаць і вывучаць нам, маладым. А навука этнаграфія , якая займаецца такімі пытаннямі , дапаможа мне ў гэтым .

Сёння ўсё гэта яшчэ больш актуальна, бо стала відавочна, што страціўшы народную культуру і не набыўшы аніякай другой, мы страцім культуру наогул. Такім чынам зварот да гістарычных традыцый у наш час жыццёва неабходны, дарэчы гэты працэс ужо даўно пачаўся ва ўсіх краінах свету. Ён з'яўляецца не апошнім сродкам барацьбы за зберажэнне нацыянальнай свядомасці.

Сучасныя дзеці амаль адарваныя ад беларускай народнай культуры. У сялянскай хаце аніводная рэч, аніводны прадмет убранства ці адзенне не мог узнікнуць па-за межамі традыцыйнага мастацтва. Ручнікі, посцілкі, сурвэткі, фіранкі; тканае і аздобленае вышыўкай, аплікацыяй, вязанымі карункамі адзенне - усё гэта былі высокамастацкія рэчы, а між тым адначасова звычайныя, неабходныя кожны час, кожны дзень, усё жыццё.

Каб не страціць набытае стагоддзямі, трэба памятаць, што пачынаць неабходна з выхавання дзяцей, бо яны - будучыня нацыі, частка яе залатога фонду.

Дадатак 1

Узоры бабулінай вышыўкі



Рэчы дэкаратыўнага прызначэння



Сурвэткі



Дадатак 2

Па віду выяўленчага элемента, або матыва,
які выкарыстоўваецца ў арнаменце, яго падзяляюць на:

1. Геаметрычны (кропкі, стужкі – ламаныя, прамыя і зігзагападобныя, кругі, ромбы, шматграннікі, зоркі, крыжы і г.д.)



2. Раслінны (які стылізуе лісці, кветкі, плады)



3. Анімалістычны, які стылізуе фігуры або часткі фігур рэальных або фантастычных жывёл (леў, львіныя лапы, арол, паўлін, рыба, змяя, матылёк, птушкі і г.д.)



4. Прыродны або касмаганічны, які стылізуе з’явы прыроды (маланкі, арэол полымя, сонца, месяц, зоркі і г.д.).



Звяз узораў



Узор - дрэва жыцця. Ен сімвалізуе вечнасць, бясконцае жыцце.



Ярыла на кані. У славянскіх пляменаў часоў язычніцтва Ярыла лічыўся Богам урадлівасці і жыццевых сіл прыроды.



Жытняя Баба. Ў старажытных славян была багіняй урадлівасці.



Узор абуджэння прыроды вясною



Узор сонца. У старыя часы да Сонца як да бога звярталіся па дапамогу. Галоўным богам яно было ў нашых продкаў-славян. Называлі яго па-рознаму: то Сварогам, то Даждзбогам, то Хорасам.



Яднанне сонца і зямлі. У народнай свядомасці саюз зямлі і сонца спрадвеку звязваўся з жыццём, цяплом, ураджаем.



Узор моцнай сям'і. Ручнікі з такімі ўзорамі ахвяраваліся ў царкву, на абраз Маці Божай.



Узор сонца



Узор Багача.



Матыў Ярылы.



Маладыя вянчаюцца



Сімвал продкаў.



Каханне пачынаецца



Каханне ў росквіце.



Каханне без узаемнасці



Памяць пра каханне.



Узор любоўнай песні.



Узор дзяўчыны - бярозы. Ў цэнтры - бярозка з паніклымі галінамі, па баках - узор жаночай долі.



Сімвал Берагіні.



Купалле. Карагод. Атрыбут свята.



Купалле. Агонь-жыжа. Атрыбут свята.



Купалле. Купалінка ў танцы.



Узор Святога Дрэва і Радаўніцы. У рамбічнай фігуры - Радаўніца ў выглядзе дзвюх елачак. Паабапал - сімвалы душ нябожчыкаў-сваякоў. Гэта пашана да іх памяці, адначасова і надзея, што продкі паспрыяюць сям'і ў здароўі і дабрабыце.



Святое Дрэва. Грамнічнае дрэва. Азначае яно пажаданне нябожчыкаў жывым, іх дзецям і ўнукам быць здаровымі, заможнымі, мець каласістае жыта на ніве, пладавітую і сытую жывёлу ў хляве. А яшчэ гэты матыў абазначае і свечку, ахвяру царкве за памінанне нябожчыкаў.



Сімвал продкаў. Гэта сваеасаблівая малітва, просьба да Бога, каб памерлыя апынуліся ў раі, каб зямля ім была пухам і вечна грэла цёплае сонейка.



Узор дажджу. Гэтым узорам людзі ў знойнае лета прасілі Бога даць ім дажджу.



Сімвал дзіцяці. Зберагае ад няшчасця дзіцяці.



Сімвал маці



Сімвал абярэга.



Купалле. Купальская трава з трыма кветкамі.

Спіс крыніц

1. Лакота А.І., Барыс С. В. Сцежкамі дзядоў. Мн., 1986
2. Таланцава В. Ф. Мастацтва бачыць свет. Мн., 1998
3. Раманюк М. Ф. Беларускае народнае адзенне. Мн., 1981
4. Церашковіч Т. А. Лялька беларуская. Мн., 1992
5. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Белпрусі. Мн., 1987

6. Этнаграфія Беларусі. Мн., 1989

БЕЛАРУСКІ АРНАМЕНТ– МОВА ТКАНЫХ І ВЫШЫВАНЫХ ВЫРАБАЎ МАЙСТРОЎ ВЁСКІ ВОЛЬНА БАРАНАВІЦКАГА РАЁНА

Петраш Тамара
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Вольская сярэдняя школа”
Баранавіцкага раёна
Туровіч Людміла Анатольеўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Мэта: вызначыць асаблівасці арнамента тканых і вышываных вырабаў майстроў вёскі Вольна

Задачы: пазнаёміцца з сімволікай беларускага арнамента;
параўнаць тканыя і вышываныя вырабы майстроў вёскі Вольна з характэрнымі для Цэнтральнай Беларусі арнаментамі;
прачытаць арнамент на некаторых вырабах

Уводзіны

У 2012 годзе я пачала наведваць гурток ”Чароўны клубок”, на якім мы вучымся вышываць. Мне вельмі падабаюцца вышытыя вырабы маёй бабулі Надзі і прабабкі Юлі.



Вышытыя ручнікі, сурвэткі, тканыя посцілкі... Хто былі тыя людзі,якія іх вышывалі? Як склалася іх жыццё? Чаму менавіта такія ўзоры на ручніках,посцілках? Аб чым яны нам гавораць? Часта мне здаецца, што яны хаваюць у сабе нейкую тайну, якую не кожнаму дадзена разгадаць. За адказамі на мае пытанні я звярнулася да сваёй настаўніцы. Яна сказала, што кожны ўзор мае сваю мову і



гісторыю, і дапамагла мне навучыцца “чытаць” ручнікі.

Задачамі маёй навуковай работы з’яўляюцца:

-пазнаёміцца з сімволікай беларускага арнаменту;

-параўнаць вышытыя і тканыя вырабы вёскі Вольна з характэрнымі для Цэнтральнай Беларусі арнаментамі;

- “прачытаць” арнамент на некаторых вырабах



Кароткая гістарычная спраўка

Адным з яскравых помнікаў нашай беларускай нацыянальнай культуры з’яўляюцца тканыя і вышываныя вырабы, астаўленыя нам у спадчыну. Мастацтва вышывання і ткацтва мае шматвяковую гісторыю. Аб існаванні вышыўкі ў эпоху Старажытнай Русі кажуць знаходкі археолагаў, якія адносяцца да 9-10 стагоддзяў. Гэта фрагменты адзення, упрыгожаныя ўзорамі і вышытыя залатымі ніткамі. Залатым швом у далёкія часы ўпрыгожвалі прадметы быту, адзенне шляхты. Слова “**арнамент”** у перакладзе з лацінскага азначае “**упрыгожваць”.** Беларускі арнамент змяшчае вялікую колькасць узораў, якія маюць сваю мову і сваю гісторыю.

Сучасныя майстры пазычаюць са скарбніц народнай спадчыны цудоўныя ўзоры, выкарыстоўваюць як старадаўнія, больш складаныя, так і новыя, дэкаратыўныя, лягчэйшыя ў выкананні. Многія вучоныя напраўляюць сваю дзейнасць на растлумачванне вобразаў у беларускім арнаменце.





Асноўная частка

“Трэба многа знаць, каб узор прачытаць…”-гавораць старыя людзі. Якія веды патрэбны, каб прачытаць узор?

Узоры на ручніках і посцілках дзеляцца на некалькі груп.

Вобразы ўраджа

Беларусь - краіна земляробства, а хлеб у нас цаніўся даражэй за золата. Шмат сімвалаў ураджаю мы знаходзім у тканых і вышываных вырабах.

Гэта вобраз Ярылы, Жыценя, Спарыша, Багача, узоры дажджу, хлебу.

Вобразы маці

Часта на ручніках і тканых вырабах мы бачым вобраз маці. Ён сустракаецца у трох варыянтах: у выглядзе жаночай фігуры, у выглядзе жаночай фігуры з зоркамі і ў выглядзе дрэва жыцця

Вобразы роднай Беларусі

Шмат перажыла Беларусь за сваю тысячагадовую гісторыю. Нашы продкі жылі ў міры і дружбе са сваімі суседзямі, не ўзбагачаліся за чужы кошт. Любоў да роднай зямлі можна бачыць на многіх вышыванках і тканых вырабах. Гэта ўзор Радзімы, рэчкі, лесу, розных жывёл.

Вобразы святаў

Тут цесна пераплялiся хрысціянскія матывы і язычніцкія. Мы бачым купальскія матывы, калядныя, вясельныя, узоры Перуна, Жыжаля, Грамабоя

Вобразы кахання

Сімвалам кахання ў беларусаў лічыцца голуб. Калі галубок і галубка ідуць адзін за адным - гэта пачатак кахання, калі імкнуцца адзін да аднаго, то гэта сведчыць пра шчаслівае каханне, а калі разыходзяцца ў розныя бакі, то каханне без узаемнасці або нават трагічнае



Параўнальны аналіз узораў арнаменту

Для параўнання і аналізу арнаменту я наведала карэнных жыхарак вёскі Вольна Снежка Марыю Уладзіміраўну і Галубко Галіну Уладзіміраўну. Гэта дзве родныя сястры. Марыя Уладзіміраўна ўсё сваё жыццё прысвяціла ткацтву. Па яе словах у 1976 годзе яна выткала аж 16 посцілак. Зараз у Марыі Уладзіміраўны ўжо не хапае сіл ткаць, але яна з радасцю паказала мне ткацкі станок, свае посцілкіі

расказала аб тым, як ткала раней, як падбірала ніткі, прыдумвала ўзоры. А вось Галіна Уладзіміраўна вельмі любіць вышываць. Колькасць вышытых ручнікоў, сурвэтак ўразіла мяне. Галіна Уладзіміраўна расказала, як была маленькай і старалася запомніць узоры, якія вышывалі яе мама і бабуля, прапанавала мне вышыць некаторыя ўзоры і падзялілася некаторымі сакрэтамі свайго майстэрства.





Узоры вышыўкі ці ткацтва Баранавіцкага раёна маюць рысы, уласцівыя традыцыям народных тканін Цэнтральнай Беларусі. Гэта:

-лінейнасць

-чаргаванне вузкіх і шырокіх палосак па краях ручніка

-свабодная ад палосак сярэдзіна

-шматколер’е

Толькі адзін тканы ручнік поўнасцю адпавядае адзначаным прыкметам .

Характэрныя рысы арнаменту нашай мясцовасці

				
Лінейнасць				
Шырокія палосы ў чаргаванні з вузкімі				
Шматколер’е				
Свабодная ад палос сярэдзіна				





Гэты ручнік выткала Марыя Уладзіміраўна. На ім мы бачым шырокія палоскі рознага колеру ў чаргаванні з вузкімі і свабодную ад палосак сярэдзіну. На жаль, гэты ручнік не мае аздаблення па краях, бо быў вытканы для хатняга карыстання.

Усе астатнія ручнікі і тканыя посцілкі, якія я ўбачыла, маюць як характэрныя рысы, так і свае асаблівасці, сваю “мову”.Іх узоры можна “прачытаць”. Паспрабую гэта зрабіць.

На гэтым вышытым ручніку Галіны Уладзіміраўны мы бачым узор складанага сонца з трыма адросткамі - прамянямі, якія накіраваны наверх. Гэты ўзор сімвалізуе абуджэнне і адраджэнне прыроды ўвесну. Побач, ва ўзоры сонца і па баках ручніка, узор Багача як надзея на добры ўраджай.



Цікавай для вывучэння з’яўляецца посцілка, якую выткала Марыя Уладзіміраўна. Яна таксама прысвечана тэме ўраджаю. У цэнтры мы бачым узор Спарыша. Спарыш-значыць здвоены, ён мае выгляд разеткі, дзе два каласкі размешчаны па бакам. Побач мы бачым крыж ысціў зерне. Крыж снай сілы. Узор да з узорам дажд і,





што добрага ўраджаю цяжка дачакацца без своечасовых ападкаў. Узор Спарыша мы бачым і на гэтым вышытым ручніку.

Яшчэ мне вельмі спадабаўся вось гэты ручнік. Ён аўтабіяграфічны. Яго вышыла Галіна Уладзіміраўна. На ім мы бачым двух галубкоў, якія павернуты галоўкамі адзін да аднаго. Крылы іх падняты, яны імкнуцца насустрач.

Так Галіна Уладзіміраўна сімвалізуе сваю сям'ю: сябе і свайго мужа і іх шчаслівае жыццё. Паміж галубкамі ўзор з кветак, а таксама два ромбы -дзеці Галіны Уладзіміраўны. Такія ручнікі вешалі часта на іконы і называлі"набожнікамі".

Са слоў Галіны Уладзіміраўны, вышываючы гэты ручнік, яна хацела, захаваць сваю сям'ю і засцерагчы яе ад няшчасцяў.

Усё, аб чым я даведалася ад маіх зямлячак, я расказала на адным з заняткаў гуртка. Мой расказ дапоўніла настаўніца і прапанавала нам вышыць свае ўзоры арнаменту. Узоры на маёй сурвэтцы сімвалізуюць абуджэнне прыроды ўвесну. Па краях сурвэткі узоры сонца, зямлі, прыроды, дрэва жыцця, а ў цэнтры Вясна-Вяснянка.







Заключэнне

У выніку сваіх пошукаў я прыйшла да наступных вывадаў:

- вышываныя і тканыя вырабы народных майстроў вёскі Вольна маюць не толькі характэрныя рысы, але і свае асаблівасці і прызначэнне.
- узоры арнаменту можна прачытаць

Людзі, якія іх вышывалі, марылі аб шчасці і дабрабыце, не імкнуліся да славы, а па-майстэрску перадалі тое, чаму вучылі іх

бацькі. Я лічу, што іх праца не павінна прапасці і кануць у небыццё. І таму я паспрабую захаваць традыцыі вышыўкі для будучых пакаленняў.

Спіс літаратуры:

1.Кацар, М. С . Беларускі народны арнамент. Ткацтва. Вышыўка / М. . Кацар. – Мн.: БелЭн, 1996 – 208 с.

2. Прускі, М.Н. Беларускі арнамент / М.Н. Прускі. – Мн.: Альбом, 1979- 284 с.



3. Сахута, Я.В. Мастацтва Беларусі / Я.В. Сахута. - Мн.: Альбом, 1980 – 234 с.

4. Фадзеева, В.Я. Беларускі ручнік / В.Я. Фадзеева. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994 – 215 с.

БЕЛАРУСКІЯ РУЧНІКІ: ТРВДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ВЁСКІ МІЛЕЙКА ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНА)



Бурвін Міхаліна
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Ліцэй Івацэвіцкага
раёна ”
г. Івацэвічы
Бурвін Людміла Мікалаеўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Мэта даследавання: параўнанне беларускіх ручнікоў, выраблены ў вёсцы Мілейкі ў 50-я гады XX стагоддзя і ў перыяд з 2010 па 2015 год.

Задачы даследавання:

1. Ахарактарызаваць асаблівасці ўзораў ручнікоў розных часоў паводле іх колеру, характару малюнка, матэрыялу.
2. Выявіць падабенства і розніцу ў вырабе ручнікоў ў адной і той жа вёсцы ў розныя часы.
3. Высветліць прычыны адрозненняў у ручніках, выраблены у вёсцы Мілейкі Івацэвіцкага раёна ў розныя часы.

Прадмет даследавання – беларускі ручнік вёскі Мілейкі Івацэвіцкага раёна.

Аб’ект даследавання - асаблівасці ручнікоў паводле матэрыялу, узору, колеру.

Практычная значнасць: даследаванне стала дадатковым інфармацыйным матэрыялам, які можна выкарыстоўваць на ўроках літаратуры, на занятках факультатываў, класных і інфармацыйных гадзінах.

Раздзел 1. Ручнікі, выраблены ў 50-я гады XX стагоддзя

1.1. Ручнікі з крамнага матэрыялу



Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі. Шырыня 45 сантыметраў. Даўжыня два з паловай метры. Матэрыял – бавоўна белага колеру.Ніткі – горань. Спосаб вышыўкі – крыжык. Карункі куплены ў краме.

Арнамеа памерам 20 см. Арнамент раслінн ырвоным, ружовым і сінім колерам

Прызначэнне – аздобіць ікону.

Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.
Шырыня 45 сантыметраў.
Даўжыня два з паловай метры.
Матэрыял – бавоўна белага колеру. Ніткі – горань.
Спосаб вышыўкі – крыжык.
Карункі сплецены кручком, малюнак карункаў раслінна- геаметрычны.
Арнамент канцэнтрыруецца на канцах ручніка ў два рады з пропускам агульным памерам 40 см. Арнамент раслінны, розны ў кожным радзе,пераважае зялёны колер лістоў з чырвоным, ружовым і сінім колерам кветак. Прызначэнне – аздобіць ікону.



Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.
Шырыня 50 сантыметраў.
Даўжыня два з паловай метры.
Матэрыял – бавоўна белага колеру. Ніткі – горань. Спосаб вышыўкі – крыжык. Карункі куплены ў краме.
Арнамент канцэнтрыруецца на канцах ручніка памерам 10 см. Арнамент раслінны, пераважае розных адценняў зялёны колер лістоў з чырвоным і ружовым колерам кветак.
Прызначэнне – навязванне свата на вяселлі.



Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.Шырыня 45 сантыметраў.Даўжыня два з паловай метры. Матэрыял – бавоўна белага колеру.Ніткі – горань.Спосаб вышыўкі – крыжык.Карункі куплены ў краме. Арнамент канцэнтрыруецца на канцах ручніка ў адзін рад памерам 10 см (на верхнім ручніку) і ў тры рады з пропускамі памерам 50 см (на

ніжнім ручніку). Арнамент раслінны, пераважае зялёны колер лістоў з чырвоным і фіялетавым колерам кветак.

Прызначэнне – навязванне свата на вяселлі.




Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.
Шырыня 45 сантыметраў.
Даўжыня два з паловай метры. Матэрыял – бавоўна белага колеру.
Ніткі – горань. Спосаб вышыўкі –гладзь.
Карункі куплены ў краме (на першым) і сплецены кручком (на другім).
Арнамент канцэнтрыруецца на канцах ручніка ў адзін рад памерам 20 см.
Арнамент раслінны, пераважае зялёны колер лістоў з чырвоным і ружовым колерам кветак.
Прызначэнне – навязванне свата на вяселлі.

1.2. Ручнікі з даматканага матэрыялу






Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.
Шырыня 50 сантыметраў.
Даўжыня тры метры.
Матэрыял – даматкаваная льняная адбеленая тканіна.
Ніткі – горань.
Спосаб вышыўкі – крыжык.
Карункі самаробныя ў выглядзе кутасоў.
Арнамент канцэнтруецца на канцах ручніка ў адзін рад памерам 5, 15 см і ў два рады без пропускаў памерам 30 см.Арнамент геаметрычна-раслінны,шматколернасці не назіраецца. Прызначэнне – бытавыя патрэбы.





Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.
Шырыня 50 сантыметраў.Даўжыня тры метры.
Матэрыял –даматкаваная льняная неадбеленая тканіна.Ніткі – горань. Спосаб вышыўкі – крыжык.Карункі самаробныя сплеценыя кручком.
Арнамент канцэнтруецца на канцах ручніка ў адзін рад памерам 15 і 13 см.Арнамент раслінны і геаметрычна-раслінны,шматколернасці не назіраецца: толькі чырвоны і чорны колеры.
Прызначэнне – бытавыя патрэбы.



Форма – падоўжаная тканіна з няроўнымі краямі.
Шырыня 50 сантыметраў.
Даўжыня тры метры.
Матэрыял – даматкаваная льняная неадбеленая тканіна.
Узор на ручніку не вышыты, а вытканы. Арнамент канцэнтруецца на канцах ручніка ў адзін рад памерам 7 см.Арнамент геаметрычны,шматколернасці не назіраецца.
Прызначэнне – бытавыя патрэбы.

Раздзел 2. Сучасныя ручнікі






Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.
Шырыня аднолькавая - 45 сантыметраў.
Даўжыня ад двух да двух з паловай метраў.
Матэрыял – разрэджаная канва.Ніткі – горань.
Спосаб вышыўкі – крыжык.Карункі купленыя ў магазіне.
Арнамент канцэнтрыруецца на канцах ручніка, узор займае да 50 см без пропускаў. Арнамент раслінны.Назіраецца разнастайнасць колераў.
Прызначэнне – аздабленне іконы, навязванне свата на вяселлі.






Форма – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі.

Шырыня 45 сантыметраў.Даўжыня ад двух да двух з паловай метраў.
Матэрыял – разрэджаная канва. Ніткі – горань.
Спосаб вышыўкі – крыжык.Карункі купленыя ў магазіне.
Арнамент канцэнтрыруецца на канцах ручніка, узор займае да 50 см без пропускаў.Арнамент геаметрычны і геаметрычна-раслінны.
Пераважаюць чырвоны і чорны колеры, ёсць два ручнікі з абсалютна аднолькавым арнаментам, адрозненне ў карунках і адценні нітак.
Прызначэнне – аздабленне іконы, навязванне свата на вяселлі.

Заключэнне

У ходзе праведзенага даследавання мы прыйшлі да наступных высноў:
падабенствы ручнікоў, выраблены у розныя часы ў адной і той вёсцы наступныя:
1. Форма аднолькавая – падоўжаная тканіна з роўнымі краямі (за выключэннем аднаго даматканага ручніка).
2.Для вышыўкі майстрыхамі выкарыстаны ніткі той жа якасці – горань (цяпер яны называюцца ніткі мулінэ, аднак жанчыны называюць іх па-ранейшаму).
3. Арнамент канцэнтрыруецца на канцах ручніка.
4. Арнамент геаметрычны і геаметрычна-раслінны, зусім адсутнічае арнамент птушыны ці з выявай чалавечых фігур.
5.Аднолькавая колеравая панарама: ці то шматколернасць, ці то спалучэнне чырвонага і чорнага колераў.
Адрозненні:
1.У сучасных ручніках шырыня аднолькавая.
2.Ручнікі з даматканага палатна даўжэйшыя.
3.Сучасныя вырабы толькі з купленага матэрыялу.
4.Сучасны спосаб вышыўкі – толькі крыжык.
5.Раней карункі часцей пляліся майстыхай, радзей – купляліся, цяпер – толькі набытыя.
6.У сучасных ручніках не назіраецца ўзораў з пропускам, аднак узор гэты большых памераў.
7.Сучасныя ручнікі не выкарыстоўваюцца для гаспадарчых патрэб.
Прычыны выяўленых адрозненняў майстрыхі (**Пузік Клаўдзія Рыгораўна, 1936 г.н.** – яе ручнікі 50-х гадоў мінулага стагоддзя – і **Касцюк Вера Паўлаўна, 1938 г.н**. – яе сучасныя ручнікі; абедзве жанчыны нарадзіліся і ўсё жыццё пражылі ў в.Мілейкі) тлумачаць наступным:
1.У сучаснасці ёсць вялікія магчымасці аблегчыць і паскорыць працу: купіць зручны матэрыял (канву), у часопісах выбраць любы ўзор.

2.Нядаўна вышытыя ручнікі глядзяцца вельмі прыгожа (ў ранейшых з-за даўнасці недзе выцвіў колер гораня, пажаўцела тканіна), таму іх шкада выкарыстоўваць у гаспадарчых мэтах, для гэтага ёсць магазінныя вырабы.

3.Ручнікі з даматканага матэрыялу былі даўжэйшымі, таму што выраблялiся спецыяльна для гаспадарчых патрэб, напрыклад, для выцірання пасля ўмывання, а сем'і былі вялікія, асобных ручнікоў сямейнікі не мелі.

4.Шырыня ручніка была не аднолькавая, бо яе бралі, зыходзячы з прыдуманага ўзору – каб малюнак быў поўны.



Рамёствы і карціны

ГАНЧАРЫ РУЖАН

Літвіновіч Валерыя
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Ружанская сярэдняя школа”
Давідзенка Людміла Іванаўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Амаль пяць стагоддзяў налічвае гісторыя ганчарства на ружанскай зямлі. Хаця на самай справе гаршкі ляпіць тут пачалі намнога раней, аб чым сведчаць пісьмовыя крыніцы. У ваколіцах Ружан яшчэ нашымі далёкімі продкамі былі знойдзены запасы гліны высокай якасці. У старажытнасці ганчарнай справай займаліся ледзь не ў кожным доме, часцей за ўсё цэлымі сем’ямі.

У канцы XIX – сярэдзіне XX стагоддзя ў мястэчку працавала некалькі дзясяткаў ганчароў. Жылі яны асобна на сваёй вуліцы, якая так і называлася Ганчарная (зараз Камсамольская). Яны перадавалі сваё майстэрсва дзецям і вучням, і так з цягам часу склаліся цэлыя сем’і, якія займаліся гэтай справай. Гэта Міхаіл і Пётр Хварастоўскія, Уладзімір Вікенцьевіч Сухоцкі, Сяргей Пятровіч Багдановіч, Георгій і Пётр Гаеўскія, Еўстафій Лявонцьевіч Жытніцкі, Бонівіантур і Іван Лісоўскія. На вуліцы Блізенскай (зараз Інтэрнацыянальная) жылі і працавалі: Буткевіч Іван, Севярын Антон, Лаўкевіч Пётр і Аляксандр, Гаеўскі Іван, Жылінскі Сігізмунд, Філітовіч Сцяпан і Іосіф. Па вуліцы 3-га Мая (цяпер 1-га Мая) Ляута Іван і Звяровіч Іван. Па вуліцы Пілсуцкага (цяпер Леніна) – Скок Сямён Аляксандравіч. Па вуліцы Чкалава – Жырмант Мікалай.

Бліжэй да нашых дзён ганчарная справа ў пасёлку замірае, любы посуд можна набыць у краме і попыт на ганчарныя вырабы рэзка падае.



Напрыканцы XX стагоддзя ў пасёлку застаецца толькі некалькі майстоў, людзей

ужо далёка немаладых, для якіх ганчарства ўжо больш “справа для душы”, чым для заробку.

Адным з іх быў Лісоўскі Іван Банівентуравіч (4.05.19922 – 1.03.1999). Ганчарнае майстэрства ён пераняў ад свайго бацькі. Выраблял у асноўным гліняны посуд.

Работы майстра неаднаразова адзначаны Ганаровымі граматамі за высокія паказчыкі ў развіцці народна-мастацкіх промыслаў, дыпломамі за захаванне традыцый народнай керамікі. Глякі і збаны майстра карысталіся вялікім попытам не толькі і ружанскіх гаспадынь, па посуд прыязджалі са Слоніма, Косава, Ізабеліна і навакольных вёсак.

Удава Івана Банівентуравіча Ядзвіга Войцехаўна ўспамінае: “Цяжкая праца ў ганчара. А пачынаецца яна з таго, што трэба гліну накапаць, потым збіць з яе “бабу”, каб яна стала адным комам. Пасля бралася вялікая тарка і на ёй гэты ком націралі. Гліну мясілі нагамі, каб



атрымаць аднародную масу. Рэзалі гатовую гліну сярпамі на тонкія палоскі, пасыпалі палоскі попелам, каб яны не склейваліся. Палоскі дзяліліся на кускі: маленькія – для кубкаў, большыя – для глякоў і гаршкоў. А далей Іван тварыў цуд. Махне нагой па ганчарнаму кругу, а рукі ў гэты час выраблюць замыславатыя рухі, і вось перад намі гаршчок або гляк. Затым яго ставяць на некалькі дзён для прасушкі, пакуль ён не стане цвёрдым. За гэты час майстар паспяваў прыгатаваць глазур, якая надавала гаршкам свой асаблівы глянец. Глазур рабілі з перамолатага на жорнах свінцовага парашку. З крухмалу варылі клей, усё гэта змешвалі і аблівалі гэтым гаршкі. Затым гаршкі абпальвалі ў спецыяльнай печы (гароні) прыкладна 12 гадзін. За адзін раз туды памяшчалася да 1000 вырабаў”. Ядзвіга Войцехаўна часта дапамагала свайму мужу, яна і цяпер ганарыцца, што вырабы яе мужа маюцца амаль у кожнай ружанскай сям’і.



Лісоўскі І.Б. быў апошнім прадстаўніком старой школы ганчароў на ружаншчыне.

Асаблівую старонку ружанскага промыслу складае мастацтва глінянай цацкі, якое ў пасляваенны час прадстаўлялі дзве выдатныя

майстрыхі - Кацярына Жылінская (1890-1962) і Вольга Давідзенка-Хварастоўская (1895 - 1978).



Мяркуючы па блізкім падабенстве іх твораў, такі стыль выканання быў, відаць, традыцыйным для Ружан, так што можна нават гаварыць пра своеасаблівую мясцовую школу мастацтва цацкі.

К. Жылінская выдатна майстравала гліняныя цацкі і свістулькі, яна насаджвала на драўляны брусок кавалачак гліны і паступова ляпіла з яго галаву, рукі, тулава цацкі і адразу прабівала дзірачкі для свістка. Затым загатоўка знімалася з бруска, аблівалася глазур'ю і абпальвалася ў печы.



Вялікай папулярнасцю карысталіся ружанскія гліняныя конікі і коннікі. На прысадзістых конях фанабэрыстыя седакі з гліны, у кожнага свой выраз твару.

Справу сваёй маці прадоўжыў Зыгмунт Жылінскі. Былы ганчар, ён раней цацак не ляпіў, але хутка зацікавіўся гэтай справай і акрамя



конікаў і коннікаў часта ляпіў фігуркі мужыка і бабы. У свой час попыт на такія цацкі быў вельмі вялікі. Пасля смерці майстроў іх справу у Ружанах ужо больш ніхто не прадоўжыў, але іх вырабы можна сустрэць у розных беларускіх музеях.

У нашы дні справу ружанскіх ганчароў хацеў прадоўжыць малады майстар Зайценаў Віталій. Некалькі гадоў ён арэндаваў памяшканне на тэрыторыі былога сушыльнага заводу, дзе вырабляў гліняны посуд. Са слоў ганчара, справа гэта аказалася не рэнтабельнай і ён спыніў сваю працу.





Пасля гэтага Зайценаў В. некаторы час працаваў кіраўніком гуртка “Кераміка” у Ружанскім шматпрофільным цэнтры па рабоце з дзецьмі, падлеткамі і моладдзю, дзе разам з дзецьмі выраблялі гліняныя цацкі.

Своеасаблівай “візітнай карткай” ружанскіх ганчароў з’яўляўся так званы чорна-глянцавы задымлены посуд. Гэта былі глякі, гарлачы, гладышы для малака, макітры для расцірання маку, жбаны і дуршлагі, “банкі” для крупаў і смятаны, “чашкі і мялачкі”, дзе таўклі бульбу, “бабошкі” для выпякання бабкі.



У аснове гэтага посуду ляжалі простыя геаметрычныя формы – шар, цыліндр і конус. Форма посуду падкрэслівалася глянцавым дэкорам у выглядзе вертыкальных і касых палосак, паралельных прамых ліній, спіральных завіткоў і елачак. Усё гэта выглядала натуральна і вельмі прыгожа. На жаль, цяпер у Ружанах няма такіх майстроў. Застаецца спадзявацца, што з цягам часу ў пасёлку знайдуцца людзі, якія змогуць аднавіць справу ружанскіх ганчароў.

Спіс літаратуры:

1. Беларускае народнае ганчарства / Я.М. Сахута. – Мінск : Беларус. Энцыкл. Імя П. Броўкі, 2013. – 224 с. : іл.
2. Беларускае народнае мастацтва / Я.М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2011. – 367 с. : іл.
3. Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя. Т.4, кн.2. Брэсцкая вобласць/ рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2007. – 608 с.: іл.
4. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка/ рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: “Беларуская Энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі. – 1992. – 449с.
5. Регионы Беларуси: энциклопедия. В 7 т. т.1, кн.2. Брестская область/ редкол. : Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Беларус. Энык л. імя П. Броўкі. – 2009. – 520 с : ил.

БОНДАРСТВА – ДРАЎЛЯНАЕ РАМЯСТВО



Раманоўскі Андрэй
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Роўбіцкі вучэбна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад– базавая школа”
Шыпуль Іна Уладзіміраўна
кіраўнік навукова даследчай работы

… Услон заняў ужо сваё месца,
На ім стаяла дзежка цеста,
І апалонік то і дзела
Па дзежцы боўтаў жвава…
Я.Колас “Новая зямля”

Бо́ндарства — рамяство па вырабу ёмістасцей і посуду з драўляных клёпак.

Бондарства вядома са старажытных часоў. Клёпкі, ўяўляючыя сабой трапецападобныя або выгнутыя падоўжаныя планкі, выраблялі з дапамогай струга, гэбля і гэбліка. Для надання ім увагнутага профілю выкарыстоўвалі скоблі і шархебель. Форму клёпак і бакавы авал вырабу пры зборцы правяралі з дапамогай шаблонаў (модлаў).

Абручы выраблялiся з ляшчыны, дуба і іншых парод дрэваў з дапамогай струга і нажа. Таксама ўжываліся абручы з металу(жалезныя абручы, злучаныя ў кола заклёпкамі). Абручы гнуліся непасрэдна на вырабе або на спецыяльным прыстасаванні — гбале (бабе). Днішча збіралася з дошак і размячалася цыркулем.

Уторны паз для мацавання днішчаў выпілоўваўся спецыяльным інструментам — заторам. У бандарнай справе таксама выкарыстоўваліся і іншыя інструменты і прыстасаванні (нацягуша, чакухі, вяроўкі, ланцугі, кліны і інш.)

У залежнасці ад мясцовых умоў і традыцый і прызначэння бандарных вырабаў, для іх вырабу выкарыстоўвалася драўніна розных парод дрэў (дуб, елка, асіна, вольха і інш.).

У Беларусі першыя бондары з’явіліся ў X—XI стагоддзях і былі практычна ў кожнай вёсцы.

Гэтае старажытнае рамяство атрымала развіццё і доўгі час было ў пашане ў маёй роднай вёсцы Роўбіцк. Мясцовыя гаспадыні ссыпалі збожжа ў вялікія драўляныя бочкі, захоўвалі квас у драўляным посудзе, салілі капусту і агуркі ў кадках і хадзілі даіць кароў з драўлянымі даёнкамі. Раней бондарствам у нашай вёсцы займалася дзясятка два мужчын. Вырабы выкарыстоўвалі ў хатняй гаспадарцы, а таксама збывалі на месцы або везлі на рынкі і кірмашы ў Шарашова, Пружаны.

Час няўмольны. Бондары старэюць, шмат хто пайшоў з жыцця. Аднак у сучасны час у вёсцы застаўся адзін вопытны бондар. Нядаўна майстру бондарнай справы Мікалаю Іосіфавічу Гваю споўнілася 85 гадоў. Але і зараз ён з задавальненнем займаецца ўлюбёнай справай. Яго бочкі, цэбры, ражкі і іншыя вырабы карыстаюцца попытам у наваколлі.

У кожным рэгіёне Беларусі існавала мноства тэрмінаў, назваў прадметаў хатняга ўжытку, звязаных з бондарствам. Да прыкладу, у нашай вёсцы былі свае назвы. Цеста замешвалі у джежках, а масла збівалі ў маслабойках, якія ў нашай мясцовасці называюць біянкамі. Біянкі ў нашай мясцовасці мелі наступныя форму і канструкцыю: вузкая высокая кадачка з клёпак. У накрыўцы пасярэдзіне адтуліна для калатоўкі, верхні канец якой выходзіў вонкі, а да ніжняга прымацоўвалі крыжавіну. Масла збівалі вярчэннем калатоўкі, што прыводзіла ў рух лопасці.

Гаспадыні для захавання прадуктаў харчавання выкарыстоўвалі ражкі і бочачкі. Ражка- скрыня для засолкі сала, мяса. Бочка - посуд для засолкі капусты, агуркоў, для захавання мёду, а таксама для захавання зерня для хатняй жывёлы.

Цэбар - драўляная пасудзіна з двума вушкамі, якой і зараз амаль у кожнай хаце карыстаюцца ў хатняй гаспадарцы.

Балея — гэта лазневы посуд, а таксама ёмістасць для прання.

Найбольш распаўсюджанай прыладай у кожнай хаце былі ночвы. Яны і зараз многімі выкарыстоўваюцца ў гаспадарцы, але не заўсёды па прызначэнню. Ночвы - выдзеўбанае з дрэва карыта, пасудзіна з шырокім адкрытым верхам. Рабілі ночвы з ліпавага або асінавага цурбана, колатага напалову. Нутро выдзёўбвалі цяслой, сценкі і дно згладжвалі разцом. Тыповыя памеры прыкладна: даўжыня 1,5 м, шырыня 50 см, вышыня каля 30 см. У вялікіх ночвах секлі капусту, мяса для каўбас, мылі бялізну, купалі дзяцей, у меншых равейвалі зерне і крупы, у маленькіх таўклі прыправы, мак.

Існавалі свае прыкметы і павер’і пры выкарыстанні ночваў. Пры першым купанні неўмаляткі, ў ночвы клалі 9 вугольчыкаў. На працягу першай паловы года дзіцяці ваду, у якой купалі дзіця, вылівалі ў падпечак. Некаторыя ў ночвы клалі соль і лекавыя травы, сярэбраную манету — каб дзіця расло чыстым, здаровым і багатым.

У некаторых мясцінах Беларусі ночвы ўжываліся пры народным лячэнні дзіцяці ад сурокаў. Дзіця клалі пад ночвы з вадой каля парога хлява і праганялі праз гэтыя ночвы свіней. З ночваў потым мыліся, каб сурокі сышлі. Ночвамі накрывалі хворых пры эпілепсычных прыпадках.

Пятрусь Броўка нават прысвяціў сваім ўспамінам з дзяцінства і гэтай прыладзе верш “Начоўкі”:

Плашку таўшчэзную
Дзёўблі старанна,
Потым сякерай
Правілі лоўка.
Гэтак з’яўлялася
Наша ванна —
Добрыя, ладныя
З дубу начоўкі.

Ну, і было ж нам
У ночвах раздолле —
Двум, нават тром
Там хапала прасторы.
Колькі вады той —
Вядзёр пяць, не болей,
Нам жа здавалася —
Цэлае мора…

…Помню з дзяцінства
Я назаўсёды
Матчыны рукі
І ночавы з дубу.

Майстры — людзі асаблівыя. Яны нешматслоўныя, сціплыя, лічаць, што за іх павінна гаварыць іх справа. Мікалай Іосіфавіч сціпла падзяліўся вопытам па выкарыстанню розных парод дрэў і падрыхтоўкі іх для вырабаў. Ён пазначыў, што кожнай пародзе ў бондара — сваё прызначэнне. Так для салення агуркоў бочка, як правіла, павінна быць з дубу, бо прадукты ў ёй доўга захоўваюцца і маюць выдатныя смакавыя якасці. Для квашанай капусты падыдзе бочка з асіны. Затое для

захоўвання мёду найлепш падыходзіць бочачка-кадушачка з ліпы (ліпа паху не мае). А вось сыравіна з клёну, якая даволі “капрызлівая” да вільгаці, добра паслужыць для ёмістасці для цукру, мукі ці круп. Для сыпкіх прадуктаў і збожжа спатрэбіцца хвоя. Дубовыя клёпкі ў кадках для цеста чаргуюць з хваёвымі. Дуб падыходзіць для лазневага посуду.

Зрабіць бочку — справа тэхнікі, аднак правільна высушаная драўніна вызначае якасць бочкі. Па традыцыі клёпкі для бочак павінны на працягу трох гадоў захоўвацца пад адкрытым небам. Сонца высушвае драўніну, дождж вымывае.

Існавала павер’е: калі выкарыстаць пры вырабе драўлянага посуду меркі заказчыка (сажань, аршын, плячо, далонь), тады прадукт, змешчаны ў посудзе, пачне рэзаніраваць з арганізмам гэтага чалавека. І прынясе яму здароўе і радасць.

У XXI стагоддзі высокіх тэхналогій прыйшло асэнсаванне неабходнасці і каштоўнасці рэчаў дамашняга побыту, створаных рукамі майстра.

А хіба ж не асалода папарыцца ў лазні, замачыўшы духмяны венік у дубовай балеі? А потым абліцца вадой з хваёвага куфля ды выпіць бярозавага соку са зграбнага кубка. А якія смачныя агуркі, засоленыя ў дубовай бочачцы! Вы каштавалі? Калі не — абавязкова пакаштуйце!

КАНОРАВЫ КАРЦІНЫ



Даўгун Вікторыя
ДУА “Валавельская сярэдняя школа”
Драгічынскага раёна
Даўгун Тамара Мікалаеўна
кіраўнік навукова даследчай работы



У кожнага з нас на жыццёвай сцяжынцы - свой лёс, сваё прызванне.

Калі я была яшчэ даволі малой, я часта прыходзіла да сваёй бабулі, з цікавасцю ўглядалася ў карціны і насценныя дываны, якія былі амаль ў кожным пакоі. Бабуля казала, што гэтыя “карцінкі” (так яна іх называла) намаляваў мой прадзед. Яшчэ яна казала, што такіх карцінак вельмі многа, і яны ёсць амаль у кожнай вясковай хаце. Асабліва мне падабаліся карціны з кветкамі. Я нават спрабавала намаляваць такія ж. Успамінаючы гэта я разумею, што карціны майго прадзеда натхнілі мяне ўзяцца за пэндзаль, і цікавілі сваёй незвычайнасцю.

І вось у 2009 годзе я вырашыла больш сур’ёзна даследаваць творчасць майго родзіча. У гэты час і былі сабраны першыя звесткі пра жыццё і творчасць мастака. У выніку атрымалася цэлая навукова-даследчая праца, з якой я, тады яшчэ трэцякласніца Даўгун

Вікторыя і чацвёракласнік Дзмітрук Віталь пад кіраўніцтвам настаўніцы Даўгун Т.М. – выступілі на раённай школьнай канферэнцыі.



Яшчэ тады мы высветлілі, што творы мясцовага жывапісца Ніканора Зосіка меліся ва ўсіх навакольных старых хатах. Дзякуючы родным, блізкім і землякам нам удалося сабраць некаторыя звесткі пра мастака-самавука, а таксама некаторыя яго работы.

У Закозелі, Валаўлі і тутэйшых навакольных вёсках захаваліся дзясяткі яго палотнаў, якія вяскоўцы абагулілі адной назвай –“каноравы карцінкі”. У 2010 годзе мы запрасілі ў госці чалавека, які працуе ў сталічным музеі пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. Дарэчы, ён наш зямляк. Мы перадалі ўсе звесткі, якія на той момант былі намі сабраны. Пазней супрацоўнікі музея прыехалі ў вёску, цікавіліся лёсам мастака, збіралі яго творчыя работы. Мы дапамаглі ім. Абышлі жыхароў тутэйшых навакольных вёсак з мэтай даследавання біяграфічных звестак мастака. Многія яго работы вяскоўцы з задавальненнем перадалі сталічнаму музею. “Няхай усе ўбачаць і даведаюцца пра чалавека, які пакінуў пасля сябе такую прыгажосць!”– казалі вяскоўцы. Былі і такія, што шкадавалі аддаваць палотны, аргументуючы: “Няхай будзе на памяць”. Нямала “каноравых” карцін і на сённяшні дзень ёсць ў хатах яго землякоў. Многія карціны, сабраныя намі, перададзены ў дар музею, дзе яны былі адрэстаўрыраваны.

Яго работы былі прадстаўлены ў сталічным музеі пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. Мне вядома, што запрошаныя на агледзіны супрацоўнікі Музея старажытнабеларускай культуры Акадэміі навук Беларусі аднагалосна пацвердзілі — гэта не прафесійнае, але вялікага таленту мастацтва. На

сённяшні дзень мне вядома, што ўсе работы Ніканора Зосіка, якія мы сабралі, знаходзяцца ў архіве музея.



Ніканор Лявонцьевіч Зосік нарадзіўся 8 сакавіка 1904 года ў вёсцы Гурка Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер — Закозель Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці), што размясцілася на невысокім, парослым хваінамі пясчаным узгорку. Працоўнае жыццё бацькоў, малазямельных шматдзетных сялян, было тагачаснай школай яго выхавання.

Першае знаёмства Ніканора Лявонцьевіча з жывапісам адбылося ў Закозельскім маёнтку Караля Талочкі (20-я гады XX стагоддзя), гаспадарамі якога раней былі прадстаўнікі роду знакамітай польскай пісьменніцы-дэмакраткі Элізы Ажэшкі. Нягледзячы на тое, што Караль Талочка многа часу праводзіў у Варшаве, ён шмат рабіў для добраўпарадкавання закозельскай гаспадаркі, яе пабудоў, упрыгожвання інтэр'ераў палаца. Там юны Ніканор упершыню мог убачыць жывапісныя карціны, што віселі ў панскіх пакоях, назіраць за працай запрошаных мастакоў і пераймаць іх рамяство. Мастак-самавук – так называюць Ніканора Лявонцьевіча яго землякі.

Паводле ўспамінаў нашых вяскоўцаў, з Ніканорам здарылася першая мастакоўская прыгода. Ён намаляваў стозлотавую купюру, якую прынялі за сапраўдныя грошы. Калі ж разабраліся, юнак меў непрыемнасці з ўладамі, але здабыў вядомасць сярод простага люду.

Ніканор Лявонцьевіч быў чалавекам дэмакратычных памкненняў. Назіраючы цяжкае бяспраўнае жыццё сялян, ён спадзяваўся на лепшыя часы. Збіраючыся гуртам ля прыёмніка, маладыя хлопцы і дзяўчаты слухалі савецкія радыёперадачы. Паказваючы рукою на Усход, Ніканор даводзіў непісьменным вяскоўцам, што адтуль, з Савецкай Расіі, прыйдзе вызваленне і новае, шчаслівае для палешукоў жыццё. І яго надзеі напачатку быццам бы спраўдзіліся. У верасні 1939 года ў Гурцы ўсталявалася савецкая ўлада. А вясною 1940 года Ніканор Лявонцьевіч быў абраны намеснікам старшыні калгаса імя Сталіна — першага калгаса на Драгічыншчыне. Аднак хутка пачалася вайна. Разам з жыхарамі навакольных сёл давялося перажыць акупацыю, зведаць нястачу, голад і смерць блізкіх людзей.

Канец вайны прынёс новыя выпрабаванні. Як большасць вяскоўцаў, Ніканор Лявонцьевіч з жонкай Ганнай Кірылаўнай жылі ў невялічкай, крытай саломаю хаціне.



Сяляне, пазбаўленыя элементарных грамадзянскіх правоў, працавалі ад світанку да захаду. За працадні замест платы ім ставілі ў сшытках уліку так званыя «палачкі» альбо адмервалі збожжа, якога нехапала нават для кур. Аднойчы, абараняючы суседнюю шматдзетную сям'ю, у якой адбіралі апошнюю кароўку, Ніканор пачаў абурацца... Увечары па яго прымчаў незнаёмы чалавек, і абаронцу справядлівасці павезлі ў Драгічын. Гэта адбылося вясною 1949-га — у год суцэльнай калектывізацыі на Драгічыншчыне. І толькі ў 1955-м, адседзеўшы свой тэрмін у Казлагу (Казахстан, г.п. Далінка), «зэк» Ніканор Зосік вярнуўся ў родную вёску.

Калі надаралася вольная часіна, Ніканор Лявонцьевіч прысвячаў яе любімаму занятку. Ім напісаны сотні карцін і дываноў розных памераў, сюжэтаў. Вялікае ўражанне на юнака і развіццё мастакоўскіх здольнасцей зрабіла і харство палескай прыроды. Квяцістыя лугі, бруістыя крынічкі, ціхмяныя рачулкі, бярозавыя гаі, птушыны розгалас, прысядзібныя садкі ды кветнікі – усё знайшло адлюстраванне ў паэтычнай творчасці сапраўднага мастака-самавука. Акрамя пейзажаў Ніканор Лявонцьевіч маляваў і нацюрморты, а таксама знайшлося ў яго творчасці немалое месца партрэтам аднавяскоўцаў. Быў напісаны і аўтапартрэт. Нажаль мне не ўдалося яго ўбачыць… Яркія, сонечныя, блізкія па свайму духу народнаму ўспрыняццю прыгажосці, розных памераў і разнастайных сюжэтаў, работы Ніканора Зосіка былі выкананы алейнымі фарбамі на спадручных матэрыялах – кавалках тканіны, цыраты, альбо фанеры. Суседзі, родзічы, сябры, сяляне з навакольных паселішчаў да сённяшняга дня захоўваюць творы таленавітага земляка.

Дзяцей у Ніканора Лявонцьевіча не было. Усё жыццё прайшло ў той самай беднай хаціне. 12 снежня 1981 года ён з мірам адышоў у лепшы свет і пахаваны на могілках ля вёскі Валавель.

Вось што піша пра вясковага мастака-самавука супрацоўнік Музея старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аксана Варатнікова. «...Куст бэзу за акном хаты, зафіксаваны Зосікам, набываў асаблівы настрой. Ружы, лісце, падобнае на экзатычны кактус, фрукты і букеты, букеты...

Канор увасабляў свой свет праз яркія сакавітыя фарбы, якія станавіліся сведчаннем яго шчырага стаўлення да жыцця. Ён быў майстрам — у тым, як клаў каляровы цень на ваду, як збіраў у фіялетавую гаму купы незвычайных кветак, асабліва і па-свойму мадэляваў лістоту, моцна пазначаў акцэнты. Аб'ём ствараўся з умелага ўжывання прыёму кантрасту — з парушэння канона і вынікае творчая манера Ніканора Зосіка. Заўважаеш яго кампазіцыйную "фішку" — паралельнае існаванне рэальных і фантазійных раслін. У ім адначасова жылі і ганчар, і шкларо: пасудзіны, слоікі для кветак, збаны, намаляваныя Зосікам, — незвычайнай, непаўторнай формы. Тэмы яго твораў — блізкія і зразумелыя простаму гледачу рэчы з саду, дому, города. Ёсць экзатычныя кавуны, дыні, грэцкія арэхі...

Выразны, амаль схематычны малюнак садавіны дэманструе повязь з народным мастацтвам: такая яркая дэкаратыўнасць і ёсць галоўная яго прыкмета. Адчуваецца любоў Зосіка да выпісанасці, да мініяцюрных дэталяў. Мы бачым несуразмерна маленькія дамы, фантастычныя кветкі. Мастак нібы імкнуўся ўціснуць у невялікую прастору карціны агромністы свет. Для Ніканора Зосіка мастацтва было адной з найвышэйшых формаў існавання. "Сонечныя зайчыкі" — так хочацца акрэсліць ягоныя мажорныя і радасныя працы.

Яны засталіся ў памяці вяскоўцаў, як "Каноравы карцінкі"... Для Беларусі гэтае імя — адкрыццё».

Аб нашым даследаванні быў надрукаваны артыкул "Светлых мараў дзіўныя палотны" у газеце "Драгічынскі веснік" за 2009 год пад рэдакцыяй Г. Шафран.

Таленавіты мастак-самавук памёр малавядомым. І зорка яго толькі ўзышла…

Невялікая колькасць карцін, была прадстаўлена ў нашай школьнай карціннай галерэі (дадатак 1). На сённяшні дзень я прадаўжаю збіраць творчыя работы майго прадзеда і папаўняю калекцыю работ новымі

творамі мастацтва. У гэтым мне дапамагаюць мае родныя і землякі, класны кіраўнік. Калекцыя карцін знаходзіцца ў архіве школы. І пры неабходнасці ў нашай школе праводзіцца экскурсія па карціннай галерэі.

Драгічынскі раён багаты на таленавітых людзей. Асаблівую павагу, на мой погляд, выклікаюць майстры-самавучкі, здольныя са звычайных рэчаў зрабіць нешта чароўнае, ствараць сапраўдныя шэдэўры. На жаль, многія з іх так і засталіся ў памяці толькі самых блізкіх людзей. Сваёй работай хочацца адкрыць усім беларусам яшчэ аднаго малавядомага, але таленавітага мастака-самавука, які прызнаны лепшым мастаком-самавукам 20-га стагоддзя.

КУКЛА ИЗ ГЛУБИНЫ ВЕКОВ



Шастаковіч Анастасія
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Гімназія №2 г. Пінска”
Казачук Вольга Мікалаеўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Каждое лето я провожу у своей бабушки в д. Яглевичи Ивацевичского района. В гости я еду не одна, а со своими любимыми куклами. Бабушке не нравятся мои куклы. Она не понимает, как с ними можно играть. Разве только наряжать! Бабушка рассказала, что в детстве она играла в куклы, которые делала сама из старых тряпочек, и ни за что не променяла бы свою куклу на современную красавицу.

Мне захотелось побольше узнать о самодельных бабушкиных куклах и освоить технологию их изготовления. Я начала работу над исследовательским проектом **«Кукла из бабушкиного сундука».**

Цель: определить значение тряпичной куклы в жизни белорусов.

Задачи:

- узнать об истории возникновения тряпичной куклы;
- собрать информацию о куклах-самоделках;
- научиться делать тряпичные куклы;
- выявить связь между стародавними и современными традициями, связанными с использованием тряпичных кукол;
- определить отношение современных детей к самодельной кукле.

Объект исследования – народная игрушка.

Предмет исследования – тряпичная кукла.

Гипотеза №1: полагаю, что тряпичная кукла не просто игрушка, а часть культуры наших предков.

Гипотеза №2: ребёнку для развития нужны не только современные куклы, но и куклы-самоделки.

Методы исследования:

- изучение теоретического материала по теме;
- метод сбора и систематизации данных;
- метод сравнения и обобщения;
- интервью;
- устный опрос;
- анкетирование.

Глава 1. Кукла из глубины веков

1.1. История возникновения тряпичной куклы

Одной из первых игрушек, которую создал человек, была кукла. В каждой семье из поколения в поколение дети играли с этой игрушкой. Наши предки были очень изобретательные. Они изготавливали кукол из того, что попадало под руку (дерево, плоды, цветы, камыш, солома, трава, глина, пепел, хлебный мякиш, тесто, кости и др.). Но самой распространенной была тряпичная кукла.

Раньше тряпичных кукол не продавали и не покупали, их делали сами или получали в подарок. Научит мать или бабушка старшую дочку в семье делать тряпичных куколок из домашних лоскутков и точно знает, что младшие дети теперь всегда будут с игрушками. Старшие всегда делали тряпичных кукол для младших, девочки делали для мальчиков, подружки дарили друг другу, в гости приходили с тряпичными куколками и обменивались ими.

В далеком прошлом домашние тряпичные куклы сопровождали человека от рождения до смерти, оберегали его, участвовали в обрядах и праздниках. Каждая тряпичная куколка имела свою миссию, свой определенный смысл.

Если хотели уберечь семью от болезней — делали тряпичных **кукол «Лихоманок»**. Если хотели пожелать невесте в день свадьбы скорого рождения детишек — делали **куклу «Пеленашку»**. Хотели сохранить силу лучшего зерна осеннего урожая — делали **«Зерновушку»**. В помощь хозяйке – тряпичную **куклу «Десятиручку».** Младенца укачивали с **куклой «Кувадкой»,** а развлекали тряпичным **«Зайчиком на пальчике».** Весной делали тряпичную **куклу «Веснянку»,** а летом – **«Кубышку-травницу»** *(см. прил.1)*.

1.2. Как из бесформенного лоскута рождалась кукла

Наши предки были мудрыми людьми, и нам надо обязательно перенять их опыт. Это только на первый взгляд стародавняя кукла очень простая, но в этой простоте прячется большая загадка. И чтобы разгадать ее, я отправилась в «гости» к тряпичной кукле.

Для начала я решила узнать, в какие куклы играли мои прабабушки.

К сожалению, моей прабабушки по маминой линии **Пытляк Варвары Антоновны** (1910г.) уже нет в живых. К счастью, сохранился её рукописный молитвенник. Вот там я и нашла молитвы *«От Бессонницы»* и *«От Ночниц» (см. прил.2).* Оказывается, для того чтобы

успокоить и защитить ребенка от злых духов, наши предки делали **куклу «Бессонница».** Куклу-оберег скручивали из двух лоскутов, к рукам прикрепляли узелок с сухими травами, которые успокаивали (мята, мелисса). Когда младенец плохо спал, ему клали такую куклу в колыбель и читали молитву.

Ещё наши предки считали, что когда младенец плачет или бодрствует ночью, его беспокоят Ночницы – злостные привидения-женщины, которые прилетают через окно. Поэтому многие матери делали **куклу «Ночницы».** Так вот, в прабабушкиной тетради я нашла молитву, которую читали от тех самых Ночниц *(см. прил.3)*.

Затем я оправилась д. Кривичи (Пинский р-н) к моей прабабушке по папиной линии **Шостакович Софье Петровне** (1926г.). Вот что она мне рассказала: " *Ти с бульбинки, ти с трапак скручвали головку. Робили ручки с киечков. Обгортвали ножки. А потым обкручвали хоришэйшэй трапкой. Очки робыли вугулем ти карандашом. Дэй и вся кукла!"*

Дальше за помощью я обратилась к своим соседям.

Лозюк Раиса Ксенофонтовна (1956г.), уроженка д. Нечатово (Столинский р-н), рассказала о том, как делала своих кукол. "У *старую анучку лажили камушак и перавязвали ниточкой. Это была голова. Лицо мазали сапухою (сажею). Для рук брали палочку, якую абкручвали трапачками. Талию перавязвали ниткой и разделяли ноги…".*

А **Татьяна Ивановна Внучка** (1981г.), уроженка д. Лемешевичи (Пинский р-н), вспомнила, как ее мать Лира Евгения Михайловна (1949г.) рассказвала, что голову тряпичной куклы наполняли маком. Ребенок, который сосал такую игрушку, был спокойным и хорошо спал.

Информации о бабушкиных самодельных куклах удалось собрать совсем немного, и я решила провела опрос учащихся II-VIII классов гимназии.

Засим Анна, учащаяся VIII «А» класс, сказала, что мне может помочь её бабушка Атливанова Мария Антоновна (1921г.р.), уроженка д.Гребень (Житковичский р-н, Гомельская обл.). Я встретилась с Марией Антоновной и вот что узнала:

"*Когда я была малая, то гуляла с куклой "Галышек", которую робила мне моя мама. Она брала старый лапик, голову набивала куделею или материей, перемотвала её, робила ручки, а подол делила на две части и обмотвала нитками – так получались ножки. Кукла была голенькой, без адежды, но пояс был всегда, потому что был оберегом от сглаза".*

После этого я обратилась за помощью к работникам гимназии.

Козачук Ольга Николаевна, учитель изобразительного искусства, рассказала, что у её мужа Владимира Васильевича Козачука

(1967г.р.) в машине, в «бардачке», лежит очень старенький узелок, который считается оберегом. Я встретилась с Владимиром Васильевичем и лично убедилась в существовании оберега. Это был маленький узелок из льняной тряпочки. Внутри его находится просфора и ниточка с 12 узелками, которые завязывались во время чтения Евангелия. Сделала оберег бабушка Владимира Козачук Мария Георгиевна (1911г.р.), жительница д. Лумна (Каменецкий р-н).

Из Интернета я узнала, что у наших предков существовала кукла-оберег «Подорожница». Куклу делали в виде женщины с узелком в руках. Предназначалась она только для мужчины, который отправлялся в дорогу.

Владимир Васильевич рассказал мне ещё и о том, что маленькому ребенку, чтобы он не плакал, давали в руки куклу «*из тряпочки простой работы*», а головной узелок наполняли пережеванным с сахаром или медом хлебным мякишем. Такая кукла не только развлекала, но и кормила. Рассказала ему об этом его бабушка Ярмолович Мария Васильевна (1920г.р.), жительница д. Бардзёвка (Каменецкий р-н).

Козачук Ольга Николаевна посоветовала мне обратиться к её маме **Чолык Лидии Григорьевне** (1951г.р.), уроженке д. Горбаха (Ивановский р-н). И вот что я узнала: “ *Для подарунка на именины робылы ляльку "Онёлычок". Гэта нэмудрагелиста, алэ вэльмы хорошая лялька! Яе выроблялы, маючы под рукою тилькы тры квадраты пэркалёвай ганучкы и чырвоныя нытки. З самого вылыкого квадрата робылы голову и тулово,с двух мэньшых – крылы.*”

За время работы над проектом мне удалось познакомиться со многими людьми, которые помнят, с чем играли дети до появления «пластмассового счастья». Но, к сожалению, я смогла восстановить только небольшую часть сведений о тряпичной кукле. Чаще всего информация большинства опрошенных не представляла собой никакой ценности для моего исследования.

Глава 2. Новый взгляд на старинные обычаи

Тряпичные куклы пережили не одно поколение. Они часто сопровождали многие крестьянские праздники и обряды, которым уже не менее 5-6 тысяч лет, и дошли до нас уже в изменённом виде.

Мне захотелось узнать, какие традиции, связанные с тряпичной куклой, сохранились до наших дней. Я сравнила стародавние и современные традиции, и вот что у меня получилось (*см. прил.4*)

Проанализировав связанные с тряпичной куклой традиции наших предков, я пришла к выводу: все обычаи изменились и утратили свою главную обереговую функцию. Одни куклы стали модной игрушкой

(«Кувадки»), другие – предметом интерьера («Домовой») или кухонной утварью (“Каша”), третьи превратились в шуточную церемонию («Полено»). Некоторые традиции дошли да наших дней, но уже без сопровождения куклы «Купавки», «Вербной», «Симеона Столпника», «Всемирного дерева». Многими обычаями и традициями мы пользуемся на протяжении многих лет, но даже не задумываемся об их первоначальном предназначении *(см. прил. 5)*.

Глава 3. Заграничная красавица или кукла из бабушкиного сундука?

«Мода на куклу» существовала издавна. В каждой семье дети из поколения в поколение играли с куклой. Я решила провести анкетирование и определить, какие куклы популярны сегодня, играют ли современные девочки с самодельными куклами, знают ли они, с какими куклами играли их бабушки и прабабушки. В анкетировании участвовало 100 учащихся II-VIII классов *(см. прил. 6)*.

3.1. Кукла «Барби»

89% опрошенных детей играет с куклой и сегодня. Девочки предпочитают современных кукол (у некоторых их насчитывается более 20 штук). Самым большим спросом пользуется кукла «Барби», за которую отдали свой голос 63% девочек. И это не случайно. Она – мечта и идеал каждой девочки. Продажи куклы «Барби» считаются самыми высокими в мире по сравнению с реализацией других игрушек.

Однако детские психологи утверждают, что «Барби» – неудачная игрушка. В идеале кукла должна представлять собой младенца, а не взрослого человека. «Барби» не подходит для того, чтобы за ней ухаживали, кормили, укладывали спать. Играя с куклой, её можно только одевать или раздевать, а так же пользоваться всем тем, что для неё создано (дом, мебель, бассейн, автомобиль и т.д.). Главная же функция игрушки – развивать способности ребёнка, пробуждать его фантазию. А когда она все сама умеет, ему остается только наблюдать за ней.

3.2. Кукла-самоделка

Мне стало интересно, играют ли современные дети, разбалованные дорогими красавицами, с самодельной куклой. Оказывается, только 42% девочек использует в своих играх куклы,

сделанные из ткани, ниток или бумаги. А вот о бабушкиных тряпичных куклах знает всего 9% опрошенных.

На вопрос: «*Зачем нужны куклы*?» – 99% детей ответило: «*для игры*» или «*для развития ребёнка*». Только одна девочка ответила, что куклу можно использовать в качества оберега. Как видно, в наше время кукла уже не выполняет свою первоначальную функцию, а является только средством гармоничного развития ребёнка или просто развлечением.

3.3. Достойная альтернатива современным куклам

Я решила сравнить тряпичную куклу наших предков и куклу массового производства и определить, какая кукла лучше. Вот к какому выводу я пришла. Традиционная лоскутная кукла является отличной альтернативой современным пластиковым игрушкам и имеет больше преимуществ, чем недостатков:

- она является оберегом;
- кукла «безликая», это позволяет выдумывать настроение куклы и ее характер;
- кукла-самоделка индивидуальная в своем роде, её сложно повторить ещё раз;
- игра с такой куклой учит девочку проявлять любовь и заботу к близким;
- создание куклы воспитывает терпение, аккуратность, развивает эстетический вкус и дизайнерские способности;
- самодельную куклу можно использовать как сувенир или как предмет интерьера;
- куклой можно лечить (за счет работы кончиков пальцев улучшается работа головного мозга, снимается переутомление, поднимается настроение);
- для создания куклы используются только природные материалы (лен, хлопок, шерсть);
- создание совместной игрушки – отличный способ для взрослых сблизиться с ребёнком.

Посетив торговые точки города: «Буратино», «Буслік», «Товары для дома», рынки по ул. Ленинградской и ул. Звездной, я установила, что цена на куклы составляет от 35 000 до 835 550 рублей. Может, не стоит спешить идти в магазин за модной и дорогой игрушкой, а взять и попробовать сделать куклу из ткани своими руками, чтобы почувствовать, какая она «теплая», чтобы дотронуться к прошлому своих предков.

Для тех, кто захочет овладеть секретами создания тряпичной куклы, я разработала рекомендации-подсказки *(см. прил. 7)*.

Среди недостатков современных кукол я бы выделила следующие:

- такие куклы не индивидуальные (они внедрены в массовое производство);
- современная игрушка является только развлечением, не приучает детей к работе, рукоделию;
- куклы изготавливаются из материалов неестественного происхождения, поэтому не обладают магической энергетикой и «теплом души».

Заключение

Закончив работу над проектом, я могу сказать, что цель и задачи исследовательской работы достигнуты. Я узнала об истории возникновения тряпичной куклы и о том, какое место она занимала в жизни наших предков. Определила, что многие традиции, связанные с куклами, дошли до нашего времени. Узнала, в какие куклы играли наши бабушки и прабабушки, и приобрела навыки изготовления старинной игрушки. Выяснила, что современные дети предпочитают пластиковую куклу, несмотря на то, что тряпичная кукла по своим развивающим качествам имеет больше преимуществ.

Мои гипотезы полностью подтвердились. Кукла наших предков не просто игрушка, это часть истории и культуры нашей страны. Ценность самодельной игрушки ещё и в том, что она является уникальным предметом для развития ребёнка. Не зря наши предки считали, что *ребенок к четырем годам должен играть с «теплой» игрушкой, чтобы не «простудить» душу***.**

Учитывая то, что на территории Беларуси существует только один музей, в котором есть коллекция кукол, исполненных по народным традициям и технологиям (экомузей в д. Стреньки Гомельской обл.), я предложила Козачук О.Н., руководителю музея «Спадчына», открыть новую экспозицию – «Народная тряпичная кукла». Горжусь, что часть кукол в этой экспозиции сделана моими руками. В дальнейшем я планирую стать экскурсоводом музея и лично проводить мастер-классы по созданию тряпичных кукол. Для этого мне нужно успешно сдать вступительные экзамены в V класс. И я рассчитываю не только на собственные силы, но и на помощь куклы-оберега «Желанница»!

Список теоретических источников

1. Жук, Н. Кукла на счастье / Н. Жук // Беларускі час. – 2011.
2. Мартинович, Л.С. Народная культура Беларуси. Энциклопедический справочник /под общей редакцией В.С.Титова. Мн.: Белорусская энциклопедия, 1994.
3. Ракова, Л.В. Традиции семейного воспитания в белорусской деревне / Л.В. Ракова. Мн.: Урожай, 2000.
4. Терешкович, Т.А. Кукла белорусская/ Т.А. Терешкович. Мн.: Полымя, 1992.
5. Этнография Беларуси: энциклопедия / Редколлегия: І.П. Шамякин (гл. ред.) и др. Мн.: БелСЭ, 1989.
6. Каких *кукол* делали наши предки и чем они кардинальноотличались от современных игрушек. http://*www.ctv.by* › Большой завтрак › Дети.
7. Куколки-лихоманки и *белорусский* декор. http://*www.ctv.by* › Большой завтрак › *Хобби.*
8. Персональный сайт - Славянские *куклы*-обереги. http://iara-z*m.narod.ru/index/0-560*

ПРИЛОЖЕНИЕ 1





Пеленашка

Каша

Лихоманки



Неразлучники

Кувадки





Кубышка-травница

Десятиручка

Берегиня

Зайчик на пальчик

Зерновушка

Веснянка

ПРИЛОЖЕНИЕ 2







Чолык
Лидия Григорьевна

Шостакович
Софья Петровна

Атливанова
Мария Антоновна

Ярмолович
Мария Васильевна



Козачук
Мария Георгиевна

ПРИЛОЖЕНИЕ 3

Лозюк
Раиса Ксенофонтовна



Зоркі-зарыцы, красныя дзявіцы. Святы дзень, Божы дзень. Ішла Прычыстая Божая Маці

Молитвы от Бессонницы

Святы дзень, Божы дзень. Ехалі тры паненкі на лукошку. Бяссонніцу бралі, у полукашок клалі. Бярэце, вязеце ў чыстэ поле, дзе вецер не вее, дзе сонца не грэе. Хай птушкі грабуць і крыламі разнясуць. Божая Маці, прыступі, на сухія лозы разнясі.

Молитва от Ночниц

Зоркі зарыцы, краевыя дзявіцы. Ішла Прычыстая Божая Маці Начніцы адганяць. Ад белае касці, ад чырвонае крыві, ад сініх жыл. З плячэй, з грудзей, з усіх касцей, з галавы, з белага ліца* (назвывается имя ребёнка*). Ідзеце, Начніцы, дзе куры сядзяць. Хай куры грабуць, дзяўбуць і крыламі разнясуць. Божая Маці, прыступі, памажы, на пусты вецер разжані.

ПРИЛОЖЕНИЕ 4

№ п/п	Стародавняя традиция	Современная традиция
1.	Первая кукла наших предков – **«Скрутка»**. Скрученная по рукам и ногам, такая кукла была недоступной для вселения злых сил.	Пеленание новорожденных.

2.	Кукла **«Пеленашка»** посередине перетягивалась красным поясом, так как пояс считался главным оберегом от дурного глаза.	Новорожденных, которых забирают из родильного дома, перевязывают синими (голубыми) и красными (розовыми) поясами-ленточками.
3.	Чтобы злые духи не причинили новорожденному вред, в колыбель клали **тряпичную куклу**. До обряда крещения именно кукла принимала на себя все неприятности, которые угрожали младенцу.	Многие дети спят с любимой игрушкой.
4.	Над колыбелью ребёнка подвешивались куклы-обереги **«Кувадки».** В первую очередь, люди бросали взгляд на куклы и тем самым оставляли сглаз на них. Чтобы избавится от сглаза, «Кувадки» три раза поворачивали против часовой стрелки, при этом читали молитву.	Над кроваткой малыша подвешивают музыкальную карусель.
5.	Кукла **«Полено»** считалась семейным оберегом. Такую куклу принято было дарить невестам.	В некоторых местностях молодожёнам дарят украшенное лентами полено с пожеланием: *«Дарю полено, чтобы молодой поцеловал молодую в колено».*
6.	Под дугой лошадиной упряжи свадебного «поезда» подвешивали кукол-оберегов **«Неразлучники»,** которые отводили от молодожёнов недобрые взгляды.	Свадебные машины украшаются куклами, мягкими игрушками, цветочными композициями.
7.	**«Всемирное дерево»** – палочка-рогатина, украшенная фигурками «Жениха» и «Невесты», которую помещали в центр свадебного каравая.	Свадебный каравай украшается веточками, отделанными тестом и цветами.
8.	14 сентября наши предки отмечали Новый Год. На площади вкапывали столб, к которому прикрепляли куклу **«Симеон Столпник».** У кого получалась залезть на	На Масленицу, а в некоторых местностях и на Ивана Купала, мужчины соревнуются в

	столб и снять куклу, тому доставалось всеобщее уважение и почет.	ловкости: залезают на столб и пытаются снять приз.
9.	Куклу **«Масленица»** делали в человеческий рост из соломы или лыка, закрепляли на крестовине из дерева, украшали лентами, искусственными цветами. На руки ее устанавливали посуду, которую использовали для приготовления блинов, завязывали тесемки и загадывали желания. А чтобы они сбылись, куклу сжигали.	Чучело «Масленица» – неотъемлемая часть современных народных гуляний.
10.	**«Вербная»** кукла делалась специально для детей. Именно с ней они ходили за вербой. Считалась, что такая кукла освящает веточки перед Вербным воскресеньем.	В Вербное воскресенье принято слегка бить освященной веточкой вербы, приговаривая: *“Не я б’ю - вярба б’е! З тыдзень – Вялікдзень!..”*
11.	На праздник Ивана Купала не обходились без **«Купавки».** Эту куколку с мини-букетиками лекарственных растений сплавляли по воде вместе с купальскими веночками, чтобы она забрала все болезни, беды и несчастья.	Во время праздника Ивана Купала девушки пускают веночки.
12.	Кукла **«Домовой»** заботилась о домашнем очаге, уюте и благосостоянии.	Кукла «Домовой» используется для украшения интерьера.
13.	Неопытная хозяйка во время приготоления пищи приставляла к горшку куклу “**Каша”.** Крупы нужно было насыпать до колена, воды налить до пояса – каши получится по самое горлышко.	Использование мерного стаканчика для приготовления пищи.

ПРИЛОЖЕНИЕ 5

































ПРИЛОЖЕНИЕ 6

Итоги анкетирования

№ п/п	Вопросы	Ответ «да»	Ответ «нет»
1.	Любишь ли ты играть с куклой?	89	11
2.	Сколько у тебя кукол? *- от 1 до 11* *- от 10 до 20* *- более 20*	 81 13 6	-

3.	Какая твоя самая любимая кукла? - *«Барби»* - *«Братц»* - *«Мокси»* - *«Винкс»* - *«Монстр Хай»* - *пупс* - *свой вариант*	 63 3 7 2 6 2 6	 11
4.	Как ты думаешь, зачем нужна кукла? - *для игры* - *для развития* - *свой вариант* - *не знаю*	 72 27 - 1	
5.	Была ли у тебя самодельная кукла?	42	58
6.	Из чего она была сделана? - *ткань* - *нитки* - *бумага* - *свой вариант*	 8 4 22 8	
7.	Знаешь ли ты, с какой куклой играли твои бабушки и прабабушки?	9	91

ПРИЛОЖЕНИЕ 7

ПОДСКАЗКИ-СОВЕТЫ ДЛЯ НОВИЧКОВ
ПО СОЗДАНИЮ ТРЯПИЧНОЙ КУКЛЫ

- Нельзя делать куклу в плохом настроении, в праздничные и выходные дни, в среду и пятницу, ночью.
- Куклы делаются только из старых лоскутов натуральных тканей (льняной, шерстяной, хлопковой).
- Делается кукла в один приём.

- Ткань измеряется руками – по длине пальца, ладони, руки до локтя.
- Ткань нельзя отрезать ножницами, только рвать руками по прямой нитке.
- Нитки обрывают или откусывают.
- Запрещается использование иглы.
- Кукла должна быть «безликой».
- Для основы куклы (белья) используется ткань только белого цвета, для одежды – традиционные цвета: белый, красный, чёрный.
- Запрещается куклу портить и выбрасывать.



СПАДЧЫНА ПРОДКАЎ. ЯК ВАЛЯЦЬ ВАЛЁНАКІ?

Каўганка Антон
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Імянінская сярэдняя школа ”
Драгічынскага раёна
Бярэзні Таццяна Віктараўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Не чаравікі, не боцікі,
Але іх таксама носяць ножкі.
У іх мы бегаем зімой:
Раніцай - у школу,
Днём - дадому.
(Валёнкі)

«Усё ў свеце вяртаецца на кругі свая», гэтак жа і мода на валёнкі. І тут нават не важна, што вы носіце - хупавы кажушок або спецвопратку, ад камфорту нікому не хочацца адмаўляцца. Сёння гаворка пойдзе не пра калье з смарагдамі і нават не пра ланцужок або завушніцы. Сёння я распавяду вам пра ... валёнкі. Так-так, вы не недачулі, менавіта пра валёнкі.

Наперадзе, я паставіў мэту: даследаваць значнасць валёнак ў жыцці народа.

З пастаўленай мэты вынікаюць наступныя задачы:

1. Ацаніць стаўленне да валёнак настаўнікаў, бацькоў, вучняў нашай школы
2. Высветліць, калі і дзе з явіліся першыя валёнкі
3. Вывучыць працэс вырабу валёнак
4. Ацаніць ролю валёнак ў сучасным свеце

Была вылучана гіпотэза: у XXI стагоддзі валёнкі вяртаюць да сябе народную любоў. Метады даследавання: інтэрв’ ю, апытанне, вывучэнне навуковай і мастацкай літаратуры па тэме, праца з інфармацыяй інтэрнэту, аналіз, сістэматызацыя, абагульненне.

Сваё даследаванне я пачаў з наведвання бібліятэкі, сустрэч з старшынямі сельвыканкамаў, жыхарамі вёсак Імянін, Татар’ я, Брашэвічы, Гумнішчы, Аляксеевічы, Леснікі, правёў анкетаванне сярод настаўнікаў, бацькоў, вучняў.





З слоўніка Уладзіміра Даля я даведаўся, што «Валёнкі - род чаравікаў або ботаў, званых з воўны». Першую гістарычную згадку пра валёнкі можна аднесці да дванаццатага стагоддзя, і звязана яно са “Словам пра паход Ігараў”.

У нашай краіне валёнкі як такія атрымалі распаўсюджванне ў XIX стагоддзі. Аднак валены абутак вядомы на Беларусі з часоў сярэднявечча. Пра гэта сведчаць археалагічныя знаходкі: пры раскопках у Гродна быў знойдзены валены абутак з скуранымі ўстаўкамі.

Я вывучыў працэс вырабу валёнак на Смілавіцкай фабрыцы. Тут даўным-даўно катаюць авечае руно, ператвараючы яго ў самы старажытны абутак на Зямлі - валёнкі. І што цікава: за тысячы гадоў яны амаль не змяніліся, ды і робяць іх да гэтага часу ўсё гэтак жа, уручную.

Выраб валёнак ў хатніх умовах

Бярэцца пэўную колькасць гатовай воўны і дзеліцца на дзве аднолькавыя часткі - для адной нагі і для другой. Затым іх узважваюць, каб яны былі аднолькавымі: 

Потым раскладваюць воўну па выкрайцы для першай ногі:



затым раскладваюць для другой ногі і параўноўваюць яе з першай:



Па чарзе здушваюць воўну кожнай ногі, каб з ёй зручна было працаваць:



Бяруць воўну адной нагі і навязваюць яе на выкрайку:



Атрымліваецца вось так:



Затым счапляюць шэрсць на самаробным станку:



Атрымліваецца вось такая нарыхтоўка валёнка



Гэтак жа праробліваюць з другой нагой і атрымліваюць пару:



Потым іх звальваюць. Бяруць нарыхтоўку па адной і трымаюць у гарачай вадзе:



Выціскаюць і выкладваюць на стол для валяння:



Валяюць. Для параўнання: злева першапачатковая нарыхтоўка, а справа - валяная нарыхтоўка, але яшчэ не да канца:





Даваліваюць яе з дапамогай інструментаў: І атрымліваюць вынік: злева валяная нарыхтоўка, справа - першапачатковая:



Гэтак жа валяюць іншую нагу і атрымліваюць:

Спалоскваюць зваляныя валёнкі ў вадзе:

Забіваюць калодкі

І ставяць сушыцца

Пасля выцягваюць калодкі і валёнкі гатовыя! Вынікі вось такія:





Майстры маёй малой Радзімы

Я пабываў у Імянінскім, Брашэвіцкім, Немяржанскім сельвыканкамах. Мне ўдалося знайсці некалькі адрасоў такіх майстроў.

У сям'і пенсіянера Малайчука Сяргея Сцяпанавіча, 1933 г.н., жыхара в. Татар'я, валяў валёнкі не толькі ён, але і жонка і сын.

Мацука Дзмітрый Кандрацьевіч, 1930 г.н., жыхар в. Татар'я, распавёў мне, што валяных валёнкі не цяжка, але вельмі працаёмка. Дзмітрый Кандрацьевіч і цяпер у доме ходзіць у валёнках з кароткімі халявамі, а з першым снегам валёнкі з'яўляюцца для яго каханым абуткам.



Місіевіч Соф'я Сцяпанаўна, 1940 г.н., жыхарка в. Аляксеевічы, распавяла пра тое, што яшчэ яе дзед Іван Сцяпанавіч займаўся вытворчасцю валёнак. Потым гэта рамяство ён перадаў яе бацьку Сцяпану Цімафеевічу, а яна, будучы дзіцем, назірала, як бацька валяў валёнкі.



Ветэран Вялікай Айчыннай вайны Салавейка Мікалай Іванавіч, 1922 г.н., жыхар в. Аляксеевічы, у сваім аповедзе распавёў мне, што для таго, каб вырабіць валёнкі самага маленькага памеру, спатрэбіцца не менш за 0,5 кг воўны, а на валёнкі самага вялікага памеру каля 5 кілаграмаў.

 Крупко Мікалай Сцяпанавіч, 1923 г. н, жыхар в. Гумнішчы, таксама займаўся вырабам валёнак.  Яго жонка, Соф’я Паўлаўна, паказала мне прыстасаванні для вырабу валёнак.

 З 1952 па 1969 валяў валёнкі Барысюк Пётр Якаўлевіч, 1927 г.н., жыхар в. Татар’я. Пётр Якаўлевіч мне распавёў, што раней валёнкі каштавалі вельмі дорага, і дазволіць сабе такую раскошу маглі толькі заможныя людзі. Валёнкі былі дарагім падарункам, іх перадавалі па спадчыне. Вось чаму ён мяне навучыў.

Спачатку воўну ўзважваем 

выразаем выкрайку 

раскладваем шэрсць на палатно 

змочваем цёплай вадой 

закладваем на выкрайку



згортваем 

счапляем воўну 

даваліваем з дапамогай інструментаў 

спалоскваем валёнкі ў вадзе 

падбіраем калодку 

забіваем клінкі 

ставім у печ сушыць 

і ... валёнкі гатовыя !!! 

Мода на валёнкі

У апошнія некалькі гадоў валёнкі набываюць статус моднага абутку. Мяне зацікавіла пытанне, ці можна купіць валёнкі ў нашых крамах. Я наведаў крамы «Універмаг», «Дзіцячы свет» г. Драгічына, «Прамтавары» аг. Брашэвічы і інш. У продажы маюцца валёнкі.

Пасля наведвання крам, я вырашыў правесці невялікае апытанне і даведацца, ці носяць валёнкі цяпер. У вёсцы попыт на валёнкі бесперапынна расце. У нашай вёсцы носяць валёнкі і дзеці, і дарослыя, і старыя.

Заключэнне

Такім чынам, вывучыўшы гісторыю валюшнага промыслу, пазнаёміўшыся з тэхналогіяй вырабу валёнак, сустрэўшыся з людзьмі, якія займаліся гэтай здабычай, правёўшы анкетаванне, я высвятліў:

- з 92 апытаных валёнкі ёсць ці былі ў дзяцінстве ў 68 чалавек;
- З 24 работнікаў школы 11 чалавек па-ранейшаму носяць валёнкі ў халодную пару года;
- З 84 апытаных бацькоў 57, даведаўшыся пра карысць валёнак для здароўя, хацелі б набыць гэты выдатны абутак для сваёй сям’і. Вылучаная мною гіпотэза пацвердзілася.

Па-першае, сёння на першы план выходзяць праблемы экалогіі і здароўя. А валёнкі - абутак, зроблены з натуральных матэрыялаў без страт для прыроды і жывёл.

Па-другое, медыцына пацвярджае гаючыя ўласцівасці абутку.

Па-трэцяе, валёнкі зноў набываюць статус моднага абутку.

Катовіч Анастасія
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Іванаўскі раённы цэнтр дзіцячай
творчасці ” гурток “Памяць”
Раманюк Валянціна Аляксандраўна
кіраўнік навукова даследчай работы

Жыватворная сіла народных промыслаў

Карані сучаснай культуры, народных промыслаў ідуць з глыбіні сівых часоў, аднак можна з упэўненасцю сказаць, што і цяпер мы можам дакрануцца да яе вытокаў. Дзе іх шукаць? Дык у сялянскай хаце з шырокай печчу, драўлянымі лавамі і абразамі ў чырвоным куце, у памяці сваіх дзядуль і бабуль, сярод старажылаў-аднавяскоўцаў.

Сустракаючыся з аднавяскоўцамі, чыё жыццё было непасрэдна прысвечана народным промыслам, неаднаразова з’яўлялася думка: чалавек адчувае сябе маладым, энергічным, самастойным, пакуль у ім жыве памяць, калі ён дзеліцца ўспамінамі, калі ён бачыць зацікаўленнасць у сваім занятку з боку маладога пакалення. Напачатку, калі прыходзілася звяртацца да аднавяскоўцаў з просьбай рассказаць аб сваіх уменнях, суразмоўцы здзіўляліся – няўжо гэта вам цікава? Але ж як змяняліся іх вочы, калі яны пачыналі гаварыць, тлумачыць, паказваць! Бывала, слухаючы іх споведзь, можна было адчуць, як іх думкі ляцяць некуды далёка, а перад вачыма з незвычайнай выразнасцю паўстаюць малюнкі падзей мінулага.

З ранняга дзяцінства ў мяне засталіся ўспаміны аб тым, як мая бабуля Палашка прала кудзелю, ткала палатно, вышывала ручнікі. Працуючы, яна вельмі часта спявала, або проста распявадала аб нечым, і словы яе гучалі на дзіва мякка, музычна, спеўна. Дзядуля Аляксандр пастаянна завіхаўся ў двары: нешта стукаў, кляпаў, плёў. Мне здавалася, што яны – майстры на ўсе рукі. Быццам з дапамогай чароўнай палачкі яны могуць усё: “зрабіць” тканіну і пашыць з яе розныя ўборы, звычайныя дошкі ці кусок жалеза ператварыць ў бочку ці мудрагелістую агароджу. І самае галоўнае, яны гэта рабілі з ахвотай і задавальненнм. Уменне ўсё гэта рабіць заўжды ўспрымалася як само сабой разумеючае. Было сорамна не ўмець рабіць.

На жаль, сёння народныя промыслы ва ўяўленні многіх існуюць як элемент мінулага. У нейкай ступені гэта сапраўды так, бо зараз адпала неабходнасць у самастоўным вырабе прадметаўбытавога

ўжытку. Навуковы прагрэс аблегчыў працу чалавека.Навошта апрацоўваць лён, ткаць палатно, калі можна купіць гатовую тканіну і гатовае адзенне? Навошта ляпіць гаршкі, вырабляць дзежкі і цэбрыкі, калі ў магазіне поўна самага рознага посуду?

Сёння чалавек ледзь паспявае ўспрымаць усе вынаходніцтвы тэхнічнага прагрэсу. Жыццё людзей значна аблечылася, тэхніка працуе на чалавека. Але парадокс: людзі зрэдку знаходзяць хвілінку для шчырых зносін. Між тым, раней праца не аддаляла людзей, а наадварот, збліжала. Удумаемся ў назву- народныя промвслы, народныя, значыць значыць, для народа,на карысць народа. Народныя ўмельцы ўкладвалі ў сваю працу частку душы-шчырай, спачувальнай, спагадлівай. Гэтая праца была крыніцай існавання сям'і, важнай ўмовай дабрабыту.

У сваёй рабоце мы паспрабавалі даведацца пра промыслы, якія былі надзвычай развіты ў нашай вёсцы Махро ў недалёкім мінулым-гадоў 50 таму назад. Гэта бондарства, гарбарства, кавальская работа і ткацтва.

Бондарства

Гэта выраб драўлянага посуду для зберагання і дастаўкі прадуктаў, вадкіх і сыпучых рэчываў. Большасць бандарных вырабаў вызначалася функцыянальнай мэтазгоднасцю, вонкавай прастатой, практычнасцю. Адна і тая ж пасудзіна нярэдка мела розную вонкавую форму (напрыклад, балея круглая і авальная). Амаль у кожнай хаце аднавяскоўцаў яшчэ захаваліся такія вырабы. У вёсцы сваімі выдатнымі вырабамі ў свой час славілася сям'я Ігнатаўца Аляксея Нічыпаравіча (1907-1977 гг.). Але, на жаль, сёння справу бацькі працягвае толькі Сцяпан Аляксеевіч (нар. У 1941г).





Майстры-бондары Аляксей Нічыпаравіч і Сцяпан Аляксеевіч Ігнатавец

Гарбарства

Гэта рамяство па вырабу скур для пашыву абутку і адзення. У нашай вёсцы амаль у кожным двары трымалі авечкі, а іх скура-ідэальны матэрыял для пашыву рукавіц, кажухоў, ботаў. Таму кожны паважаны сябе гаспадар умеў выконваць аперацыі па апрацоўцы скуры: мачэнне, заленне, мяздрэнне, ачысткаад шэрсці, абяззольванне, квашанне, дубленне і г.д. **Скураны**



абутак выраблялі мясцовыя ўмельцы. На жаль, на
гэта сапраўды забытае рамяство ў нашай вёсцы.

На фотаздымку Клімовіч Уладзімір Мікітавіч у хромавых ботах і Дашкевіч Галіна Рыгораўна ў "румынках". Здымак 1946 года.

Кавальства

Кавальства- вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўнага прызначэння з жалеза шляхам яго гарачага ці халоднага кавання.

Раней на ўсколіцы вескі была кузня, у якой адбываліся сапраўдныя цуды: з куска жалеза майстра мог зрабіць не толькі цвік ці ножык, сякеру ці браму, але і плуг ці воз. Гэтага майстра звалі Феадосій Андрэевіч Чашун (1907-1986 г.г). На жаль, сапраўдных майстроў-кавалёў на цяперашні час у нашай вёсцы няма.

Ткацтва

Ткацтва – выраб тканін на тацкім стане або спецыяльным прыстасаванні з перапляценнем ніцей.

На занятках гуртка у нас з'явілася жаданне не толькі пазнаёміцца з тэарэтычным матэрыялам, але і сваімі рукамі паспрабаваць зрабіць нешта каштоўнае. Таму мы вырашылі паспрабаваць азы ткацтва, навучыцца ткаць ручнікі. Дарэчы, ткацкі станок захаваўся ў адной з бабуль, Клімовіч Марыі Антонаўны. Яна і падаравала свой вярстат (ткацкі станок, або кросны) нашаму музею і дапамагла яго наладзіць. Вялікую дапамогу нам аказала і Ігнатавец Алена Фёдараўна. Яны паказалі нам сапраўдныя майстар-класы, дапамагалі ніткамі, ільном – як вынік, мы заснавалі дзве губы ручнікоў. Губой вызначалася даўжыня асновы і вылічвалася колькасць ручнікоў, якія атрымаюцца ў выніку работы. Губа раўнялася 3-4 метрам. Усе жадаючыя асвоілі тэхніку ткацтва, навучыліся самі рамантаваць мелкія непаладкі. На чатырох панажах мы выткалі адзін ручнік. Панажы- гэта педалі, пераступаючы на якіх, мы ствараем узор. Націскаючы на 2 панажы, мяняем перапляценне і атрымоўваецца тканіна.



Стварэнне асновы для ручніка



Наладжванне ткацкага станка



Галоўнае, у выніку вывучэння нашай работы мы атрымалі сапраўднае задавальненне ад таго, што змаглі дакрануцца да сваіх вытокаў.

Адметнай рысай фальклору можна лічыць тое, што ён на працягу стагоддзяў развіваўся ў сялянскім асяроддзі, побач з сялянскай працай. Напэўна, таму ён такі жывы і самабытны

Легенды і жарты



Шульгач Вераніка
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Быценьская сярэдняй школе”
Івацэвічскага раёна
Юдчыц Вераніка Аркадзьеўна
кіраўнік навукова даследчай работы







Турботы, турботы - ім спыну няма
У вёску, у Быцень, ірвуся здаўна…
Туды, дзе салоўка над акенцам пяе,
Дзе Шчара-гамолка свае воды нясе,
Дзе шэпчуцца вербы, туды дзе раса,
Дзе раніцай-золкам напявае каса,
Дзе ночанькай зоркі чароўна мігцяць,
Дзе папараць-кветку не кідаюць шукаць,
Дзе човен стаіць рыбакоў ля ракі,
Дзе маці чакае – глядзіць з-пад рукі,
Дзе асілкі-дубы ў задуменні стаяць,
Дзе храма муры аб мінулым маўчаць,
Дзе сэрца маё засталося навек,
Дзе тысячы год будзе жыць чалавек,
Дзе хата прапахла соллю і хлебам –

Вось тут пабываць і нічога не трэба!
А.М.Юдчыц

Наша вёсачка Быцень вядома з XVI стагоддзя, такім чынам ёй ужо амаль 500 гадоў. І не дзіва, што людзі аблюбавалі гэты прыгожы куточак зямлі. Хто пабываў у Быцені, ніколі не забудзе хараства навакольнай прыроды. Вакол вёскі многа ўзвышшаў, якія ўтвараюць такі прыродны "сподак". Дык вось, Быцень знаходзіцца на самым дне гэтага "сподачка". Гаворачы пра Быцень, немагчыма не сказаць пра цудоўныя лясы і прыгажуню царыцу-Шчару. Рака робіць мноства паваротаў, і таму цячэнне яе каля вёскі запаволенае, урачыстае.

Гэтай прыгожай рацэ прысвячалі свае вершы Алег Лойка і Уладзімір Караткевіч. Яны не раз бывалі ў Быцені, захапляліся яе краявідамі, вудзілі з вяскоўцамі рыбу, працавалі над рукапісамі, гаманілі з жыхарамі, адпачывалі.

Але самы вялікі скарб Быцені – гэта людзі: працавітыя, добразычлівыя, гаспадарлівыя, гасцінныя. Хоць сёння прыедзьце, і вы пачуеце добрую, ласкавую мову і адчуеце сэрцам цеплыню і душэўную прыгажосць быценцаў.

Менавіта да іх мы пайшлі паслухаць легенды і паданні нашай роднай зямлі. Перш за ўсё нам цікава было даведацца адкуль жа пайшла назва вёскі – Быцень. І вось што мы пачулі…

Легенда першая: Быў цень

Многа-многа гадоў таму, на левым беразе Шчары, стаяў прыгожы высокі векавы сасновы бор. Аб тым, што ён тут быў сведчыць назва вёсачкі Прыбарава. Прыбарава з'явілася на правым беразе Шчары, мабыць, раней чым Быцень на левым. Дык вось, землі каля Прыбарава былі вельмі беднымі, давалі мала ўраджаю, каб паляваць на дзічыну прыходзілася на чоўнах пераплываць раку. Паляўнічыя і рыбакі даўно прыкмецілі, што зямля на тым беразе больш урадлівая. І вось аднойчы некалькі семьяў прыбараўцаў селі ў чоўны і паплылі на той бераг ракі.

Яны перасяліліся сюды з усім сваім скарбам і пачалі секчы бор, ставіць хаты, ачышчаць месца пад палі. А калі яны працавалі, то работа ішла ў цені соснаў. З таго часу і показка з'явілася: "Быў цень – стаў дзень".

Вёсачку спачатку так і назвалі Быўцень. Потым, з цягам часу, "ў" згубілася, атрымалася – Быцень.

І па сённяшні дзень стаяць дзве вёсачкі па розных берагах Шчары, адна насупраць другой.

Легенда другая: Балацень

Калі хто з вас бываў на Шчары, той мабыць заўважаў, што берагі ракі не пясчаныя, а глеістыя, тарфяныя.

Зямля наўкол – тарфянікі. Гэта гаворыць аб тым, што калісці тут было балота. Балоты былі такімі вялікімі, што людзі якія сяліліся тут з горыччу гаварылі: "Ну што за зямля тут! Адно балота! Балацень нейкая і ўсё тут!"

З цягам часу гэтае назва ператварылася ў сучаснае – Быцень.

Легенда трэцяя: Бацянь

Здаўна на Беларусі бацянамі завуць буслоў. Дык вось, у тым сасновым бары, што стаяў на беразе Шчары, каля балота, было многа гнёздаў бацяноў-буслоў. Ужо ў тыя часы людзі шанавалі гэтых велічных птушак. Па вераванню людзей, душы нябожчыкаў перасяляліся ў гэтых белых птушак. Забіць бусла – лічылася за вялікі грэх. Таму людзі секлі тыя сосны, на якіх не было гнёздаў. Калі хаты былі пастаўлены, то аказалася, што па ўсёй вёсцы стаяць сосны з буслянкамі.

Кожную вясну над вёскай кружылі бацяны, і саму вёску назвалі Бацяны. Бацяны – Быцені – Быцень.

І сёння па ўсёй вёсцы стаяць буслянкі. Тых соснаў ужо даўно няма, а птушкі ўсёроўна ляцяць і ляцяць сюды, у гэтыя мясціны. Яны будуюць свае хаткі хто на страсе, хто на слупу, хто на дрэве… Чаму? Ды ўсё проста – гэта іх Радзіма, іх Бацькаўшчына. Па другому і быць не можа.

Легенда чацвёртая: Віцень

Мы падумалі, а ці ёсць яшчэ якое-небудзь тлумачэнне назвы вёскі Быцень? Вырашылі, што ў сваім пошуку будзем карыстацца толькі навуковымі крыніцамі, ну і канешне "машынай часу" (жартуем).

А калі так, то гайда ў XIV стагоддзе!

Мы апынуліся ў Вялікім княстве Літоўскім, у часы княжання Вялікага князя Віценя. Адчуваеце: Быцень – Віцень? Але гэта нам яшчэ трэба давесці, што Быцень гэта старажытны Віцень. Сугучнасць слоў яшчэ ні аб чым не гаворыць, трэба шукаць далей…

І вось што мы знайшлі. Паводле позняга Васкрасенскага летапісу ў 1315 годзе Віцень далучыў да ВКЛ Берасцейскую зямлю. А гэта што значыць? А тое, што Віцень ішоў паходам са сваімі харугвамі з Навагародка да Бярэсця. Глядзім па карце…

На карце Беларусі відаць, што шлях з Навагародчыны ў Берасцейшчыну пралягае праз быценскія землі!

Побач з Быценню ёсць мясціна, якая мае назву "Пагоня". Менавіта на харугвах Віценя была ўпершыню выкарыстана выява вершніка з мячом – "Пагоня". Мабыць тут быў лагер войска Віценя ў берасцейскім паходзе.

Цяпер аб літарах "В" і "Б". Параўнайце, як мы гаворым і як гаварылі нашы продкі: "Бізантыя" і "Візантыя", "Батлеем" і "Віфлеем", Базыль – Васіль, Бабілён – Вавілон. А цяпер "Быцень" і "Віцень" – гэта ж адно і тое! Праўда мы не маем звестак аб тым, дзе пахаваны Віцень. Ведаем толькі, што ў 1316 годзе ён загінуў ад удару маланкі.

Каля Быцені ёсць некалькі курганоў, а можа наш герой і загінуў тут, вяртаючыся з Берасцейскага паходу? І можа ў тыя старадаўнія часы яго звалі не Віцень, а Біцень.

Барыс даў назву Барысаву, Ізяслаў – Заслаўлю і Віцень мог даць назву Быцені.

Легенда пятая: Біттень

З летапісаў мы ведаем, што Віцень сяліў прусаў, якія ўцякалі ад нападаў нямецкіх рыцараў, на Гарадзеншчыне.

Недалёка ад Быцені, у Слонімскім раёне, стаяць вёсачкі Сынкавічы, Прусоўшчына і Русакова. Мабыць некалі - Прусакова. Менавіта тут сяліў прусаў Віцень. Сынкавіцкая царква Святога Архістраціга Міхаіла пабудавана прусамі ў гатычным стылі.

Каб прусы разумелі дзе сяліцца, ім паказвалі месца і казалі: “Бітте! Калі ласка!”

У школьным музеі ёсць карта, на якой Быцень так і называецца на нямецкі лад - Біттень.

Вось такая у нас атрымалася гісторыя.

Чары Шчары

І тады туманы адступіліся,
І тады, як з жаданай сястрой,
Нёман хуткі са Шчарай злучыліся
Пад дубамі і вечнай зарой...

Алег Лойка

Даўно гэта было. Так даўно, што ўжо ніхто не памятае калі. Жыў у нашай Быцені хлопец. Звалі яго Янка. Быў ён працавіты, разумны і вельмі ўвішны па гаспадарцы. Бывала, за адну гадзіну столькі спраў справіць, што чалавек пяць рабілі б яе столькі ж часу.

Бацькі нарадавацца не маглі са свайго дзіцяці. А калі вырас, пачаў на раку хадзіць ды рыбу лавіць. І так яму гэты занятак падабаўся, што чуць развіднее, а Янка ужо на рацэ.

І вось аднойчы ён убачыў на тым беразе Шчары дзяўчыну. Ды такую прыгожую, што вачэй не адвядзеш. Дзяўчына не ішла, а як бы плыла, ледзь кранаючы нагамі зямлю. Янка спачатку спалохаўся, хацеў уцячы, але дзяўчына заспявала песню:

“Шчараю ракою
Плыў малады з маладою,
Шлюб вянчалі ў царкве –
Будзе шчасце ў цябе.
Апоўнач у ваду ўвойдзеш
Навек дабра-шчасця знойдзеш...”

Хлопец, пакуль спявала дзяўчына, стаяў і слухаў, як зачараваны. Калі дзяўчына скончыла спяваць, ён паклікаў яе, але яна раптоўна знікла, як і з’явілася.

Янка маркотны і маўклівы прыйшоў дахаты. Маці з бацькам адразу заўважылі перамену ў сыне, а калі паглядзелі яму ў вочы – усё зразумелі. Маці толькі выдыхнула: “Сынок, няўжо ты бачыў яе?”

“Так матуля, – сказаў Ян, – бачыў. А хто яна?” Маці толькі заплакала, замахала рукамі, а калі супакоілася, расказала, што многа гадоў таму ў вёсцы было вяселле.

Малады быў з Быцені, а маладая– з вёскі, што за ракой. Яны павянчаліся ў царкве, а потым паплылі на лодках і маладыя, і госці святкаваць вяселле ў хаце бацькоў маладой. Маста тады яшчэ не было. Калі лодка з маладымі была на сярэдзіне ракі, яе завірыла-закружыла. Людзі пачалі тануць... Маладога выратавалі, а вось маладую выцягнуць з вады не атрымалася.

І вось з той пары людзі пачалі бачыць на тым беразе ракі ні то здань, ні то дзяўчыну, якая спявае, заве свайго любага. Маці дадала, што калі ў Шчары тоне малады чалавек, людзі кажуць, што гэта тая дзяўчына зачаравала яго, а імя яе ўжо ніхто і не ведае. Але за тое, што яна зводзіць са свету людзей называюць Зчарай.

Маці вельмі прасіла Янку не хадзіць часта на раку, а калі пачуе спеў Зчары, каб адразу бег дахаты.

Янка хадзіў на Шчару, вудзіў рыбу і больш не бачыў тую дзяўчыну. Але неяк на Купалле, калі ён з хлопцамі і дзяўчатамі паліў на рацэ касцёр у цемені ночы ён пачуў песню…

Гэта была тая самая песня, спявала Зчара:

“Шчараю ракою
Плыў малады з маладою,
Шлюб вянчалі ў царкве –
Будзе шчасце ў цябе...”

Янка казаў сябрам, каб паслухалі, але ніхто нічога не чуў. Усе смяяліся і не верылі яму. Тады абураны хлопец сказаў, што зараз прывядзе сюды тую дзяўчыну, якая спявае. Дзяўчаты пачалі ўгаворваць яго, каб не хадзіў, але ён не паслухаў...

Больш Янку ніхто не бачыў, але з таго часу, у купальскую ноч за Шчарай, калі прыслухацца, можна пачуць два галасы. Здаецца, спяваюць дзяўчына і хлопец:

“Шчараю ракою
Плыў малады з маладою,
Шлюб вянчалі ў царкве –
Будзе шчасце ў цябе.
Апоўнач у ваду ўвойдзеш
Навек дабра-шчасця знойдзеш...”

Татарскі перамел

На Шчары ёсць мелкае месца. Гэтае месца называецца Татарскі перамел. Па ім і зараз улетку коньмі перавозяць сена, нарыхтаванае на тым беразе ракі. Цяпер Шчара дужа абмялела, але ў даўнія часы яна была глыбокай, паўнаводнай. Па рацэ ганялі плыты.

Даўно гэта было. Тады, калі на Беларусі пачалі сяліцца татары: 500, а можа і ўсіх 600 гадоў таму.

Татары пад’ехалі да Шчары і ўбачылі добрае месца на тым беразе. Яны захацелі пасяліцца тут, але рака была вельмі глыбокай, цячэнне моцным і хуткім. Тады яны ў два бакі паслалі ганцоў, каб шукалі перамел. Першым знайшоў перамел коннік, які паехаў уверх па цячэнню ракі. Па гэтым перамеле пераправіліся ўсе татары. Былі яны з жонкамі, дзецьмі, жывёлай і ўсім скарбам. Пасяліліся яны на тым месцы, займаліся конегадоўляй, гарбарсвам, рымарствам. І цяпер у вёсцы жывуць іх нашчадкі, а тое месца на Шчары, дзе яны пераправіліся, з той пары называюць Татарскім перамелам.

Дарэчы, назва вёскі Быцень па адной з легенд паходзіць ад татарскага “бытум”, што азначае абжытае, наседжанае месца.

Чмохава бухта

Даўным – даўно жыў у Быцені стары Міхась Фіранчук, па мянушцы Чмох. Чмохам яго празвалі таму, што ён не выпускаў люльку з рота. Бывала, ідзе: чмох – чмох, пых – пых, бы які паравоз дыміць. Гэты дзед быў заўзятым рыбаком, але рыбаком незвычайным…

Усе рыбакі ў вёсцы, як зловяць добрую рыбіну, дык праз хвіліну ўся Быцень ведала пра гэта. А Чмох, як паймае добры ўлоў, ніколі нікому не

скажа. Людзі заўважылі, што дзед ідзе да ракі з пустым мехам, а ўвечары вяртаецца з поўным, ледзь цягне.

Людзі пыталіся ў яго: “Што нясеш, дзядзька Міхась?” А ён адказвае: “Ды вось шышак у лесе назбіраў, печку паліць буду”. Людзі ведалі, якія шышкі носіць Чмох. Мех у яго быў увесь у лусцэ, а рыбай пахла за вярсту.

Аднойчы вясковыя хлапчукі вырашылі паглядзець у якім месцы ловіць стары Чмох рыбу. Яны прасачылі за ім, гэта была бухта, у тым месцы дзе Шчара рабіла круты паварот. Калі ён скончыў лавіць, нешта мармытаў сабе пад нос. Калі хлопчыкі пачалі лавіць рыбу пасля Чмоха, то яны нічога не злавілі...

Калі хто з рыбакоў пачынаў лавіць побач з Чмохам, то дзед лаяўся на яго, праганяў. На пытанне: “Што, гэта твая рака?” Стары адказваў: “Рака не мая, а бухта – мая”. Чмоху ніхто не пярэчыў, бо ведалі, што ён шаптун, яшчэ чаго добрага і залом зробіць...

Старога Чмоха ўжо даўно няма, а вось бухту і па сённяшні дзень завуць Чмохавай.



Гром Іван
аўтар навукова-даследчай работы
ДУА “Хабовіцкая сярэдняя школа”
Кобрынскага раёна
Крачко М. Е.
кіраўнік навукова даследчай работы

МЭТЫ:
выклікаць цікавасць да вывучэння і збору твораў вуснай народнай творчасці, у якіх адлюстраваўся багаты жыццёвы вопыт народа, яго шматгранны характар, востры розум і глыбокія пачуцці;

ЗАДАЧЫ:
прапаганда і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны свайго краю;
развіццё творчых здольнасцей і мастацкага густу навучэнцаў;
паказаць аптымізм і таленавітасць простых людзей, іх уменне дасціпна, ярка і лаканічна выказваць думкі.

Вусна-паэтычная творчасць нашага народа ўзнікла ў глыбокай старадаўнасці, а цікавасць да яе не прапала і ў наш час.Вывучаць яе пачынаюць з дзіцячага садка і да заканчэння школы ўсе пакаленні школьнікаў. І тыя, хто прыйдуць пасля, таксама будуць вывучаць, бо ў фальклоры адлюстравалася мысленне нашага народа, яго багаты жыццёвы вопыт, шматгранны характар, востры розум і глыбокія пачуцці. Фальклор у сучасных умовах мае магчымасць пазітыўна ўплываць на ўсе бакі грамадскага жыцця і масавую свядомасць, асабліва для фарміравання гарманічнай асобы. Так лічаць навукоўцы.

Я ж вучуся ў дзявятым класе, зорак з неба не хапаю, але ж і розуму трохі маю. Да вучобы я не вельмі ахвочы, але паслухаць нешта цікавае каля старэйшых людзей люблю, сёе-тое і вам раскажу.

Жылося людзям раней вельмі цяжка. Працавалі багата і доўга. Тэлевізараў тады не было, і нават чытаць не ўсе ўмелі. Радыё таксама не адразу з’явілася. А чалавеку заўжды карцела нечым падзяліцца, выказацца, другіх паслухаць і крыху адпачыць душой. Таму і збіраліся на пасядзелкі-вячоркі і старыя, і маладыя, асабліва доўгімі зімовымі вечарамі ды абавязкова з нейкай работай: жанчыны пралі кудзелькі, вязалі, вышывалі, а мужчыны плялі лапці, кашалі, ладзілі рыбацкія снасці, а такія, як я, проста слухалі. І ў такія хвіліны людзям вельмі хацелася павесяліцца, забыць пра цяжкасці паўсядзённых будняў.

Любілі яны паслухаць незвычайныя гісторыі, паспяваць маглі, у цане быў удалы жарт, байка, прыказка-прымаўка і проста дасціпнае слоўца. Прыродны народны розум, назіральнасць, разважлівасць дапамагалі людзям неяк жартаваць, прыдумляць усякія анекдоты, байкі, гумарэскі. А часам і прыдумляць нічога не трэба было, варта успомніць падзеі і з'явы дня, дзіўныя ўчынкі, смешныя сітуацыі. Гэта, канешне, не КВіЗ: людзі то ж былі неадукаваныя, але ўсё ж…

Я сярод іх быў, нешта падслухаў, а зараз успомніў і запісаў.

НАРОДНЫЯ ЖАРТЫ, АНЕКДОТЫ, ДОСЦІПЫ В.ХАБОВІЧЫ

Удалы жарт увагі варт.

Прымаўка

Пачну з казачкі. Гэта казка-дыялог, з разгорнутым сюжэтам, вызначаецца народным гумарам.

Буў дід Борода

Дід Борода, открывай ворота.
-А нашо тыі ворота?
-Козый гнаты.
-А нашо тыі козы?
-Молочко доіты.
-А нашо тое молочко?
-Пастушків кормыты.
-А нашо тыі пастушкы?
-Свынэй пасты.
-А нашо тыі свыны?
- Зэмлю рыты.
-А шо в тый зэмлі?
-Діжка золотая.
-А шо в тый діжцы?
-Мыска золотая.
-А шо в тый мысцы?
-Ложка золотая.
-А шо в тый ложцы?
-Зэрне золотое.
-А дэ тое зэрне?
-Півэнь ухопыў.
-А дэ той півэнь?
-За морэ полытіў.
-А дэ тое морэ?
-Чоротом заросло.

А дэ той чоріт?
-Дывочкы пожелы.
-А дэ тыі дывочкы?
-Хлопцы побралы.
-А дэ тыі хлопцы?
-На войну погналы.
- А дэ тая война?
-Під хвостом у вола.
-А дэ той віл?
-В ліс побіг.
-А дэ той ліс?
-Вітёр поніс.

Казачка здаецца сур'ёзнай, у ёй ёсць нейкая логіка. Яна ўтрымлівае ўвагу слухача, выклікае цікавасць, а эфект яе дасягаецца кантраснымі пытаннямі-адказамі ды нечаканым канцом - падманам.

А наступная казачка кароткая, бессэнсоўная, адкрытае, як кажуць, запудрыванне мазгоў, але таксама ўвагу затрымлівае за кошт інтанацыі і майстэрства апавядальніка. І чым большае ў яго майстэрства, тым даўжэй утрымліваецца ўвага, і ён паспявае некалькі разоў расказаць завязку. Як толькі слухач зразумеў, што яго абдурылі і засмяяўся – смяюцца ўсе. Казачка дзеля смеху.

Жыў дід Мошка.
Буў у ёго сыночок Сірожка.
На штанцях сіра латочка.
-Чы хороша моя казочка?
Ты кажэш – не, і я кажу – не,
Алэ ж… жыў дід Мошка.
Буў у ёго сын Сірожка…

А наступныя гісторыі з колішняга жыцця в.Хабовічы:

Було высілле. Шось із стола ўпало і розбылося. Іван Міхневіч говорыть:

-То добрэ, як шкло б'ецця.

А Сірожка Царык:

-А , добрэ! То зара піду вытрэплю в твоій хаты ўсі окна – і тоді тобі будэ добрэ.

Другі дзень вяселля.

Рышылы бабы стушыты мняса в чугунах. Прынэслы дроў, затопылы піч, а дым пішоў на хату. Шось тут ны так робыцця. Выходять на двір, дывляцця: на комыновы сыдыть Володя Пэтрушчын. Знялы ёго оттыль бабы, прытянулы до колодяза і кропывыю одмывалы..

Жыў калісьці ў вёсцы дзівак Іван Альховый. Не мог без праявы жыць, каб не вычварыць што-небудзь для смеху.

Віз Іван Ольховый жыда. Пырыежалы воны брода. Іван говорыть:

-Мэнэ колыся бэшаны собака ўкусыў і мні часом робыцця, шо я чоловіка могу покусаты.

На самый сырэдыны, дэ найглубшэ місцэ, опустыв Іван голову і стаў пускаты слыню. Той жыд з пырыляку – боўть у воду.

А Іван собі поіхав далый.

Сварацца суседзі, сварацца мужыкі, б'юцца – для вёскі звычайная справа. Але як!

Сварацця дві сусідкы.

-Якая ж ты господыня?! Я вжэ нэ віяна, а ты ж й на току нэ була!

Прыбранае з поля зерне вязуць адразу на ток, веюць, перавяваюць, і толькі тады яно становіцца чыстым – элітай. А параўнаннем, не абазваўшы крыўдным словам, адной лаканічнай фразай жанчына раскрыла нікчэмнасць суседкі як гаспадыні, ды і з самой сябе пасмяялася.

Б'юцця два мужыкы, ды так, шо ныможня іх розвэсты. А Іван Ольховый дывыўсь, дай кажэ одному:

-Шэ ты ёму тэрпыш! Возьмы набэры мулі в горло, пожуй, пожуй і плёхны ёму в очы.

Почувшы стэ, мужыкі схололы.

Калі людзі сварацца, яны абодва як у гразі вывальваюцца. Сварка заўсёды непрыемная , яна не надае чэсці нікому, бо вымушае ліць гразь аднаму на другога.Таму словы Івана Альховага сцвярджаюць, што абодва мужыкі ў брудзе, а ён з іх насміхаецца. Трапнае слова, дасціпнае – гэта сіла .

Прыходыть коваль до прыдсідателя і кажэ:

-Стіпановіч,а як то шоб завтра посля работы з'іздыты у Кустовічы за брыкетом.

На шо прыдсідатель говорыть:

-А ты шо, Ромаша, нэ знаеш, шо посля работы нэма работы.

- От, як з толковым чоловіком , то й хутко договорылыся.

Прыдсідатель засмыяўся і даў добро.

Старшыня не сказаў "не", а завуаліраваў адказ. Каваль жа прапусціў яго (адказ) міма вушэй і з дапамогай прыгожай пахвальнай фразы ператварыў адказ у згоду. Ты хітры, але і я не дурны.

По рацыі вызывае прыдсідатель огронома:

-Ты дэ?

-В Чынці на мостовы.

-То ты хыба пуд мостом,бо на мосту я.

Аграном любіў работу каля сваёй хаты выконваць у рабочы час, і старшыня яго не мог вылавіць.

Вызывае по рацыі прыдсідатель огронома.

-Ты дэ?

Коля Івана Мотіного.(Іван Мотін - сусід огронома).

Сказаць, што дома – гэта значыць выдаць сябе, а сказаць нешта другое – заблытаць чалавека, як кажуць, запудрыць мазгі. Якая вынаходлівасць бывае ў людзей, калі трэба выкручвацца з сітуацыі! Як топішся, то і за саломінку схопішся.

Нікончык сыдыть у Хвылыны на вэчорках. Балакають, выпывають потроху. А ў іх дворі колодяз нызэнькій буў.

Одіў Нікончык кожушка і рэшыў до хаты йты. Выйшоў на двір, пэрэступыў чырыз бочку - і ў колодяз упаў.

Вышла Хвылына на двір, чуе: дэсь хтось крычыть. Познала, шо Йван, подумала, шо можэ гыдко, і пытае:

- Можэ тобі , Йванко, водычкы даты?

- Іды ты, Хвылыно, у мэнэ свэі по груды…

* * *

Прышлы хлопцы увэчоры до бабы , постукалы у двэры і пытають:

-Дрова трэба?

-Не, нэ трэба.

Устае баба рано, выходыть на двір, а костра дроў як і нэ було.

* **

Одын мужык нэ знав ныяк грошый. А дід Артём робыў граблі і продаваў по рублю. Прышоў мужык купляты граблі.

Дід Артём, шкодуючы нышчасного, кажэ:

-Ой, з тэбэ вжэ возьму дівяносто копіёк.

А мужык:

-О, стылько мныго - дівяносто, коб хоч рубель…

* * *

Сыдять два політіканты –Артыкул і Костач. Одын з іх:

- Я вжэ добрый лодар,но хоч лягу да полыжу. А ты ўсё сыдыш і сыдыш…

* **

Баба слухала прогноз погоды і кажэ:

-Більш нэ буду слухаты прогноз погоды. Вчора казалы, шо дошч будэ мысцямы, а він ішоў по ўсіх Хабовычах.

* * *

Два глухых . Одын сэдыть на прызьбы, другый ідэ сэлом. Першый кажэ:

-Куды ты йдэш?В баню?

-Не, я йду в баню.

-А-а, а я думаў, шо ты в баню йдэш.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

Анекдоты, жарты , гумарэскі, досціпы бытавога плану актыўна бытуюць і ў наш час як водгук на нейкія падзеі, як насмешка над дзіўнымі ўчынкамі.

Подпалыв Романко хлыва, а сам схаваўся в уборну. Позбыгалыся ўсі людэ пожер гасыты. Погасылы.

Выйшоў Романко з уборныі і кажэ:

-Як пудпалыты – то ныхто, а грітыся ўсі прыбіглы.

У народзе любяць малыя формы гумару, захапляюцца смехам, бо ён заўсёды накіраваны на ўсмешку, якая спрыяе здароўю і працягвае жыццё. А заадно часам і выхоўвае, высмейваючы людскія заганы.

ЛІТАРАТУРА

1.”Святі, святі, сонейка”. Творы беларускага фальклору. Цішчанка І., Мн.,1994г

2.Аповеды жыхароў в. Хабовічы, іх жыццёвы вопыт:
Камісарук С.Ф., 1932 г.н.
Гром Т. І., 1965 г.н.
Дземасюк М.П.,1965 г. н.

Танцы

ТАНЦЫ РОДНАГА КРАЮ (БАРАНАВІЦКАГА, ЛЯХАВІЦКАГА І ІВАЦЭВІЦКАГА РАЁНАЎ)



Веронін Кірывл, Юрчык Мілена
аўтары навукова-даследчай работы
ДУА “Сярэдняя школа №13 г. Баранавічы”
Варашылава Т.І.
кіраўнік навукова даследчай работы

МЭТА: дасканала пазнаёміцца з побытавымі танцамі Баранавіцкага, Ляхавіцкага і Івацэвіцкага раёнаў

ЗАДАЧЫ:

сустрэцца з носьбітам;
прааналізаваць , якія побытавыя танцы захаваліся;
вывучыць і пераканацца , што побытавы танец цікавы і павінен жыць.

Аб’ект даследвання: побытовы танец



Нозьбіты фальклору:

-Турцэвіч Вацлаве Адамаўне з вёскі Новая Мыш, Баранавіцкага раёна;
-Віленце Ганне Кліменцьеўне,
з вёскі Перхавічы Баранавіцкага раёна
-Струнеўскай Ганне Антонаўне з вёскі Амельная Івацэвіцкага раёна;
-Зелянеўскай Лідзіі Іосіфаўне (бабулі Зелянеўскай Анастасіі) з вёскі Зубелевічы Ляхавіцкага раёна

“Каробачка”

Танец запісаны ад жыхаркі вёскі Перхавічы Баранавіцкага раёна

Вілента Ганны Кліменцьеўны 1934 г.н.

Парны танец, перад яго пачаткам пара становіцца на ўмоўны круг супраць ходу гадзіннікавай стрэлкі. Дзяўчына з правага боку ад хлопца. Рукі злучаны перад сабой накрыж.





Пачынаюць з правай нагі.

1-8 такты -

на лік “раз” крок правай нагой наперад

“і” пераступанне левай нагой , як бы чуць абаперціся аб яе;

на лік “два”крокі правай нагой на месцы;



тое ж з левай нагі.

Усяго зрабіць восем такіх рухаў.

9-16 такты -

Паварот пары ў другі бок (па ходу гадзіннікавай стрэлкі) і

паўтарыць рухі ў другім напрамку.

На паўтор мелодыі:

Павярнуцца тварамі адзін да аднаго (дзяўчына тварам да цэнтра), два павароты на тры крокі і падставіць ногу. У правы бок з правай нагі дзяўчына, у левы бок з левай нагі хлопец .

Тое ж у другі бок. Танец пачынаецца спачатку.

Каробачка

Танец запісаны ў в. Зубелевічы Ляхавіцкага раёна

ад Зелянеўскай Лідыі Іосіфаўны 1948 г.н.




Хлопец з дзяўчынай стаяць адзін насупраць аднаго, трымаючыся за адну руку. Хлопец тварам да дзяўчыны і спіной да цэнтра круга.

1 -2 такты - два прыстаўных крокі хлопец з левай нагі ўлева, дзяўчына з правай нагі ўправа;



3-4 такты - два прыстаўныя крокі ў другі бок. Хлопец з правай нагі, дзяўчына з левай;

5-8 такты - паўтор рухаў 1-4 тактаў у другі бок;

9 такт - крок хлопца з левай нагі, дзяўчыны- з правай;

10 такт - крок хлопца накрыж з правай нагі, дзяўчыны з левай;

11-12 такты - два прыстаўныя крокі (хлопец з левай нагі, дзяўчына з правай);

13-16 такты - паўтор рухаў 9-12 тактаў у другі бок;

На паўтор мелодыі:

полька ў пары з паваротам.

Каробачка



Падэспань

Танец "Падэспань" быў створаны ў 1898 годзе ў Маскве на аснове сцэнічнага іспанскага танца. Спачатку "Падэспань" танцавалі ў модных салонах, на балях. Потым з панскіх сядзіб гэты танец пранік



у вёскі Беларусі і таксама ў вёскі нашага рэгіёна. Танцавалі на вечарынках, народных святах, гуляннях. Музычны памер ¾.



Запісана ад Турцэвіч Вацлавы Адамаўны 1930 г.н.

в. Новая-Мыш Баранавіцкага раёна

Палажэнне рук: *хлопец з дзяўчынай стаяць побач. Хлопец, як бы абдымаючы дзяўчыну. Правай рукой трымае яе правую руку над яе плячом. Левай рукой падтрымлівае яе левую руку. Галовы павернуты адзін на аднаго.*

1- 4 такты – партнеры робяць двайны крок наперад "шасэ" і двайны крок назад, пачынаючы з левай нагі;





5-8 такты – потым яшчэ двайны крок уперад і паўпаварота ўправа

Спяваюць:



"*Падэспанец харошанькі танец,*

ён танцуецца очэнь лягко **9 –12 такты -** крок улева, зазірнуць у вочы партнёру, як бы гуляючыся, потым крок управа і зазірнуць адзін на аднаго з другога боку;

Працягваюць спяваць:

"Налево, направо

Налево направо

(і ў час паварота)

Вот і всё, вот і всё, вот і всё…"

13 – 16 такты - паварот
дзяўчыны пад рукой,
а хлопец левай
нагой выконвае двайны
прытуп”

Танец пачынаецца з пачатку.



Падэспань



Лысы



Скародзінская



Каханачка



Месяц



Зборнік

«Паводле бабуліных успамінаў»
змяшчае матэрыялы абластнога конкурса дзіцячых навукова-даследчых работ “Фальклорная спадчына” па выніках 2015-2016гг. фальклорна-этнаграфічных экспедыцый сваёй мясцовасці, у рамках VI адкрытага абластнога фестываля фальклорнага мастацтва “Радавод”

Складальнік:
Брыч Віялета Крыштофаўна

Установа адукацыі
«Брэсцкі дзяржаўны абласны цэнтр маладзёжнай творчасці»
упраўлення адукацыі Брэсцкага аблвыканкама

224 020, г. Брэст, вул. Маскоўская, 123
Тэл./факс (0162) 40-79-21
E-mail: youthcenter@tut.by
Сайт: htpp://cmt.brest.by